№ 48 (406) 24 сьнежня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Майданчык ля ІВВ**
Будучы прэзыдэнт пад пранізьлівым ветрам. старонка 4

**Што эстрада, што бардэль**
Дзьмітры Падбярэскі падводзіць вынікі музычнага году. старонка 5

**Найлепшыя кнігі-2004**
Рэйтынг «НН». старонка 6

**Сем апавяданьняў**
на сем калядных вечароў. старонка 7

# Чалавек году



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

### Чалавек году — Жанна Літвіна

Толькі за гэты год у Беларусі быў спынены выхад 19 незалежных газэт. 11 зь іх — непасрэдна перад рэфэрэндумам. Між тым дзяржаўныя СМІ пасьпяхова вярнуліся ў сыропны стан 1985 году: многа вады, многа цукру і нуль альтэрнатыўнай думкі. Таму Беларуская асацыяцыя журналістаў, што адчайна змагаецца за выжываньне незалежных СМІ, сёньня ператварылася ў сапраўднае Міністэрства *інфармацыі*, якое служыць свабодзе слова. А яго міністарка (слова «міністар» на лаціне, дарэчы, першапачаткова азначала «служыцель») — Жанна Літвіна.

Пры канцы году БАЖ атрымаў пачэсную прэмію імя Андрэя Сахарава «За свабоду думкі» ад Эўрапарлямэнту, і старшыня кантынэнтальнага парлямэнту прамаўляў з трыбуны па-беларуску. Ад БАЖ, захаваньня свабоды слова цяпер залежыць здольнасьць беларускай цывілізацыі да самазахаваньня. Пышна гучыць, але так і ёсьць.

### Урадовец году — Сяргей Сідорскі

У тое, што Сідорскі пратрымаецца доўга, ніхто ня верыў. Ён мусіў стаца рытуальнай ахвярай газавага крызісу мінулай зімы. Але Сідорскі выявіўся вельмі гаспадарлівым і самастойным прэм'ерам. З газавай вайны нэрваў беларускі ўрад выйшаў пераможцам. Пры Сідорскім эканамічны рост у краіне дасягнуў 10% за год. Разам з тым, за гэты час жорсткі ў адстойваньні нацыянальных інтарэсаў прэм'ер не дазволіў сабе ніводнай палітычнай заявы.

### Палітык году — Міхаіл Марыніч

Ад канца красавіка ў «амэрыканцы» КДБ знаходзіцца Міхаіл Марыніч. Ён меў усё: цёплую пасаду пасла ў Латвіі, грошы і бізнэс-кантакты. Аднак адрокся гэтага ўсяго дзеля перамены ўлады ў Беларусі. За што і расплачваецца. Зьвінавачаньні ў крадзяжы зь ім жа створанага грамадзкага аб'яднаньня і незаконным захаваньні зброі выглядаюць сфабрыкаванымі. Затое чалавек з судзімасьцю аўтаматычна пазбаўляецца права ўдзелу ў прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г. Лёзунг «Свабоду Марынічу» ўвайшоў у рэпэртуар зуброў-графіцістаў. Мо толькі той факт, што ў Беларусі засталіся палітвязьні, і ёсьць адзінай прыкметай таго, што ў краіне застаецца палітыка.

### Замежнік году — Віктар Юшчанка

Юшчанку пашчасьціла ачоліць народ, які перарос урад. Герой, праўдзівы, пакутнік за Ўкраіну — усё ён, гэты палітык зь нягучным голасам, не трыбун і не папуліст. Гэты банкір увасобіў жаданьне народу жыць пры сумленнай уладзе ў дэмакратычнай краіне. Паводле словаў пісьменьніцы Аксаны Забужкі, Юшчанка здолеў стаць сымбалем, які захапіў нацыю, як Гавал чэхаў, а Ян Павал ІІ палякаў. Ён уяўляе сабой рэдкі, пасьпяховы толькі на пераломных этапах гісторыі, тып маральнага палітыка. І гэта выявілася самым важным і запатрабаваным.

Працяг на старонцы 3.

Андрэй Хадановіч

### Калядны рэп

У краіне, дзе поўны тормаз
націскае на тармазы;
дзе адно й тое самае сьвята
адзначаюць чатыры разы,

каб насельнікі, як наркаманы,
зноў і зноў адчувалі прыход
навагодняга сьвята зь вечна новай
назваю «Новы год»;

дзе фартуна, як сьнежная баба,
усьміхнецца табе анфас,
павіншуе кожнай вітрынай:
«С рождеством и колядами вас!» —

ты ня бачыш, ляціш на паўночных аленях
у кірунку Караганды,
покуль Дзед Мароз барадою з ваты
замятае твае сьляды.

І паўночнае зьзяньне ў вочы,
і палярная зорка ўгары,
і на ўсіх санях сьвятога Міколы
замежныя нумары.

І складаеш калядную песьню,
і выходзіць сьнежаньскі рэп,
і сьпяваў бы, калі б ня поўнач
і ня мінус сем на дварэ б.

Гэтай поўначы хопіць зь лішкам
на астатнія паўжыцьця...
А назаўтра ў яслях выходны —
толькі вол, ягня і дзіця.

Баю-бай, маленькі Ісусе,
ў Бэтлееме і ў Беларусі.

### Гонар і годнасьць

Калядное пасланьне айца Аляксандра Надсана. **Старонка 2.**

### Апошнія дні падпіскі

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапіку «Белсаюздруку». Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапіку «Белсаюздруку». «Наша Ніва» з Новага году — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Дык падпісвайся!

АНОНС

### Успамін пра маіх сумных бл.дзей

Чытайце ў наступным нумары «НН» урывак з новага раману Габрыэля Гарсія Маркеса ў перакладзе Багдана Арлова.

### А таксама:

эканамічныя вынікі-2004 і прагнозы-2005. Хто быў аўтарам Акту 25 Сакавіка? Артыкул Вацлава Гаўла «Спроба жыць па праўдзе».



# Гонар і годнасьць

## Каляднае пасланьне айца Аляксандра Надсана

У пачатку 1990-х гадоў мінулага стагодзьдзя, калі век і здароўе дазвалялі мне браць больш актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці, адна брытанская арганізацыя зьвярнулася да мяне з прапановаю супрацоўніцтва ў галіне гуманітарнай дапамогі для дзетак у Беларусі, асабліва тых, што пацярпелі ад Чарнобыльскай аварыі. Адначасова яны паставілі ўмову, што разам з дапамогаю яны будуць распаўсюджваць сваю рэлігійную літаратуру. Прапанова была спакусьлівая, бо арганізацыя распараджалася рэсурсамі, пра якія я мог толькі марыць. Тым ня менш, разважыўшы ўсё, я адмовіўся ад супрацоўніцтва. Прычынай адмовы было маё нежаданьне злоўжываць сваім становішчам: я ўважаў, што ў выпадку згоды дапамога перастала б быць бескарысьлівай, яна б спалучалася з маральным націскам на дзяцей і іхніх бацькоў, якія знаходзіліся ў бездапаможным становішчы. Іншымі словамі, гэта быў бы маральны шантаж.

Сапраўдная дапамога будзе такой толькі тады, калі той, хто дае, не чакае ўзамен нічога, апрача дабра асобы ў патрэбе. Іншымі словамі, яна павінна адбывацца ў атмасфэры пашаны да чалавечай годнасьці.

Прыблізна ў тым самым часе мне прыйшлося чуць па радыё інтэрвію з Маці Тэрэзай з Калькуты, якую ўжо пры ейным жыцьці многія ўважалі сьвятой. Ейным паклiканьнем была апека — часта ў апошнія хвіліны іхняга жыцьця — над тымі, што апынуліся за бортам г.зв. прыстойнага грамадзтва, якое хацела забыцца пра іх. Маці Тэрэза расказвала пра аднаго чалавека, якога яна падабрала на вуліцы, калі той ужо быў пры сьмерці. Ейныя апошнія словы мяне вельмі ўразілі: «Як ён прыгожа паміраў!» Падумаўшы, я зразумеў, што яна хацела гэтым сказаць. Гэты чалавек, які праз увесь свой век ня ведаў нічога, апроч абыякавасьці, зьняваг і пагарды з боку іншых, у апошнюю гадзіну свайго жыцьця адчуў, што ёсьць нехта, каму ён дарагі, хто жадае яму дабра, не чакаючы нічога ўзамен. Яму было вернутае пачуцьцё ягонай чалавечай годнасьці.

Вялікі ўсходні сьвяты Максім Вызнаўца (580—662) пачынае адзін са сваіх твораў дыялёгам, у якім малады манах пытаецца свайго духоўнага настаўніка: «Скажы мне, ойча, чаму Бог стаў чалавекам?»

Адказ можа быць шматгранны і доўгі. Таму тут хацелася б зьвярнуць увагу на адзін аспэкт, пра які так прыгожа сказаў Сьвяты Павал: «Калі прыйшла поўня часу, Бог паслаў Сына свайго, народжанага ад жанчыны, народжанага пад Законам, для адкупленьня тых, што пад Законам, каб нам атрымаць усынаўленьне… Такім чынам, ты ўжо не нявольнік, але сын. А калі сын, то і спадкаемца з волі Божай» (Гал 4:4-7).

Іншымі словамі, тут ідзе гутарка пра «гонар і годнасьць», пра якія (або пра зьнявагу якіх) можна часта чуць у наш час у Беларусі. Бог ушанаваў чалавека, аказаў яму вялікі гонар, сам стаўшыся ім. Адначасова Ён узвысіў яго да годнасьці сына Божага, спадкаемцы Божага валадарства.

Калі не памыляюся, адзін з горкаўскіх герояў неяк сказаў: «Чалавек — гэта гучыць горда». У сьвятле вышэйсказанага думаю, што ўсе мы можам падпісацца пад гэтым сказам, даючы яму толькі свой зьмест.

Гонар і годнасьць, пра якія ідзе тут гутарка, ня маюць патрэбы ў судовай абароне, яны не падлягаюць зьнявазе. Іхняе зразуменьне, аднак, патрэбнае, каб сярод людзей настала тая «добра воля», пра якую сьпявалі анёльскія хоры ў час прыйсьця на сьвет Сына Божага. І вось гэтага ўсьведамленьня жадаю ўсім нам у гэтыя вялікія і сьвятыя дні, каб наступіў сапраўдны супакой на зямлі і каб мы маглі ўсе разам радасна аддаць хвалу Богу на вышынях.

**а.Аляксандар Надсан,**
**апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў замежжа**

*Каляды 2004*

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Опэра

**29** (ср) і **30** (чц) **сьнежня** а 19-й мэляманаў чакае «Навагодні канцэрт-сюрпрыз».

### Сярэднявечныя каляды

Тэатар Унівэрсытэту культуры **25 сьнежня** (сб) а 19-й запрашае на «Сярэднявечныя каляды».

### Арлен Кашкурэвіч

У бібліятэцы імя Талстоя (вул.Маскоўская, 18) **да канца студзеня** працуе выстава твораў Арлена Кашкурэвіча. Для выставы мастак абраў зробленыя ім ілюстрацыі да твораў Сьвятога Пісаньня.

### Навагодняе арыентаваньне

«Навагоднія гульні» па спартыўным арыентаваньні адбудуцца **26 сьнежня** ў Менску, раён Уручча, 9-ты кілямэтар. Адкрыцьцё — у 11.30.






# Падпішыся сам, а то прымусім!

Настаўнікі Глыбоцкага раёну атрымалі вуснае распараджэньне афарміць падпіску на два выданьні — адно мясцовае і адно агульнабеларускае. У гэтую пятніцу ўсе павінны прынесьці справаздачу — квітанцыі аб падпісцы. Такое на Глыбоччыне адбываецца ўпершыню. На працягу году лісты з патрабаваньнем аб падпісцы атрымлівалі прадпрымальнікі, і ў гэтых лістах быў дакладны пералік таго, што «варта» выпісваць. Настаўнікі такога сьпісу ня маюць і вырашаюць самі, якія выданьні выбраць. Адзін з настаўнікаў выпісаў «Нашу Ніву» на тры месяцы. Цікава, як адрэагуе адміністрацыя школы?

**Юры Калбасіч,**
**Глыбокае**



ПУХАВІЦКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
222810, г. Мар'іна Горка, вул. Ленінская, 47
Тэл. 5-21-66; факс 5-02-06, 5-02-78

ПУХОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
222810, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47
Тел. 5-21-66; факс 5-02-06, 5-02-78

13.12.2004 № 48/15-15
на № ______

В соответствии с поручением Главы государства А.Г.Лукашенко по вопросу развития газеты «Советская Белоруссия» и рекомендации Минского областного исполнительного комитета по вопросу увеличения подписного тиража областной газеты «Мінская праўда», Вам необходимо оформить **ведомственную** подписку на республиканскую газету «Советская Белоруссия» и **личную** подписку на областную газету «Мінская праўда» на первое полугодие 2005 года.

Отчет о проделанной работе необходимо представить не позднее 20.12.2004года в отдел идеологической работы райисполкома или по факсу 5-38-38.

Председатель исполкома С.А.Турко

Малаховская
5-38-38
5-09-89 – отдел подписки

**Ва ўсёй краіне людзей прымушаюць падпісвацца на лукашэнкаўскую прэсу. Паводле нашай інфармацыі, рэдактару «Советской Белоруссии» пастаўленая задача давесьці наклад газэты да 500 тыс. асобнікаў. На фота: нашы чытачы перадалі ў Рэдакцыю во такі цыркуляр.**

НЯ ЕЖ

### Хрэн у вочы

«Што фарбуюць на Вялікдзень, хрэн ці яйкі?» Такую рэклямную віктарыну прапаноўвала гледачам усіх каналаў у панядзелак фірма «Інтэр-Дэлікатэс». І гэта найлепш характарызавала густ і ўзровень «нацыянальнага» тэлебачаньня.

### Сьцеражыцеся шампанскага

Паводле статыстыкі, штотрэцяя навагодняя траўма прычыненая коркамі ад шампанскага. Але не сьпяшайцеся замяняць яго мацнейшымі напоямі — ад іх шкода можа быць непараўнальна большай. Папросту асьцярожней адкаркоўвайце бурапеністы напой.

IN MEMORIAM

# Добры ўспамін



**Васіль Мядзелец**

У другой палове дня 20 сьнежня затэлефанаваў Уладзя Губскі. «У мяне сумная вестка. Сёньня памёр Васіль Мядзелец…»

Гэты чалавек быў сапраўдным нацыянальным героем. Лідэр глыбоцкай групы моладзевай падпольнай арганізацыі Саюз беларускіх патрыётаў, у 1947 годзе Васіль Мядзелец быў асуджаны да сьмяротнага пакараньня, якое потым замянілі на 25 гадоў пазбаўленьня волі. Пра такіх здымаюць фільмы, імёнамі такіх называюць вуліцы.

Цэлы вечар чытаў кнігу «Гарт. З успамінаў пра Саюз беларускіх патрыётаў», якую ў 1997 годзе надрукавала выдавецтва «Наша Ніва». На яе старонках Васіль Мядзелец згадвае: «Ствараючы Саюз беларускіх патрыётаў, мы ня ставілі перад сабой нейкіх асаблівых задач. Найперш дбалі пра нашу Бацькаўшчыну, каб яна засталася сама сабой, зь беларускай дзяржаўнай мовай, з гістарычнай сымболікай — бел-чырвона-белым сьцягам і гербам «Пагоня», са сваёй культурай, гісторыяй, каб была сапраўды свабоднай, сувэрэннай, сапраўды шчасьлівай. Вядома, мы не маглі не разумець, што гэтага не дабіцца без сапраўднай дэмакратыі, бязь цьвёрдых гарантыяў правоў чалавека, без грунтоўных зьменаў у эканоміцы».

Як пра наш дзень.

Былыя сябры СБП падарылі мне гэтую кнігу з надпісам: «Шаноўнаму Алесю Аркушу на добры ўспамін». І роўненькі слупок подпісаў: В.Мядзелец, Алеся Фурс, Антон Фурс, Марыя Бялевіч, Л.Бялевіч. Яны былі разам праз усё жыцьцё, нягледзячы на ўсе ГУЛАГі і эмгэбэшныя катавальні.

На добры ўспамін. Так проста. І так важна. Каб ён быў.

**Алесь Аркуш**

ЗДЫМКІ ГОДУ



**Студзень. На Лагойшчыне з помпай адчыніўся лыжны курорт.**



**Пачатак году адзначыўся буйным газавым канфліктам з Расеяй, у працэсе якога былі разьвеяныя інтэграцыйныя ілюзіі. На фота: прэм'ер Сідорскі.**



**Захоп чачэнскімі баевікамі школы ў асецінскім Беслане 1 верасьня скалануў сьвет. Расейскае кіраўніцтва аддае перавагу сілавому вырашэньню канфлікту ў Чачэніі.**

**Ліпень. Будслаў адсьвяткаваў 500-годзьдзе. Юбілейны фэст сабраў да сьвятыні дзясяткі тысяч чалавек.**



# Супольны праект

## Вынікі году і задумы на наступны

Амаль незаўважанай прайшла інфармацыя, што ў кастрычніку сярэдні заробак у Польшчы дасягнуў 805 даляраў. Вышыня 800 у.а. была ўзятая бяз гучных рэляцый, без уручэньня прэм’еру Бэльку ордэну Дружбы народаў і парадных нумароў «Газэты Выборчай».

Што там у нас з заробкам? Ён, налічаны сярэдні, паводле Мінстату, у кастрычніку склаў 370 тыс. рублёў ці то 170 у.а.

У палякаў таксама хапае матэрыяльных праблемаў. Але калі ты маеш заробак 3500 злотых або пэнсію 2000, дык гэта ўжо праблемы іншага парадку. Гэта ўжо выбар, у якой цырульні стрыгчыся. Ня чуханьне патыліцы, стрыгчыся ў цырульні ці жонку папрасіць. Як робіць кожны другі беларускі настаўнік.

Новая хваля арыштаў дырэктараў і бізнэсоўцаў нагадала, што ёсьць у Беларусі людзі, якія ацэньваюць свае заслугі й патрэбы на больш як 805 даляраў. Такія людзі ёсьць ва ўсіх краях, і законы яны парушаюць скрозь. Але ў нас іх садзяць на восем, дзесяць гадоў. Садзяць масава, што зноў жа адрозьнівае нас ад якой-небудзь Польшчы, дзе ўсё больш караюць штрафамі. Бо звышамбітныя людзі рухаюць бізнэс наперад, у выніку чаго пасьля кожны мае свае 805. Мяняюцца законы, каб і яны маглі *сумленна* зарабляць грошы краіне.

Дзівіць мяне не разрыў ва ўзроўні заробкаў беларусаў і палякаў, хоць і ён таксама. Пачыналі ж у 1991-м з аднолькава пустых паліцаў.

Дзівіць, што палякі ня трубяць ні пра рост эканомікі на 10%, ні пра павышэньне рэальных даходаў на 16%. Там гэтыя лічбы год на год не прыходзяцца, здараюцца і крызісы. А Беларусь пры статыстычна найбольшых у Эўропе тэмпах прыросту дзесяці (дый савецкіх пяцідзесяці) апошніх гадоў адрозьніваецца найніжэйшай якасьцю жыцьця.

Я маю гэтаму тлумачэньне. Працэнты росту могуць быць рознымі па якасьці. Нямецкі дом прастаіць 200 гадоў, наш — 70. Аб’ём бэтону аднолькавы, наш яшчэ й большы, і працэнт росту наш большы. Рэжам старыя дрэвы, садзім маладыя. Кладзем спачатку асфальт, пасьля трубы. А ўсё ідзе ад культуры, ад этыкі, ад традыцыі.

Ня будзе дабрабыту, пакуль ня будзе культуры. Ня ўвойдуць у звычку павага да чалавека і прыроды, пакуль ня будзе нацыі і дэмакратыі. Ня зробіць Беларусі падобнай да Швэцыі кітайскі шлях разьвіцьця, з манаполіяй на ўладу і дзяржаўнай уласнасьцю, шлях, на якім спынілася беларуская адміністрацыя. Аб гэтым падумалася за падвядзеньнем вынікаў году.

Што галоўнага прынёс скупы на цяпло 2004 год, настолькі нясонечны, што нават кепска высьпеў вінаград? Якія набыткі нацыянальнага культурнага жыцьця? Беластоцкія беларусы выявіліся досыць дужымі, каб адстаяць сваю газэту «Ніва». Незалежны беларускамоўны фільм «Акупацыя» выйшаў на міжнародную арэну. Паэт Хадановіч у рэкордна кароткі тэрмін спрадаў свае выдадзеныя за ўласныя сродкі першыя кнігі. Пацюпа надрукаваў унікальны літаратуразнаўчы трактат. Заснаваная новая літаратурная прэмія — імя Юхнаўца. У беларускай музыцы — той шчырай, не ФМскай — зьявілася новае імя: Руся. Мастакі пачалі традыцыю Быкаўскіх пленэраў. Безьліч гэтых вялікіх дробных падзеяў яднае тое, што яны адбываліся без удзелу дзяржавы. Вось Драздовіцкія пленэры: жыве ў мястэчку Германавічы энтузіястка Ада Райчонак, яна іх і зьбірае.

Дзяржава самаўхіляецца. Нават на адкрыцьцё помніка Быкаву не дала ні капейкі. І бог зь ёй. Ня хоча як хоча. Абы не ганяла. Супольнасьць грамадзянаў сама створыць новую культуру, хай урадоўцы пасьля далучаюцца.

Вынікі году газэта аналізуе ў гэтым і наступным нумарах.

«Наша Ніва» — ня проста прадукт працы Рэдакцыі, яна застаецца вялікім супольным праектам яе аўтараў і чытачоў, люстэркам буйных, доўгатэрміновых праектаў — беларускай нацыі і краіны Беларусі. Іх ужо не спыніць і не стрымаць. А якасьць залежыць ад кожнага з нас патрошку.

Найлепшыя для Беларусі калядныя падарункі могуць прыйсьці з Кіева. Такога ня будзе, каб Украіна стала ўкраінскаю і эўрапейскаю, а Беларусь засталася савецкаю і расейскаю. Няма мовы бліжэйшай да беларускай, чым украінская, нашы краіны спрадвеку зьвязвала адна доля. Трохі аранжавага на калядных сталах адлюструе нашы мары на новы год.

**Андрэй Дынько**

## НАВІНЫ

### Міністар фінансаў супраць «Прессбола»

Мікалай Корбут, які ўзначальвае і Беларускую асацыяцыю гімнастыкі (БАГ), падаў у суд на газэту «Прессбол». У газэце быў надрукаваны артыкул «У намесьніках у міністра фінансаў ходзіць чалавек, якога Інтэрпол шукае за ўдзел у арганізаванай злачыннай групоўцы» пра віцэ-старшыню БАГ Андрэя Іманалі. Корбут лічыць, што газэта прынізіла гонар ягоны і ягоных намесьнікаў і патрабуе 50 млн руб з УП «Прэссбол плюс» і па 10 млн з рэдактара Ўладзімера Бережкова і аўтара артыкулу Сяргея Вярсоцкага. У адкрытым лісьце Лукашэнку Бережкоў назваў дзеяньні Корбута «расправай за крытыку». Апроч таго, Бережкоў адзначыў, што яму і ягонай сям’і сталі пагражаць бандыты пасьля артыкулу пра гандаль матчамі беларускіх клюбаў і нацыянальнай зборнай па футболе.

### Паляцелі

На старшыню Дзяржкамітэту па авіяцыі Фёдара Іванова распачатая крымінальная справа паводле арт.424 КК («Злоўжываньне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі»). Іваноў даў падпіску пра нявыезд.

### Расея несвабодная

Амэрыканская арганізацыя «Freedom House» выключыла Расею зь ліку «часткова свабодных краін», надаўшы ёй статус «несвабоднай». Асноўная прычына — абмежаваньні правоў чалавека у краіне.

### Выгналі за Касьцюшку

Курсанта Суворараўскай вучэльні Алеся Смольскага адлічваюць з III курсу за, як ён мяркуе, сяброўства ў незарэгістраваным «Маладым Фронце». Сам Алесь зьвязвае адлічэньне з кампаніяй па наданьні вучэльні імя Тадэвуша Касьцюшкі, якую плянавалася правесьці пасьля зімовых вакацый.

### Ганараваньне Генадзя Бураўкіна

Ляўрэатам прэміі імя Алеся Адамовіча стаў Генадзь Бураўкін — за цыкл артыкулаў у газэтах «Беларускі час» і «Салідарнасьць» апошніх гадоў, за кнігу паэзіі «Жураўліная пара» і працу над укладаньнем кнігі ўспамінаў «Наш Быкаў». Уручэньне ПЭН-цэнтраўскай прэміі адбудзецца ў дзень памяці Адамовіча — 26 студзеня.

**АШ; БелаПАН**

## Назіральнікаў затрымаў АМОН

22 сьнежня АМОН затрымаў сотню беларускіх назіральнікаў, якія мелі праз некалькі гадзінаў ехаць на ўкраінскія выбары. Гэта адбылося падчас брыфінгу ў гатэлі «Беларусь». Усе яны патрапілі ў Цэнтральны РУУС сталіцы — «для высьвятленьня асобаў».

У прэс-службе ГУУС на пытаньне карэспандэнта «НН» зьдзіўлена адказалі, што ня ведаюць пра затрыманьне, але «нічога супрацьпраўнага» ў ім ня бачаць — звычайная працэдура высьвятленьня асобы. Сотні асобаў з квіткамі на адзін цягнік.

Усяго ва Ўкраіне чакалі 12700 замежных назіральнікаў — рэкордную колькасьць.

**МШ**

# Чалавек году

Працяг са старонкі 1.

### Спартовец году — Юлія Несьцярэнка

На атэнскай Алімпіядзе ўзышла новая зорка сусьветнага спорту. Упершыню ў найпрэстыжнейшай бегавой дыстанцыі — 100 м — перамагла спартоўка з Эўропы, беларуска Юлія Несьцярэнка. Мільёны людзей у сьвеце, якія не цікавяцца міжнароднай палітыкай, даззналіся пра Беларусь. Але ўсьлед за перамогай палітыка зацікавілася Юляй. Не подпісы зьяўляліся пад улёткамі «за Бацьку», яе фота з чырвона-зялёным сьцягам і подпісам «На крыльях Родзіны» можна цяпер бачыць на бігбордах. І рэклямуе Юлія зусім не здаровы лад жыцьця.

### Культурныя дзеячы году — Валер Булгакаў і Андрэй Кудзіненка

Рэдактар часопісу «ARCHE» Валер Булгакаў быў інтэлектуальна сумленным, прысьвяцíўшы чацьвёрты нумар часопісу 10-годзьдзю кіраваньня Лукашэнкі — самаму значнаму юбілею году — і зьмясьціўшы ў ім уласны артыкул «Загадкі і адгадкі лукашэнкаўшчыны». Санкцыі не забавіліся: выгнаньне зь «Белсаюздрукаў», дзяржкнігарняў, падатковая праверка «ARCHE» і друкарняў, якія яго выдавалі.

«ARCHE» распрацоўвае новае для Беларусі спалучэньне культурнага й палітычнага аналізу. Маем справу з праўдзівым мысьленьнем — за якое нават караюць.

Створаны Андрэем Кудзіненкам фільм «Акупацыя. Містэрыі» трапіў на Ратэрдамскі й Маскоўскі кінафэстывалі, быў паказаны ў Польшчы й выдадзены на DVD. Забароненае ў былой рэспубліцы-партызанцы кіно пра рэальных партызанаў карыстаецца папулярнасьцю. Яго шукаюць, перапісваюць, ладзяць сяброўскія супольныя прагляды. Кудзіненка стварыў прывабны падпольны прадукт — сапраўдны твор, сапраўдны факт сапраўднага мастацтва.

**Сяргей Мікулевіч**

## ЗДЫМКІ ГОДУ



Краснапольле. Абрынуўся будынак сярэдняй школы.

Травень. На будынку былой Віленскай беларускай гімназіі дбаньнем Пятра Краўчанкі і скульптара Алеся Шатэрніка зьявілася мэмарыяльная шыльда.




На фальсыфікацыю вынікаў парлямэнцкіх выбараў і рэфэрэндуму 17 кастрычніка беларускае грамадзтва адрэагавала шматдзёнымі акцыямі пратэсту.



# «Майданчык» ля ІВВ

## Першая сэсія сходу дэмакратычных кандыдатаў адбылася ў палявых умовах

**Улады не дазволілі правесьці сход незалежных кандыдатаў у дэпутаты. Апошняя надзея арганізатараў — Менскі міжнародны адукацыйны цэнтар (ІВВ) — падпарадкаваўся патрабаваньню Менгарвыканкаму і замкнуў свае дзьверы. «Ня выйшла ў Беларусі — зьбяромся за мяжою», — вырашылі дэлегаты.**

У нядзелю раніцай паркоўка ля будынку Менскага міжнароднага адукацыйнага цэнтру была забітая аўтамаблямі. На антэнах некаторых зь іх былі павязаны аранжавыя стужкі. На ганку ІВВ стаяў ладны натоўп людзей, сярод якіх хто-ніхто меў аранжавыя шалікі, а побач гурталіся некалькі «напампаваных» хлопцаў у вязаных шапках. Няўзброеным вокам было відаць: адбываецца нешта неардынарнае.

Знаёмых твараў сярод грамады хапала, але яшчэ больш было людзей, якіх у Менску ўбачыць можна рэдка, — у сталіцу прыехалі актывісты з рэгіёнаў. Усе яны бралі ўдзел у выбарчай кампаніі 2004 г. як прадстаўнікі дэмакратычных сілаў, але ня трапілі ў парлямэнт — каго не зарэгістравалі, каго пазбавілі рэгістрацыі, а ў каго банальна скралі перамогу — паводле інфармацыі арганізатараў, такіх сярод больш як 150 дэлегатаў было пад 40 чалавек.

Нягледзячы на тое што падчас выбарчай кампаніі дэлегаты гэтага зьезду сабралі ў сваю падтрымку больш за паўмільёна подпісаў, замест утульнай канфэрэнц-залі ІВВ ім давялося стаяць на пляцоўцы паміж уваходам у будынак ды рэстарацыяй «Вэстфалія». У пятніцу ўвечары арганізатарам канфэрэнцыі патэлефанавалі чыноўнікі зь Менскага гарвыканкаму й паведамілі, што «мерапрыемства ня будзе, яно забароненае». ІВВ — сумеснае нямецка-беларускае прадпрыемства. Відавочна, нямецкі бок палічыў, што лепш сініца ў руцэ ў выглядзе працягу існаваньня цэнтру, чым журавель у небе ў выглядзе перамогі беларускай дэмакратыі, ды паддаўся патрабаваньням выканкаму.

Даўно вядома: хочаш, каб людзі зрабіліся сябрамі, — ствары для іх супольныя праблемы. Таму тое, што дэпутатам давялося казаць прамовы на «майданчыку» пад пранізьлівым ветрам, а ня ў цёплай залі з кавай у фае, пойдзе ім на карысьць. На сходзе акрэсьліўся «сьпікер» — Аляксандар Дабравольскі, які сваім спакойным голасам згладжваў эмоцыі, правёў галасаваньне па рэзалюцыі, у якой дэкляруецца працяг кардынаванай работы з выбаршчыкамі, ды на гэтым закрыў «першую сэсію» сходу кандыдатаў у дэпутаты, які меў эўфэмічную назву «навуковай канфэрэнцыі». А вось патэнцыйны прэзыдэнт калі й знаходзіўся на пляцоўцы ля ІВВ, дык нічым адметным сябе пакуль не праявіў. Напэўна, парлямэнцкая рэспубліка незалежным беларускім палітыкам больш даспадобы.

Дзе адбудзецца «другая сэсія», на якой усур'ёз паўстане пытаньне вылучэньня адзінага лідэра, пакуль невядома. Разглядаюцца тры варыянты — Вільня, Смаленск ды Кіеў. Дэлегатаў, якія прайшлі першае хрышчэньне сьнежаньскім холадам, такая пэрспэктыва напужаць не павінна.

**Алесь Кудрыцкі**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«Сьпікерам» сходу дэмакратычных кандыдатаў быў Аляксандар Дабравольскі.**

# Клубок інтарэсаў і канфліктаў

**Як тлумачаць арышт генэральнага дырэктара «Нафтану» на самім «Нафтане»? Ходзяць палітычная і эканамічная вэрсіі.**

У асяродзьдзі «нафтанаўцаў» цыркулююць дзьве вэрсіі прычынаў арышту Канстанціна Часнавіцкага. Першая — палітычная. Менавіта Наваполацак ня выканаў усіх дзяржустановак па правядзеньні парлямэнцкіх выбараў і рэфэрэндуму. Па-першае, тут выбары прайшлі ў два туры — гэтак адзначыліся ў Беларусі толькі Наваполацак і Горадня. Па-другое, у пасёлку Міжрэчча (у народзе яго называюць «Царскае Сяло»), дзе жыве амаль уся эліта «Нафтану», рэфэрэндум «завалілі». У горадзе нафтавікоў ужо месяц ходзіць чутка пра магчымыя рэпрэсіўныя меры і ў дачыненьні да старшыні наваполацкага гарвыканкаму Аляксандра Камарова.

Дарэчы, Камароў з Часнавіцкім знаёмыя зь юнацтва, і, відавочна, менавіта апошні праламбіраваў у 1998 годзе прыход Камарова ў наваполацкі «белы дом» з пасады намесьніка старшыні полацкага гарвыканкаму. Камароў стаў «правільна» адстойваць інтарэсы наваполацкага нафтавага лобі, быў зацятым прыхільнікам аб'яднаньня двух гарадоў — Полацку і Наваполацку (гэтага не хацелі на «Нафтане»). 2004 год стаўся для старшыні наваполацкага гарвыканкаму вельмі складаным. Асабліва шмат было скаргаў на мэтады прыватызацыі ў нафтагарадзе і на бяздарнае добраўпарадкаваньне галоўнай вуліцы гораду — Моладзевай. Кажуць, што Камароў гатовы па ўласным жаданьні пайсьці ў адстаўку (спасылаючыся на кепскі стан здароўя), але яго пакуль не адпускаюць.



**Часнавіцкага на «Нафтане» любілі і лічаць, што ён трапіў за краты з прычыны палітычнай каньюнктуры.**

Другой прычынай арышту Часнавіцкага называюць яго адмоўнае стаўленьне да праекту стварэньня наваполацкага нафтахімічнага аб'яднаньня ў складзе «Нафтану», «Паліміру» і наваполацкай ЦЭЦ. Гэты праект лётае ў паветры ўжо некалькі гадоў. Відавочна, не падабаецца расейскім бізнэсоўцам, якія сsnуюць пэўныя пляны адносна наваполацкага нафтаперапрацоўчага. Адмоўна ўспрынялі гэты праект і на самім «Нафтане», бо гэта азначала б, што «Палімір», стан якога ня вельмі стабільны, трэба было б падтрымліваць нафтанаўскімі грашыма. Заробак 300—400 даляраў на «Нафтане» сёньня лічыцца сярэднім. Калі б аб'яднаньне адбылося, дык гэткі заробак стаўся б ці не найвышэйшым. Затое пасьля ўзбуйненьня «Нафтан» будзе менш прывабным для расейскіх нафтагазавых монстраў.

Часнавіцкага на «Нафтане» любяць — ён узначальвае прадпрыемства з 1992-га, а да гэтага з 1983 г. быў галоўным інжынэрам нафтазаводу — і лічаць, што трапіў Канстанцін Генрыхавіч за краты з прычыны палітычнай каньюнктуры. Прынамсі, вэрсію, што прычынай быў продаж нафтапрадуктаў зацікаўленым фірмам па заніжаных цэнах, называюць выссанай з пальцу, бо продаж той адбываецца паводле тэндэраў. Цяпер камэрцыйная структура «Нафтану» ўзьняла цэны на гатовую прадукцыю, што можа прывесьці (аб гэтым ужо адкрыта непакояцца на «Нафтане») да затаварваньня прадпрыемства нерэалізаванымі нафтапрадуктамі.

Галоўным прэтэндэнтам на пасаду Часнавіцкага ў Наваполацку называюць гендырэктара «Паліміру» Аляксандра Бароўскага, якога «перакінулі» некалькі гадоў таму ў Наваполацак з бабруйскай «Белшыны». Гэтая пагалоска толькі падлівае алей у агонь размоў пра аб'яднаньне — прынамсі, «Нафтану» і «Паліміру».

**Васіль Кроква, Полацак**

## ЗДЫМКІ ГОДУ



**Дэпутаты парлямэнцкай групы «Рэспубліка» галадаюць, патрабуючы дэмакратызацыі выбарчага заканадаўства.**



**Чэрвень. Алеся Белакоза звольнілі з пасады дырэктара Гудзевіцкага літаратурна-краязнаўчага музэю.**

**Ліпень. Зачынены Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт.**



# Тузін падзей,

## якія страсянулі музычны шоу–бізнэс

Дзьмітры Падбярэскі

Калі паспрабаваць асэнсаваць вынікі 2004 году ў галіне айчыннай папулярнай музыкі, можна адразу ж адцеміць: год гэты быў вельмі багаты на падзеі.

**1.** Пра ініцыятыву Мінінфармацыі ў абмежаваньні гучаньня «нянашай» музыкі ў этэры было напісана дастаткова. Ды ясна адно: пасьпешлівасьць, зь якой было загадана ўвасобіць 75% беларускага, яшчэ гукнецца ў самай бліжэйшай будучыні. Са сховаў, дзеля выкананьня спушчанага зьверху адсотку, дастануць такія фанаграмы, на якія ўжо й паўкі не зьвяртаюць увагі. Усе радыёстанцыі набудуць адзіны фармат — «Сталічны». Беларуская музыка замест Пугачовай загучыць з кожнага праса, і ў выніку нават заўзятыя яе прыхільнікі пачнуць закідваць Мінінфармацыі лістамі з просьбай «прекраціць безабразія». Прыбыткі ад рэклямы скароцяцца, у выніку чаго пару-тройку «лавачак» давядзецца зачыніць. Ну, хоць нейкі плён… Калі б адначасова сам музычны рынак за год разьвіўся на тыя ж 75%, можна было б нешта ўсур'ёз абмяркоўваць. А так размахваць шашкай Будзённага, безумоўна, лягчэй, чым наталіць музычны рынак хоць нейкім значным капіталам.

**2.** Сёлета ўлада вуснамі вядучага музыколяга краіны змусіла адпаведныя інстанцыі адрэагаваць на ўдзел некаторых айчынных выканаўцаў у канцэрце на плошчы Бангалор. Нягледзячы на тое што канцэрт быў дазволены афіцыйна, тэлефоннае права выкрасьліла цэлы шэраг кампазыцый з і так небагатага беларускага радыёэтэру. Сьпісаў забароненых ніхто ня бачыў, але мястачковыя чыноўнічкі — што ў аддзелах культуры, што на радыё — адчайна кінуліся вылізваць плэй-лісты. Ня ўсе, праўда. Нехта такі прасіў паказаць дакумэнт. Але які дакумэнт могуць мець рабы? Як вынік, забароненыя рок-н-рольшчыкі ўтварылі Беларускую унію музыкантаў, таксама, зрэшты, дакумэнтальна не аформленую. Быў бы дакумэнт — мелі б мы цяпер нешта накшталт незалежнага прафсаюзу працаўнікоў рок-н-ролу. Аднак улады, як заўсёды, сваёй забаронай самі падштурхнулі музыкаў да аб'яднаньня. Няхай толькі духоўнага, але духоўная моц заўсёды пераможа любую паперку.

**3.** Новая пастанова Савету Міністраў аб канцэртна-гастрольнай дзейнасьці паказала, якія далёкія слугі народу ад практыкі. Прынамсі, у дакумэнце ёсьць такія пункты, якія літаральна разьвязваюць рукі чыноўніцтву на месцах. Але ня гэтае нават галоўнае: у пастанове адкрытым тэкстам гаворыцца пра магчымасьць утварэньня абласных экспэртных рад, на якія ўскладзена функцыя папярэдняга прагляду канцэртных праграм. То бок улады адкрыта не выключаюць стварэньня структур з функцыяй цэнзуры. Зь вяртаньнем у 1983 год можна ўсіх толькі павіншаваць.

**4.** Штогадовая цырымонія «Рок-каранацыі», мяркуючы па ўсім, зрабілася гісторыяй. Сьвятое месца пустое не бывае: вось і тэлепраграма «На скрыжаваньнях Эўропы», маштаб якой так і застаўся невыясны, надумалася вызначыць найлепшых па выніках году. Аднабаковасьць гэтай цырымоніі, якая, зрэшты, ня надта розьніцца ад замкнёнасьці той жа «Рок-каранацыі», безумоўна, пакіне за бортам некаторыя жанры (гл. пункт 2) і толькі пацьвердзіць выразную суб'ектыўнасьць, якой вызначалася цырымонія-папярэдніца. Новага і тут, як і на ўсім тэлебачаньні, прыдумаць ня здолелі. А гучнае азначэньне праграмы як «фэстываль» аніяк не адрозьнівае яе ад таго, што некалі ўжо было на БТ. Згадайма хоць бы «Песьню бярыце з сабою»…

**5.** 2004 год, як, бадай, ніякі іншы, быў багаты на колькасьць выдадзеных дыскаў беларускіх выканаўцаў. Шчыра кажучы, нават пры вялікім жаданьні прасачыць за ўсімі навінкамі стала немагчыма. Што вельмі радуе. Як і тое, што якасьць запісаў вырасла, жанрава-стылёвыя рамкі пашырыліся, зьявіліся раней не вядомыя назвы і прозьвішчы. Да таго ж, уведзеная папярэдне 50% абавязковага беларускага рэпэртуару ў этэры адбілася і на попыце: продаж айчыннай музыкі, безумоўна, павялічыўся. Думаю, у 2005 г. гэтая тэндэнцыя замацуецца. А відавочная канкурэнцыя ў выніку расставіць усё па адпаведных палічках.

**6.** «Славянскі базар» сёлета лішні раз прадэманстраваў, што гэта самы палітызаваны музычны фэстываль у сьвеце. Але калі леташняя перамога беларуса Максіма Сапацькова была відавочна высмаўлена зь мікрафона, дык сёлета колішні вакаліст груп «Эгаіст» і БДА «Песьняры» Пётар Ялфімаў перамог, што называецца, без інтрыг у журы. Вядома, самому Пятру вырашаць свой далейшы лёс, выбіраць папсовы ці рокавы напрамак. Пры ягоным выразным таленце ён будзе запатрабаваны і там і тут. Абы не згубіўся, як той жа Сапацькоў, які, паводле некаторых зьвестак, падпявае цяпер ніколі не заўважанаму ў ляўрэатах «Слаўбазы», але камэрцыйна вельмі пасьпяховаму Сярогу. Што ж, Максім таксама выбраў сваё, дый розьніца паміж ім і, скажам, Русланай — выразная.

> Тое, што выступ Ягора Ваўчка месцамі нагадваў рэклямны ролік дзіцячага парнасайту, ляжа на сумленьне ягоных высокіх апекуноў, для якіх што эстрада, што бардэль — бяз розьніцы!

**7.** Сёлета Беларусь упершыню стартавала ў дарослым «Эўрабачаньні» і ў другі раз — у дзіцячым. Колькі ж гвалту было ў прэсе вакол гэтага прымітыўнага часам па ўзроўні фэстывалю, колькі абяцаньняў дагнаць і перагнаць, колькі шчытоў меркавалася прынесьці з турэцкіх палёў! Першыя асобы краіны, як напярэдадні сусьветнага патопу, стваралі штабы і бралі дадатковыя абавязацельствы. І хто аказаўся крайні? Вядома ж, музыканты. Аказалася, і адно было ня так, і другое, і трэцяе. Аляксандра і Канстанцін, дзякаваць богу, не зацыкліліся на няўдачы і працягваюць працаваць. А вось дзіцячы конкурс… Зноў быў створаны штаб, зноў дарослыя дзядзі і цёці рабілі ўсё, каб з жывога хлопца атрымалася мэханічная лялька, якая завучана робіць усё, што вырашылі партыя і ўрад. Да гэткага спалучэньня маленькіх лебедзяў з канканам варта было дадумацца! У цэлым конкурс часам нагадваў рэклямны ролік дзіцячага парнасайту, і выступ Ягора Ваўчка няхай ляжа на сумленьне ягоных высокіх апекуноў, для якіх што эстрада, што бардэль — бяз розьніцы! Вось лішняе пацьверджаньне факту: калі ўлада бярэцца за неўласьцівыя ёй функцыі (тут — кіраваньне камэрцыйнымі праектамі), вынік прадказальны.

**8.** У гэтым годзе Мінкультуры публічна зрабіла справаздачу па ўшанаваньні памяці Ўладзімера Мулявіна. Дзіўная выйшла справаздача! Выдадзена неблагая кніга «Нота лёсу», зьняты даволі дзяжурны фільм, дзе галоўны герой — дальнабойшчык У.Гасьцюхін, выдадзены найкаштоўнейшы (з прычыны накладу ў 500 асобнікаў) зборнік нот песень Мулявіна, выдадзена (калі верыць сп.Гуляку) анталёгія з 21 дыску «Песьняроў», вось-вось будзе тыражаваная (згодна з той жа крыніцай) мультымэдыйная энцыкляпэдыя. Між тым «Песьняроў» робіцца ўсё больш і больш. Падсумуем? Такім чынам: БДА «Песьняры» пад дырэкцыяй В.Скаражонка; «Беларускія песьняры» (адзіны калектыў, які напраўду працуе актыўна); ВІА «Песьняры», якім раней кіраваў Л.Барткевіч, а цяпер — А.Дзямешка; «Песьняры» пад дырэкцыяй І.Сьвечкіна, складзены ў асноўным з удзельнікаў ансамблю, якія пайшлі ад Барткевіча. Колькасьць людзей, якія ў свой час несьлі адно бервяно з Мулявіным, расьце, а помніка галоўнаму песьняру дагэтуль няма.

**9.** Першы віртуальны гіт-парад айчыннай музыкі «Тузін гітоў» адсьвяткаваў першую гадавіну. Стваральнікі праекту здолелі ня толькі адмесьці пэсімізм заўзятараў айчыннай музыкі, якія прадказвалі хуткую сьмерць пачынаньню, але й пераканаць многіх, што годнай увагі беларускай музыкі дастаткова, каб аб ёй можна было гаварыць і спрачацца. Гадавіну адзначылі цалкам прыстойным канцэртам. У той жа час адзначаны на апошняй «Рок-каранацыі» праект pesniary.com быў пакараны судом праз нібыта парушэньне аўтарскіх правоў, што можна расцаніць як першы ў гісторыі беларускай музыкі скандал, звязаны зь сецівам. Адмераўшы Хведару Караленку, аўтару сайту, пакараньне ў тры базавыя велічыні, судзьдзя нібыта пацьвердзіла: ніякага парушэньня няма, але вось, вы ж самі ўсё разумееце, пакараць вас трэба… Бо калі б парушэньне было, пацярпелі б і іншыя сайты, на якіх дагэтуль разьмешчаны фанаграмы «Песьняроў». Такім чынам, задума стварыць віртуальны музэй «Песьняроў» сарвалася праз недальнабачныя амбіцыі асобных «аматараў» творчасьці ансамблю. Сапраўднага ж музэю Мулявіна дагэтуль няма.

**10.** Фэстывалі году — «Таўкачыкі», «Басовішча», фэст у Наваполацку. «Генэралы року» на ранг фэстывалю ўсё ж ня цягнуць. Плюс «Маладэчна», «Славянскі базар», на якіх было дазволена сяк-так паказацца й альтэрнатыўнай культуры. Небагата… Хоць яўна ажывілася клюбнае жыцьцё, дый у рэстарацыях жывая музыка набыла куды большае значэньне. Аднак, па вялікім рахунку, сапраўднага нацыянальнага фэстывалю рок-музыкі ў Беларусі няма. Затое ёсьць спадзяваньне, што ў 2005 г. такі фэстываль мае адбыцца. Пакуль гэта ўсяго толькі папярэдняя інфармацыя. Прынамсі, вясной яна павінна быць пацьверджана. Наколькі мне вядома, фэстываль гэты пройдзе без удзелу рок-зорак з усходняга замежжа, што можа толькі радаваць…

**11.** Калі паспрабаваць падсумаваць, хто з нашых выканаўцаў і дзе выступаў па-за межамі Беларусі, дык сьпіс выйдзе даволі вялікі. Этна-трыё «Тройца» па-ранейшаму запатрабаванае на эўрапейскіх фэстывалях; трывала атабарыліся ў Польшчы і зноў ад'ехалі ў Кітай «Mojo Blues»; «Новый Иерусалим», Дзьмітры Даўкш зноў гастралявалі за акіянам; Зьміцер Вайцюшкевіч часты госьць у Польшчы. «Леприконсы» больш граюць ва Ўкраіне, чым дома, там жа разьяжджае на «Чорным бумэры» Сярога. Наагул, украінскі напрамак адкрылі сёньня і «Індыга», і «N.R.M.» з «Крамбамбуляй». І гэтак далей. Але што цікава: усходні вэктар, то бок Масква, прыцягвае выканаўцаў папулярнай песьні, у той час як рокеры глядзяць у адваротны бок. Такія вось Ючанкі і Януковічы. А за каго вы — выбірайце самі.

**12.** Як я і прадказваў, адкрыць галоўную сцэну краіны — канцэртную залю Белдзяржфілармоніі — не ўдалося ня толькі праз год, але й праз два. Вось калі б замест крэслаў у залі вырашылі зрабіць каток, заданьне было б выканана датэрмінова. А так гэты рамонт выразна паказаў стаўленьне ўлады да культуры. Пры гэтым адзначу, што нават у Менску прыдатных для канцэртаў, спэктакляў заляў яўна мала, а кошт арэнды даўно ўжо перасягнуў агульнаэўрапейскія тарыфы. Адсюль — неймаверныя цэны на білеты, што, між іншым, і не дазваляе арганізатарам канцэртаў прывезьці ў Беларусь актуальных зорак замежнай музыкі. Хіба што за выключэньнем якой «ABBA-2». Для Беларусі й такі клон — за сьвята…

Збольшага, менавіта такі выйшаў адыходзячы музычны год у асэнсаваньні яго аўтарам гэтых радкоў. Не імкнучыся паглыбляцца ў дэталі, я паспрабаваў намаляваць менавіта агульныя яго рысы, найбольш істотныя прыметы, выказваючы пры гэтым спадзяваньне, каб надобрае засталося ў мінулым, а годнае ўвагі — атрымала развіцьцё ў 2005 г. Якi, будзем спадзявацца, складзецца лепшым за той, што мы ўжо пражылі.

ЗДЫМКІ ГОДУ



Ліпень. Басовішча-2004.



«N.R.M» адзначыў дзесяцігодзьдзе альбомам-трыб'ютам.



Травень. Упершыню ў «Эўрабачаньні» ўзяў удзел беларускі дуэт — «Аляксандра і Канстанцін».



Памёр Чэслаў Немэн — чалавек-эпоха ў сусьветнай музыцы, беларус з наднёманскіх Васілішак паводле нараджэньня.

# Найлепшыя кнігі 2004




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Каб вызначыць найлепшыя кнігі году, мы зьвярнуліся да дзесяці аўтарытэтных экспэртаў — крытыкаў, выдаўцоў і кнігагандляроў. Фаварытамі сталі новы том залатога «Кнігазбору», проза Пятровіча і глянцавы альбом «Спадчына Беларусі»

2004 год ня вызначыўся нейкай асаблівай кнігай-падзеяй, несумненным лідэрам, як гэта было летась з «Краінай Беларусьсю» Арлова і Герасімовіча. Тройку лідэраў склалі кнігі з розных сфэраў — нонфікшн, мастацкая літаратура і альбом. Кніга прозы Барыса Пятровіча «Шчасьце быць…» мела ўсе шанцы ўзначаліць сьпіс (яе называлі амаль усе літаратурныя крытыкі), але зусім на нямнога яе апярэдзіла праца Часлава Пяткевіча «Рэчыцкае Палесьсе». Завяршыў тройку лідэраў альбом Аляксандра Аляксеева й Алега Лукашэвіча «Спадчына Беларусі». Адразу за імі — кніга афарызмаў Сяргея Абламейкі зь віленскага выдавецтва «Наша Ніва».

Многія з экспэртаў «НН» адзначалі, што год выдаўся багатым на цікавыя выданьні, таму досыць цяжка выбраць дзясятку найлепшых. Міхась Скобла ледзь уклаўся ў «біблійны» лік — 12. А Ўладзімер Арлоў абраў 15 кніг, але выставіць іх «паводле ранжыру» не патрапіў: «Я пералічваю кнігі паводле альфабэту і прашу кожнай зь іх налічыць 1 бал».

У 2004-м фактычна завяршыліся два значныя шматгадовыя праекты — 18-томная «Беларуская энцыкляпэдыя» (выдадзена ўся альфабэтная частка) і шматплянавае дасьледаваньне «Беларусы». Разам з тым вырасла колькасьць расейскамоўных кніг, прысьвечаных гісторыі й культуры Беларусі. Віталь Скалабан, характарызуючы свой сьпіс, адзначыў: «Ці то я стаў чытаць больш парасейску, ці то кнігі такія выходзілі».

У сьпіс найлепшых кніг году патрапілі працы Захара Шыбекі, Яўгена Міpановіча ды пераклады Францішкі Ўршулі Радзівіл і Альгірдаса Юліюса Грэймаса: дата выданьня ў іх пазначаная 2003 г., але фактычны выхад адбыўся толькі сёлета.

Яшчэ адной асаблівасьцю літаратурнага году, адзначанай экспэртамі «НН», сталася актывізацыя часопіснага жыцьця: Павал Абрамовіч нават прапаноўваў дадаваць у сьпіс часопісныя публікацыі.

Сьпіс найлепшых кніг падаецца паводле падліку агульнай колькасьці балаў у 10-бальнай сыстэме. Найлепшая кніга ў сьпісе кожнага экспэрта атрымлівае 10 балаў, наступная — 9 і г.д. Кнігі ад 10-й і ніжэй — 1 бал. (Вынятак — сьпіс У.Арлова.)

**Адам Воршыч**

**1. Часлаў Пяткевіч. Рэчыцкае Палесьсе. — Беларускі кнігазбор; 43 балы.**
**2. Барыс Пятровіч. Шчасьце быць… — Тэхнапрынт; 38 балаў.**
**3. Аляксандар Аляксееў, Алег Лукашэвіч. Спадчына Беларусі. — Менская фабрыка каляровага друку; 30 балаў.**
**4. Сяргей Абламейка. Egoізмы. — Вільня: Вострая брама; 18 балаў.**
**5. Уладзімер Някляеў. Так. — В.Хурсік; 16 балаў.**
**6. Аляксандар Надсан. Біскуп Чэслаў Сіповіч. — Белфранс; Міхась Чарняўскі. Дзесяць бітваў. — Вільня: Наша будучыня; 15 балаў.**
**7. Аляксандар Ельскі. Выбраныя творы. — Беларускі кнігазбор; Леанід Маракоў. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794—1991. Т.3. — Athenaeum; Вячеслав Носевич. Традиционная белорусская деревня. — Технология; 14 балаў.**
**8. Янка Брыль. Блакітны зьніч. — Про Хрысто; 13 балаў.**
**9. Адам Глёбус. Дом. — І.Логвінаў; Андрэй Хадановіч. Лісты з-пад коўдры. — І.Логвінаў; 11 балаў.**
**10. Арнольд Макмілін. Беларуская літаратура дыяспары. — Тэхнапрынт; Ондржэй Сэкара. Кніжка Фэрды Мураша / Пер. Сяргея Сматрычэнкі. — Прага: Альбатрос; Захар Шыбека. Нарыс гісторыі Беларусі 1795—2002. — Энцыкляпэдыкс; 10 балаў.**

**Міхась Скобла**, аглядальнік радыё «Свабода»:
1. Часлаў Пяткевіч. Рэчыцкае Палесьсе.
2. Барыс Пятровіч. Шчасьце быць…
3. Сяргей Абламейка. Egoізмы.
4. Уладзімер Някляеў. Так.
5. Янка Брыль. Блакітны зьніч.
6. Рыгор Барадулін. Дуліны ад Барадуліна.
7. Кастусь Цьвірка. Камяні тых сядзібаў.
8. Аляксандар Надсан. Біскуп Часлаў Сіповіч.
9. Ала Сямёнава. Таямніцы пакутны колер.
10. Алесь Бадак. Маланкавы посах.
11. Андрэй Хадановіч. Лісты з-пад коўдры.
12. Віктар Шніп. Беларускае мора.

**Уладзімер Арлоў**, пісьменьнік:
1. Сяргей Абламейка. Egoізмы.
2. Міраслаў Адамчык. Зборнік.
3. Валянцін Акудовіч. Разбурыць Парыж.
4. Рыгор Барадулін. Дуліны ад Барадуліна.
5. Быкаў на «Свабодзе».
6. Пятро Васючэнка. Адлюстраваньне першатвору.
7. Арнольд Макмілін. Беларуская літаратура дыяспары.
8. Леанід Маракоў. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі.
9. Аляксандар Надсан. Біскуп Чэслаў Сіповіч.
10. Наш Быкаў. Кніга ўспамінаў.
11. Барыс Пятровіч. Шчасьце быць…
12. Уладзімер Сіўчыкаў. Высакосны год.
13. Андрэй Хадановіч. Лісты з-пад коўдры.
14. Міхась Чарняўскі. Дзесяць бітваў.
15. Poems on Liberty (Вершы на Свабоду).

**Анатоль Бутэвіч**, пісьменьнік:
1. Барыс Пятровіч. Шчасьце быць…
2. Аляксандар Аляксееў, Алег Лукашэвіч. Спадчына Беларусі.
3. Уладзімер Ліпскі. Бацька. Пісьмы сына.
4. Беларуская літаратура. Хрэстаматыя / Уклад. У.Адамчык, М.Адамчык.
5. Брэсцкая крэпасьць. На вятрах гісторыі.
6. Францішка Ўршуля Радзівіл. Выбраныя творы.

**Віталь Скалабан**, архівіст:
1. Аляксандар Аляксееў, Алег Лукашэвіч. Спадчына Беларусі.
2. Беларуская энцыкляпэдыя. Т.18.
3. Вячеслав Носевич. Традиционная белорусская деревня.
4. Аляксандар Ельскі. Выбраныя творы.
5. Витебск. Классика и авангард. (Зборнік дакумэнтаў віцебскай мастацкай школы.)
6. Леанід Маракоў. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі.
7. Часлаў Пяткевіч. Рэчыцкае Палесьсе.
8. Анатолий Федорук. Старинные усадьбы Берестейщины.
9. Віталь Кірычэнка. Менск. Гісторыя пасьляваеннага аднаўленьня. 1944—1952.
10. Михаил Пташук: Исповедь кинорежиссера.

**Генадзь Вінярскі**, дырэктар выдавецтва «Беларускі кнігазбор»:
1. Часлаў Пяткевіч. Рэчыцкае Палесьсе.
2. Кастусь Цьвірка. Край легенд.
3. Польска-беларускі слоўнік.
4. Аляксандар Ельскі. Выбраныя творы.
5. Беларусы ў Бітве за Монтэ-Касына.
6. Міхась Чарняўскі. Дзесяць бітваў.
7. Янка Брыль. Блакітны зьніч.
8. Генадзь Бураўкін. Жураўліная пара.
9. Гарады і вёскі Беларусі. Гомельская вобласьць.
10. Віталь Тарас. На высьпе ўспамінаў.

**Зьміцер Санько**, галоўны рэдактар выдавецтва «Тэхналёгія»:
1. Аляксандар Надсан. Біскуп Чэслаў Сіповіч.
2. Міхась Чарняўскі. Дзесяць бітваў.
3. Джордж Байран. Дон Жуан. Прароцтва Дантэ.
4. Сяргей Панізьнік. Пры сьвячэньні…
5. Вячеслав Носевич. Традиционная белорусская деревня.
6. Вадзім Грудзько. Край.
7. Эрнест Ялугін. Альжырская пастка.
8. Р.Барадулін, В.Вітка, А.Вольскі й інш. Аз-Букі.
9. Даклад аб чалавечым разьвіцьці.
10. Аляксандар Аляксееў, Алег Лукашэвіч. Спадчына Беларусі.

**Павал Абрамовіч**, выкладчык літаратурнай крытыкі, БДУ:
1. Барыс Пятровіч. Шчасьце быць…
2. Арнольд Макмілін. Беларуская літаратура дыяспары.
3. Адам Глёбус. Дом.
4. Андрэй Хадановіч. Лісты з-пад коўдры.
5. Ондржэй Сэкара. Кніжка Фэрды Мураша.
6. 12+1 (Конкурс маладых літаратараў імя Натальлі Арсеньневай).
7. Месца выданьня — Парыж: Выбраныя старонкі часопісу «Моладзь» (1948–1954).
8. Алесь Бычкоўскі. Горад за 101-м кілямэтрам.
9. Часлаў Пяткевіч. Рэчыцкае Палесьсе.
10. Беларуская міталёгія.

**Людміла Рублеўская**, аглядальніца газэты «СБ — Беларусь сегодня»:
1. Аляксандар Аляксееў, Алег Лукашэвіч. Спадчына Беларусі.
2. Уладзімер Някляеў. Так.
3. Барыс Пятровіч. Шчасьце быць…
4. Часлаў Пяткевіч. Рэчыцкае Палесьсе.
5. Віктар Шніп. Беларускае мора.
6. Эдуард Акулін. Непрычалены човен.
7. Аксана Спрынчан. Вершы ад А.
8. Адам Глёбус. Дом.
9. Вячаслаў Рагойша. Паэтычны слоўнік.
10. Васіль Гадулька. Голас.

**Алесь Яўдаха**, незалежны кнігараспаўсюднік (вынікі продажаў):
1. Захар Шыбека. Нарыс гісторыі Беларусі 1795—2002.
2. Сяргей Абламейка. Egoізмы.
3. Уладзімер Арлоў. Адкусі галаву вароне.
4. Яўген Міpановіч. Найноўшая гісторыя Беларусі.
5. Беларуская міталёгія.
6. Сяргей Ёрш. Рыцар Свабоды.
7. Ондржэй Сэкара. Кніжка Фэрды Мураша.
8. Альгірдас Юліюс Грэймас. Пра багоў і людзей. У пошуках этнічнай памяці.
9. Андрэй Хадановіч. Лісты з-пад коўдры.
10. Мілаш Мацоўрак, Адольф Борн. Мах і Шэбестава вандруюць па сьвеце.

**Янка Саламевіч**, гісторык літаратуры:
1. Часлаў Пяткевіч. Рэчыцкае Палесьсе.
2. Беларусы. Т.7. Вусна-паэтычная творчасьць.
3. Леанід Маракоў. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794—1991. Т.3.
4. Вячаслаў Рагойша. Паэтычны слоўнік.
5. Назвы населеных пунктаў Беларусі. Гарадзенская вобласьць.
6. Пол Вэксьлер. Гістарычная фаналёгія беларускае мовы.
7. Гарады і вёскі Беларусі. Гомельская вобласьць.
8. Янка Брыль. Блакітны зьніч.
9. Ян Чачот. Сьпевы пра даўніх ліцьвінаў да 1434 г.
10. Аляксандар Надсан. Біскуп Чэслаў Сіповіч.

# Спэцыяліст па рамантыцы

Наталка Бабіна

— Які жах! — вырвалася ў мяне адрухова, і суседка павярнула галаву.

Таксама адрухова я прыкрыў морду нумарам «La palabra». Больш за ўсё мне зараз хацелася ўціснуцца ў плястыкавы шэзьлёнг ды прыкінуцца матрацам. Суседка глядзела зь цікавасьцю.

— Калі ласка, устаньце перада мной, а то, крый божа, ён мяне пазнае! — заблагаў я шэптам, зьвяртаючыся да яе. — Закрыйце мяне ад яго, прашу вас, — падбародзьдзем і вачыма я паказаў на Гансала.

Суседка — відаць, з тых, хто ніколі не адмаўляецца дапамагчы блізкаму, — паслухмяна падвялася і заняла такую пазыцыю, каб максымальна закрыць мяне сваімі немізэрнымі формамі ад магчымага позірку Гансала. Досыць тыповая камічнасьць (ці камічная тыповасьць) гэтага кавалера сярэдняга веку з акруглым мазалём, лысага з бардзюрам, на тонкіх махнатых ножках, які заграбаючы пляжнымі пантофлямі, задаволены ўсім, крочыў удалячынь уздоўж берага, выклікала на яе поўных вуснах лёгкую ўсьмешку. Калі фігура досыць аддалілася, я уздыхнуў з палёгкай.

— Шчыры вам дзякуй. Вы мяне выратавалі.

Яна паглядзела на мяне таксама з усьмешкай, але, здаецца, ня ўбачыла ўва мне нічога камічнага і адказала:

— Няма за што. Але хто гэта быў? Ваш крэдытор? Пацыент, якому вы памылкова выдалілі гіпофіз? Канкурэнт, які на вас палюе?

Яе ангельская, як і мая, патыхала International House'ам. Я пачухаў патыліцу.

— Не, гэта… як гэта растлумачыць, — я падбіраў словы і таму гаварыў павольна, — гэта мой знаёмы спэц па рамантыцы.

— Спэц па рамантыцы?

— Як гэта лепш сказаць?.. Аднак ці не адмовіліся б вы ад кілішка віна? — прапанаваў я.

— Вядома, не адмовілася б.

— Я прынясу.

Калі я падаваў ёй бакал зь мясцовым белым, яна затрымала погляд на маім перадплечны, дзе красаваліся шнары ад ранення. У яе быў дзіўны позірк: туман яе тайны агартаў яго, і вочы зусім не блішчалі.

— Дзякуй. Але як вам удалося атрымаць такія вялікія бакалы? Мне бармэн заўсёды налівае віно ў нешта накшталт напарстка.

— Дык мы зь ім землякі, нам лягчэй дамовіцца, — усьміхнуўся я. — Давайце пазнаёмімся: мяне завуць Артэміё, я з Эквадору.

— Марыя, зь Беларусі.

Амэрыканка, якая загарала побач, глядзела на нас так, як быццам мы пілі не віно, а сінільную кіслату. Тут поўна тлустых амэрыканцаў, якія прыехалі на Каляды да цёплага мора; усе як адзін вядуць яны здаровы лад жыцьця, п'юць толькі мінэральную ваду, а самыя адорвы — напалам разбаўленае кокай піва. Барані іх госпадзе!

Ранішні ветрык яшчэ не зрабіўся празьмерна гарачым, лёгкія акіянскія хвалі набягалі на пясок, які яшчэ не пасьпеў разагрэцца. Я азірнуўся, каб упэўніцца, што Гансала не вяртаецца.

— Цяпер прыйдзецца або скрадацца, каб ён мяне ня ўбачыў, або зьяжджаць адсюль, — сумна вымавіў я.

— Вы ня любіце рамантыкі? — пацікавілася яна.

— Спэцыялістаў па ёй не люблю. Бачыце, я быў, як і гэта… былы партызан. Наўрад ці вы зразумееце, што гэта такое…

— Чаму ж, выдатна зразумею. Мае бабуля зь дзядулем былі партызанамі, як і добры тузін сваякоў; нават сваю Беларусь мы часта называем краінай-партызанкай.

— Вось як? Тады, можа, мне і ўдасца вам растлумачыць. Бачыце, па маладых гадах я быў *камандантэ*, то бок, як гэта… камандзірам партызанскага атраду ў сябе на радзіме. Атрад быў часткай вялікай паўстанцкай арміі. Мы ставілі сабе на мэце скінуць прадажную ўладу, дабіцца справядлівасьці і роўнасьці для ўсіх…

— І ўдалося?

— Уладу мы скінулі, а наконт астатняга… Але слухайце далей. Дык вось, Гансала прыбыў у наш атрад з цэнтру. Яго накіравалі да нас вось як спэцыяліста па рамантыцы, у нас такіх людзей называюць *камісаро*, ён таксама павінен быў пісаць для цэнтральнай паўстанцкай газэты артыкулы пра жыцьцё нашага атраду, якое зь яго прыездам выразна зьмянілася.

Гансала стаў штодзённа праводзіць мітынгі, акрамя таго, гадзіну штораніцы мы мусілі ўголас чытаць тую самую цэнтральную газэту. Хлопцы бурчалі, але я ніякіх захадаў супраць яго дзейнасьці не рабіў, бо меркаваў, што мушу падпарадкоўвацца рэвалюцыйнай дысцыпліне, тым больш што і без Гансала ў мяне, маладога *камандантэ*, клопату і згрызот хапала вышэй галавы… Аднойчы ён перавярнуў на сябе кацёл з супам, які меўся стаць вячэрай усяму атраду, а ў другі раз ледзь ня трапіў на зуб алігатару, асабістым прыкладам даводзячы неабходнасьць і карыснасьць водных працэдур… Нечага такога я ад яго і чакаў.

Хутка ён асвоіўся настолькі, што фантазія яго, дасюль прыціснутая нязвыклымі ўмовамі жыцьця ў сэльве, разгарнулася напоўніцу і буйным цьветам закрасавала. Раз ён сказаў мне, што ў нашым атрадзе не стае рамантычнага, узьнёслага рэвалюцыйнага каханьня, якое магло б, у пераказе яго, Гансала, ператварыцца ў цудоўную аповесьць ды натхняць і клікаць іншых на рэвалюцыйныя подзьвігі. Ён, Гансала, хацеў бы напісаць на гэтую прадуктыўную тэму, але няма фактаў, а хлусіць у сваіх артыкулах ён не прывык.

> Любоў церпіць доўга, умілажальваецца, любоў не зайздросьціць, не праслаўляе сябе, не ганарыцца, не бушуе, не шукае свайго, не раздражняецца, не намышляе ліха, ня радуецца зь няпраўды, а разам цешыцца зь ісьціны.

Я, на жаль, быў у той дзень у гуморы і легкадумна пажартаваў:

— Як гэта няма? А Гітлер і Алісія? Яны яўна нераўнадушныя адно да аднаго, толькі што саромеюцца праявіць свае пачуцьці.

Гансала жартаў не разумеў. Ня раз потым мне хацелася вырваць сабе язык за гэтыя словы. Ён усрыняў усё з энтузіязмам і адразу ж узяўся за справу.

Гітлер — самы змрочны і страшны выглядам баец атраду. Вялізны, вусаты, з восьпінамі на смуглым твары, выключна маўклівы, ён ні з кім не калегаваў і ніколі не цікавіўся дамамі, нават самымі маладзенькімі ды жвавымі, а тым больш Алісіяй — адзінай кабетай у атрадзе, нашай паварыхай. Яна здавалася, хутчэй, місай перавараной паэльі, чым жанчынай. Няпэўнага ўзросту, трохі адсталая разумова, яна днямі праседжвала ля сваіх катлоў, як купа, наразаючы мяса, месячы цеста, смажачы блінцы, каштуючы, прысольваючы, памешваючы, і толькі час ад часу адыходзіла ад свайго вогнішча ў лес, ледзьве рухаючыся на тоўстых, сініх, як ствалы гуаявы, нагах.

Ну дык вось, Гансала ўзяўся за справу.

Ён закінуў мітынгі і палітінфармацыі. Удзень ці ўвечар варта было прайсьці па лягеры, як вы маглі заўважыць яго дзе-небудзь побач з Гітлерам ці паварыхай. Вось, седзячы на паваленай сэйбе, ён начышчае разам з Гітлерам разабраны карабін ды прапаведуе:

— Рэвалюцыйнае каханьне… Рэвалюцыйнае шчасьце…

— Рэвалюцыйнае шчасьце… Рэвалюцыйнае каханьне… — глуха даносіцца ад патухлага кухарчынага вогнішча, дзе наш Гансала лушчыць з Алісіяй фасолю.

— Прыгажосьць жанчыны зьзяе знутры, — мармоча ён, едучы каля Гітлера на кані.

— Мужчына, які прысьвяціў сябе рэвалюцыі, ня мае часу на заляцаньні, — зьвесіўшы кароткія ножкі, ён трасецца на перадку кухарчынага фургона і пераконвае яе ў тым, як яе кахае Гітлер, але сарамеецца прызнацца. І так бясконца.

Толькі-толькі скончыўся сэзон дажджоў. Зь лесу даносіліся п'яныя воклічы малпаў, спароўваліся вадзяныя зьмеі, зямля набрыняла жыцьцёвымі сокамі настолькі, што нельга было абаперці на яе вінтоўку — руля адразу ж выпускала карэньчыкі, укрывалася маладымі лісточкамі і нават зацьвітала. Ці гэта паспрыяла, ці красамоўства нашага *камісаро*, ці — я часам думаю — можа, і сапраўды ў Алісіі ды Гітлера было нейкае ўзаемнае прыцягненьне, пра якое ніхто і не здагадваўся, — толькі іх сталі бачыць побач. Цяпер Гітлер, а не Гансала, Гітлер, змрочны, як заўжды, лушчыў з Алісіяй фасолю, насіў ваду і мыў катлы, а вечарамі яны доўга моўчкі праседжвалі разам каля вогнішча, якое пацыху згасала. Калі вуголле канчаткова хавалася ў попел, Алісія цяжка падымалася і зьнікала ў сваім фургоне, Гітлер ішоў да сябе ў намёт, а назаўтра ўсё паўтаралася.

Гансала зрабіў выснову, што гэта — каханьне, і з чыстым сумленьнем застрачыў свае артыкульчыкі. «Каханьне вядзе ў бой», «Рэвалюцыя дала ім шчасьце», «Мне ня трэба другога лёсу» — ён чытаў іх нам уголас, калі яны выходзілі ў газэце.

Аднойчы раніцай Алісія выйшла са свайго фургона, несучы на руках немаўля, захутанае ў адну зь яе спадніц. У мяне адвісла сківіца. Гансала вылупіў вочы. Хлопцы змоўклі, як па камандзе. Паварыха перадала дзіця Гітлеру і ўзялася за прыгатаваньне сьняданку. Выраз твару Гітлера трэ было бачыць. Шчасьце — ніякае, праўда, не рэвалюцыйнае, а простае бяздумнае шчасьце — зьмякчыла яго, як вільгаць доўгага дажджу можа зьмякчыць выраз твару драўлянай скульптуры. Ён трымаў дзіця на руках і ўсьміхаўся.

— Ну, што будзем рабіць, дарагі сват? — злосна пацікавіўся я ў Гансала. — Узрошчанае табой каханьне дало плён. Шульке, так бы мовіць. Апошні ветах каханьня. Дык што будзем рабіць?

Гансала толькі лыпаў вачыма і нешта не сьпяшаўся бегчы пісаць артыкул «У атрадзе «Перамога» нарадзілася рэвалюцыйнае дзіця».

Гэтае нечаканае дзіця складала праблему. Відавочна, жанчына зь немаўляткам ня можа жыць у атрадзе, які блукае па сэльве. А куды іх падзець? Сваякоў у Алісіі не было, і ўрэшце мы з Гітлерам вырашылі, што яе трэба адправіць да яго крэўных, у далёкі горны пасёлак. Дарога туды — ня блізкі сьвет і досыць небясьпечная. Гітлеру і Алісіі адным яе не адолець, і я вырашыў, што мы правядзём іх туды ўсім атрадам. Па рацыі зьвязаліся з цэнтрам, я данёс пра нашу сытуацыю, атрымаў вымову і дазвол, і мы рушылі. На трэці дзень шляху мы ледзь што ня трапілі ў засаду ўрадавых войскаў. Прыйшлося адступіць і схавацца ў балоце. Трэ было затаіцца, і тады б нас не заўважылі. У адваротным выпадку прыйшлося б прыняць вельмі няроўны бой у нязручнай пазыцыі — урадавы атрад быў нашмат большы за наш ды ішоў з гары, а мы сядзелі па пояс у вадзе і тузінамі аддзіралі зь сябе п'явак, што адразу зноў прысмокталіся да цела. Адступіць далей у балота мы не маглі — дрыгва.

Пахаваўшыся за карчамі, усе замерлі.

І тут нечакана раскрычаўся хлопчык. Ён не хацеў браць цыцку, круціў галоўкай і крычаў штохвіліны мацней. Мы ўжо бачылі на дарозе ворагаў. Вось-вось яны маглі пачуць дзіцячы крык і выявіць нас. І тады нам каюк.

**Працяг на старонцы 10.**

## ЗДЫМКІ ГОДУ



**Кандыдат у прэзыдэнты 2001 г. Міхаіл Марыніч ад 26 красавіка сядзіць у СІЗА КДБ. Яго вінавацяць у крадзяжах і незаконным захаваньні зброі. Справа выглядае цалкам сфабрыкаванай.**

**Лета 2004. Вёска Кіраў на Нараўляншчыне — рэкардыстка па накапленьні радыяцыі людзьмі.**





**Гурт «Індыга» пасьля перамогі на «Басовішчы-2003» выдаў канцэптуальны альбом «Дні».**

**Жнівень. Памёр Нобэлеўскі ляўрэат Чэслаў Мілаш, паэт, народжаны Віленшчынай.**



# Забыцьцё

## Каляднае апавяданьне ў форме тыднёвага дзёньніка

Адам Глёбус

### Панядзелак

Новы дзень мой пачынаецца ўночы. Перад сном чытаю і завучваю вершы. Мне ўсё яшчэ патрэбна памяць. Без паэзіі памяці няма, таму чытаю і завучваю: *«Напачатку стварае Бог неба і зямлю. Зямля нябачная і пустэльная. Адно дух Божы лунае над вадою. Кажа Бог: хай будзе сьвятло. Утвараецца сьвятло. Бачыць Бог сьвятло, бачыць, што яно — добра, і аддзяляе сьвятло ад цемры. Называе Бог сьвятло днём, а цемру — ноччу. Быў вечар, была раніца: дзень першы».*

**Кватэры…** Пасярод дня да мяне заходзіць жанчына — Ліліт. П’е каву, скардзіцца на бацьку, які, цяжка ўздыхаючы, пытаецца, калі яна зьедзе зь ягонай кватэры. Жыць у роднага бацькі з мачыхаю яна ня хоча, бо далёка езьдзіць на працу. Жыць у айчыма з мамаю яна таксама ня хоча. Яна хоча жыць з мамаю і бацькам або з айчымам і мачыхаю. Гэта нерэальна. Жыць у маёй кватэры яна не гатовая. Ёй трэба яе кватэра, але яна ўсё ніяк ня можа яе выбраць, каб набыць. «Калі ты купіш нам кватэру?» — безьліч разоў чую я ад Ліліт. Ёсьць асобы, а жанчына якраз зь іх, якія ўспрымаюць рэчы блізкіх людзей як свае, а уласныя рэчы яны старанна ахоўваюць і нікому не даюць. Мне сваякі і каштоўнасьці Ліліт не патрэбныя зусім. І яе шматлікія палюбоўнікі мяне мала цікавяць. Каб яе бацька не займаўся творчасьцю, я б яго ведаць ня ведаў. Але ён — актыўны творца, і нашы погляды на мастацтва не супадаюць. Ліліт злуецца. Даводзіцца сварыцца. Сварыся. Яна сьцінаецца, трымціць, апранаецца, кідае «Дзякуй за каву» і зьбягае.

### Аўторак

Завучваю далей: *«Кажа Бог: няхай будзе абсяг пасярод вады, і хай аддзяляе ён ваду ад вады. Стварае Бог абсягі, аддзяляе Бог ваду, што пад абсягам, ад той, што над абсягам. Робіцца так. Называе Бог абсяг небам. Быў вечар, была раніца: дзень другі».*

**Нумар…** Раман пачынаецца і заканчваецца. Канчатковасьць часам цешыць больш, чым пачатковасьць. Дзень сьмерці — лепшы за дзень нараджэньня. Здаецца, так сказана ў Кнізе Кніг. Вучыш, запамінаеш, а як бярэшся цытаваць, выходзіць вельмі прыблізна. Але думку я захаваў. Таму варта распавесьці, як скончаецца каханьне. Сяджу ў кавярні «Акварыюм» і перабіраю ў тэлефоне нумары знаёмых. Вольны вечар. Можна з кімсьці сустрэцца і пагаварыць, можна выпіць гарбаты ці гарэлкі, можна пайсьці з жанчынаю на сьвежую прасьціну. А трэба ўзяць і сьцерці з тэлефоннай памяці нумар сотавіка Ліліт, зь якой шматкроць падаў на прасьціну. Сьціраю. Каханьне скончылася. Яно, пэўна ж, скончылася раней, але апэрацыя па выдаленьні з сотавіка нумару жанчыны якраз і фіксуе заканчэньне каханьня.

### Серада

Далей вучу тэкст: *«Кажа Бог: няхай зьбіраецца вада, што пад небам, у адно месца, і зьявіцца глеба. Робіцца так. Называе Бог глебу зямлёю, а ваду морам. Бачыць Бог, што гэта добра. Кажа Бог: няхай родзіць зямля траву, што дае насеньне, і дрэвы ўрадлівыя, што даюць плады. Робіцца так. Утварае зямля траву, што сее насеньне, і дрэвы, што родзяць плод. Бачыць Бог, што гэта добра. Быў вечар, была раніца: дзень трэці».*

**Паведамленні…** Вырашаю прыбраць з тэлефона паведамленьні, дасланыя Ліліт. Адкрываю, перачытваю… «Прэсна»? Гэта калі я сказануў, што наш сэкс прэсны… «Маленькі і танцуеш»? А гэта пасьля таго, як яна вырашыла зрабіць на сваёй працы маленечкі пакой для мяне, каб у хвіліны смутку адчыняць той пакой, а я — маленечкі — танчыў бы і весяліў яе. «Засумавала!» Безнагоднае паведамленне. Засумавала і засумавала. Чамусьці на безнагоднае я памкнуўся быў адказаць адным словам «Сумуй». Толькі паведамленьне не прайшло. Бывае, паведамленьне не праходзіць. Я ня стаў паўтараць, але і сьціраць паведамленьняў ня стаў. Хай крышку павісяць у тэлефоне. Хай яшчэ… Сьці-ра-ю.

### Чацьвер

*«Кажа Бог: няхай будуць сьвяцілы на небе дзеля аддзяленьня дня ад ночы. Няхай будуць яны сьвяцільнямі на небе, каб сьвяціць на зямлю. Робіцца так. Стварае Бог два сьвяцілы на небе: Сонца, каб радзіць удзень, і Месяц, каб радзіць уночы, — і зоры. Ставіць іх Бог на небе, каб сьвяціць на зямлю, і кіраваць удзень і ўначы, і аддзяляць сьвятло ад цемры. Бачыць Бог, што гэта добра. Быў вечар, была раніца: дзень чацьвёрты».*

**Падарункі…** Каханьне нашае плыве два гады. У мяне застаюцца падарункі ад жанчыны. Выкінуць? Перадарыць? Скласьці ў скрыню і паставіць у цёмны кут шафы? Так і раблю — пакую ў папяровы пакет. Белая плястыкавая бутэлечка, у якой мая жанчына прыносіла сьвятую ваду з царквы, а потым уважліва глядзела: ці ня здарыцца што са мною ад Божай вады, ці ня вырастуць рогі з хвастом. Не пакрыўся я поўсьцю, не перакінуўся ваўкалакам. Як быў Ваўком, так і застаюся Ваўком. Пэўна, я тады крыху расчараваў сваю жанчыну, ну як не расчараваў, дык зьдзівіў. Яшчэ я зьдзіўляю яе на Вялікдзень, калі паказваю кавалак яе пірага зь мінулага Вялікадня. Пірог я захоўваю ў бляшанцы з-пад кавы. У цёмны кут яго! І блакітны ручнік зь белымі медзьведзянятамі — у кут. Запальнічку і партабак… Я да іх вельмі прывык. Запальнічку больш за два гады ў кішэні нашу. Як тут не прыкінуць? У пакет і ў кут. Мне трэба час, каб адвыкнуць ад рэчаў, падораных Ліліт. Адвыкну і, не адкрываючы пакета, выкіну ўсё на сьметнік, далібог выкіну… Выкідаю.

### Пятніца

*«Кажа Бог: няхай утварае вада гадаў, душу жывую, і птушкі няхай лётаюць над зямлёю па небе. Стварае Бог рыб вялікіх, гадаў і птушак паводле роду іх. Бачыць Бог, што гэта добра. Блаславяе іх Бог, кажучы: пладзіцеся і памнажайцеся, і напаўняйце воды ў моры, і птушкі няхай множацца на зямлі. Быў вечар, і была раніца: дзень пяты».*

**Малюнкі…** Пачынаючы з аўторка, усе дні падаюцца мне суботамі. «Заўтра выходны, адпачну… — думаецца ў вольную хвіліну. — А нядзеля так далёка…» Даўно я не чакаў нядзелі. У мяне не ставала часу адчуваць стому, бо жанчына зьядала процьму часу. Цяпер час ёсьць. Ёсьць час зьбіраць каштоўныя камяні і час раскідаць дыямэнты. Ёсьць час, каб жыць разам, і час, каб жыць асобна. Мне запозна жыць з гэтай жанчынаю, а ёй зарана жыць са мною. Ёсьць час, каб разгарнуць тэчку з малюнкамі Ліліт і парваць іх на дробныя шматкі. Аўтапартрэт зь пералікам рэчаў, што я паабяцаў жанчыне: «Дзіця, дом, футра, чаравічкі, дыямэнты, раман і вершы». Усё было, толькі ня тое і не такое, ня ў той момант і ня той формы. На шматкі. Краявід з морам і пальмамі, дзе мы мусілі адпачываць. Над морам скачуць дэльфіны, падобныя да трытонаў. «Ты ня маеш права чапаць маіх трытонаў!» — папярэдзіла жанчына, дорачы малюнак на рэстарацыйнай сурвэтцы. Ня маю права? Маю! На шматкі. Шматкі ў сьметніцу. Аднаўленьню малюнкі не падлягаюць.

### Субота

*«Кажа Бог: няхай утворае зямля душу жывую паводле роду яе, быдла, і гадаў, і зьвяроў зямных. Робіцца так. Стварае Бог жывёлаў зямных, і быдла, і ўсіх гадаў паводле роду іх. Бачыць Бог, што гэта добра. Кажа Бог: ствараем чалавека на вобразе і падабенстве Нашым; і няхай уладарыць над рыбамі марскімі, і над птушкамі нябеснымі, і над быдлам, і над усёю зямлёю, і над гадамі, што поўзаюць на зямлі. Стварае Бог чалавека паводле абрысу Свайго, паводле вобразу Божага стварае: мужчыну і жанчыну стварае Ён. Блаславяе іх Бог і кажа ім Бог: пладзецеся і памнажайцеся, і напаўняйце зямлю, і валодайце ёю, уладарце над рыбамі і птушкамі, над усімі жывёламі і гадамі. Робіцца так. Бачыць Бог: усё, што робіцца, — добра. Быў вечар, была раніца: дзень шосты».* Столькі не завучу. Трэба будзе паўтараць на наступным тыдні.

**Фатаздымак…** Набліжаюся да таго ўзросту, калі сьмерць раўналеткаў перастае зьдзіўляць. Як цяпер зусім не зьдзіўляе сьмерць бацькоў маіх аднагодкаў. Успрымаць сыход блізкіх людзей стаічна яшчэ не навучыўся. Увесь час падаецца, што той ці іншы чалавек замала пажыў і шмат не дарабіў. А ўсё таму, што я ўспрымаю чалавека праз зробленае ім. І сябе я мераю не каляндарнымі гадамі, а напісанымі ды выдадзенымі кнігамі, дапамогамі дзецям ды сваякам, рознымі матэрыяльнымі каштоўнасьцямі, а варта мераць сябе каханьнямі. Цяпер каханьня ў мяне няма. Ці будзе новае? Ня ведаю. У мяне ёсьць адзін фатаздымак, дзе я стаю зь Ліліт, а побач прыляпіўся бяздарны паэт. Я падпальваю аблічча паэта. Ён таленавіта згарае. Яшчэ больш таленавіта згараюць выявы Ліліт і мяне. Попел у попельніцу.

### Нядзеля

*«Так паўстае неба, і зямля, і ўсё войска жывое. Скончае Бог да сёмага дня справы Свае, якія творыць. Блаславяе Бог сёмы дзень і асьвячае яго, і адпачывае ў дзень сёмы ад дзеяў Сваіх, якія Бог творыць і стварае».*

**Прасьціна…** Жанчына вяртаецца. Тэлефануе раз, другі, на трэці я адказваю. Гаворым, маўчым, гаворым, сустракаемся. Нашу яе на руках. Усё аднаўляецца, усё вяртаецца на колы свае. Кахаюся з жанчынаю. Спачатку мы ядзім печыва і п’ём гарбату, а потым любімся. Два разы я кахаюся з жанчынаю на нашай прасьціне, выходзіць дзень натхняльнага і жыцьцесваральнага быцьця.

*Менск, снежань 2004*

**АДАМ ГЛЁБУС — літаратар, выдавец, мастак. Жыве ў Менску.**

## ЗДЫМКІ ГОДУ



**Рыцарскія фэсты сталі часткай беларускай рэчаіснасьці. Жнівень. Фэст у Навагрудку.**

**Юлія Несьцярэнка ўзяла залаты алімпійскі мэдаль у бегу на элітнай дыстанцыі — 100 м.**



**Натальля Машэрава адмовілася ўдзельнічаць у парлямэнцкіх выбарах.**



# Настаўніца ангельскай

Леанід Маракоў

Настаўніца ангельскай мовы Ася Іосіфаўна прыяжджала ў школу на таксі. Заўсёды! На таксі вярталася і дадому. Грошы, якія яна траціла за праезд на работу і з работы, і яе зарплата былі прыблізна сувымерныя, але гэта настаўніцу ангельскай ня надта турбавала. Яе муж, кандыдат навук і заслужаны вынаходнік СССР, працаваў калі ня ў тры, дык у дзьве зьмены дакладна, і Ася Іосіфаўна магла дазволіць сабе гэткую раскошу.

Перадвыпускную 9 «Б» яна прыняла прыблізна з такім запасам ведаў: найлепшыя маглі палічыць па-ангельску да дваццаці і з акцэнтам на мяжы яснасьці сказаць, якая цяпер гадзіна і якую частку сушы займае *Soviet Union*, дзяржава рабочых і сялян, апора міру і дэмакратыі ва ўсім сьвеце (чаму менавіта гэтую тэму ўбівалі вучням у галаву тузін англічанак, што зьмяніліся за гэтыя гады, яны зразумелі якраз у дзявятай); найгоршыя — два другагодкі, Дрыжд і Сьцяпурка, — ня ведалі па-ангельску ні слова. Але, гаворачы так, Санька трохі палку перагнуў. Адно слова яны ўсё-такі ведалі, нават два — *fuck you!*

З гэтых бойкіх слоў і павінна было пачацца кляснае жыцьцё Асі Іосіфаўны. Павінна было — ды не пачалося. Калі гэтая прыгожая, з шыкоўнаю фрызурай і элегантнай постацьцю жанчына ў крэмавым, зь серабрыстаю аблямоўкаю касьцюме зайшла ў клясу, Саньку адразу ж стукнула ў галаву: шкада яе! Месяцы два, можа, і пратрымаецца — маладая ж, энэргічная, поўная сіл.

Ася Іосіфаўна пратрымалася да выпускнога вечара, на што аніяк не спадзяваліся два зухі-другагоднікі. Англічанка ўзяла 9 «Б» хард-рокам. Такога ўдару пад дых ніхто не чакаў. Зайшла на першы свой урок зь невялічкім чамаданчыкам, чым вельмі ўсіх зацікавіла. Гэтым сваім чамаданчыкам яна і зблытала карты другагоднікам, якія рыхтавалі ёй сваю сустрэчу. Дрыжду — прыдурку, істоце без элемэнтарных паняцьцяў аб прыстойнасьці, сумленнасьці і гонары, які мог так «заазоніць» клясу, што хоць уцякай, і боўдзілу з брудна-шэраю фізіяй ды жоўтымі ад курэньня зубамі і рукамі Сьцяпурку, вялікаму аматару патрэніраваць кулакі на малодшых ды слабейшых і па-заечаму баязьліваму перад дужэйшымі, што маглі пастаяць за сябе.

Сказаўшы звычайнае *«Morning»*, Ася Іосіфаўна паставіла на стол чамаданчык, адчыніла.

— Ды гэта ж прайгравальнік!

Прапусьціўшы міма вушэй зьдзіўленьне вучняў, яна выняла з каляровага пакету з рэклямай элітарнай джынсавай фірмы «One» альбом «Led Zeppelin» са знакамітай «Immigrant song» («Песьняй імігранта») і паставіла дыск на прайгравальнік. Пасьля невялікай паўзы ў кабінэт, нібы гром з маланкаю, уварваўся Плант і — застагнаў, загаласіў аб няшчаснай, бадзяжнай долі іншаземца, быццам схапіў клясу за горла — усіх і адразу:

On we sweep with threshing oar,
Our only goal will be the western shore[1].

Добра яшчэ, што вучні 9 «Б» тады ня ведалі перакладу. Ды ня толькі яны. Бо нішто сабе мэта, ды яшчэ і запаветная!

Следам у «Friends» («Сябры») не дала апамятацца Пэйджава гітара. Прарвалася, улезла ў душу і давай яе вярэдзіць, ірваць на кавалкі:

Bright light almost blinding, black night
still there shining,
I can't stop, keep on climbing, looking for...[2].

Непараўнальная і непераймальная, што стала клясыкаю блюзу «Since I've been loving you» («Таму, што кахаю») увяла ўсіх у транс. Кляса скамянела, нібы прысуджаная да пакараньня сьмерцю.

...How I love you, darling...
Since I've been loving you, I'm about to
lose my worried mind...
Said I've been crying, my tears they fell
like rain,
Don't you hear, don't you hear them falling,
Don't you hear, don't you hear them falling[3].

Дабіла ўсіх маркотная «Tangerine» («Мандарын»):

I was her love, she was my queen,
And now a thousand years between...[4].

і завадная, заўсёды вясёлая «Bron-Y-Aur Stomp» (і як яе перакласьці?):

Well if the sun shines so bright, or on
way it's darkest night
The road we choose is always right, so
fine...[5]

Усе былі ашаломлены. Па-першае, «жыўцом», з пласьцінкі, гук быў непараўнальны з тым пашорганьнем і парыпваньнем, якое ўдавалася вылавіць з прыёмніка, гатовага захлынуцца пад гул і выцьцё глушылак. Плант нібы жывы паўставаў перад вачыма. Стаяў і гіпнатызаваў, загадваў, рабіў з намі ўсё, што хацеў. Сказаў бы ён: «Замрыце!» — і ўсе замерлі б, сказаў бы: «Памрыце!» — і ўсе памерлі б. Па-другое, так адкрыта — ды яшчэ ў школе! — слухаць забароненых лідэраў хард-року «Led Zeppelin»! Здавалася, зараз уварвуцца міліцыя, гэбісты, салдаты — хто яшчэ? — і ўсіх арыштуюць. Усіх!

Калі скончылася пласьцінка, вучні з палёгкаю ўздыхнулі: можна было перавесьці дух пасьля такой нечаканай атакі. Ажылі, павесялелі і два «факальшчыкі»: хутка ўрок скончыцца, а яны новую настаўніцу нават на тры літары не паслалі. Так можна і аўтарытэт страціць.

Але ім ня шэнціла і далей. Англічанка моўчкі раздала вучням аркушы з тэкстам шчымлівай «Since I've been loving you», растлумачыўшы, што гэта і ёсьць іхняе хатняе заданьне — вывучыць словы песьні, — зачыніла сваю музычную шкатулку і пад крохкую цішыню выйшла з кабінэту.

Дрыжд і Сьцяпурка ачухаліся толькі тады, калі за настаўніцай плаўна зачыніліся дзверы. Скрывілі вусны, каб выдаць свой камэнтар на такі выбрык англічанкі, яны ўжо гатовы былі адкрыць рты, ды тут у кабінэт увайшоў дырэктар.

— Дзявятая «Б», прашу ўвагі. У якасьці экспэрымэнту я дазволіў новай настаўніцы даць вам паслухаць, як ангельская мова гучыць з вуснаў саміх ангельцаў. Але толькі што мне далажылі, што ў клясе адбыўся ледзь ня цэлы канцэрт чужой нам заходняй музыкі. Гэта праўда?

Усе маўчалі.

«Ды пайшла яна…» — па-зьмяінаму, неяк у падлогу прашыпеў Дрыжд, але дырэктар пачуў яго. Пачуў і супакоіўся. Ён лічыў, што ў школьнікаў ня можа быць сяброўскіх адносін з пэдагогамі. Гэта значыць, настаўнікі павінны трымацца на пэўнай дыстанцыі ад вучняў, нават наганяць на іх страх. Фразу, кінутую двоечнікам, ён зразумеў па-свойму: не спадабалася вучням новая настаўніца — ну і хай. Настаўнік павінен вучыць, а не падабацца.

Праз два дні да наступнага ўроку ангельскай мовы кляса падрыхтавалася як мае быць. Дый зададзеную на дом рэч «Led Zeppelin» усе цяпер успрымалі па-іншаму. Мэлёдыя — добра, але калі ведаеш, пра што сьпяваецца… «Since I've been loving you, I'm about to lose my worried mind…» Каханьне даводзіць мяне да вар'яцтва… Гэта табе ня жартачкі!

Толькі двое ня вывучылі тэксту — Дрыжд і Сьцяпурка. Але для іх гэта было не ў навіну. Незвычайным было іншае: другагоднікі не прыйшлі на ўрок. Пасаромеліся ці што? Дасюль ім падабалася, не зважаючы на двойкі і адзінкі, хадзіць у школу. У ёй яны адчувалі сябе каралямі, сяды-тады зрываючы сваю злосьць на малодшых. А тут няйначай пабаяліся паказацца недарэкамі і дурнямі, спалохаліся заданьня маладое настаўніцы. Бо нават дваровыя, старэйшыя за іх хуліганы паважалі і сеё-тое ведалі з «Led Zeppelin».

І гэта сталася штуршком да перамен. Калі на наступным пасьля ангельскай мовы ўроку Сьцяпурка стукнуў кулаком у сьпіну выдатніка Валерку Крычалава, які сядзеў перад ім, той не адказаў ударам на ўдар, але кінуў нязвыклае для сябе слоўца: «Адвалі!»

Яно нібы апякло ўсім вушы і прымусіла павярнуцца да таго, хто яго сказаў. Бамбіза Сьцяпурка спачатку разгубіўся, ды, апамятаўшыся, кінуўся да ніжэйшага за яго на галаву Валерку біцца — абараняць свой падмочаны аўтарытэт. Але — дарэмна! Справа і зьлева ад Валеркі і ззаду за Сьцяпуркам як па камандзе сталі іншыя хлопцы. Яшчэ двое не далі выбрацца з-за парты Дрыжду. Адзін супроць чатырох — Сьцяпурка ў такіх варунках здрэйфіў. Мала таго — неяк адразу зьвяў і пасьля паўзы прамямліў несваім голасам:

— Пусьціце… паку-курыць…

Пусьціце? Пакукурыць? Глядзі ты, новае слова прыдумаў! Ідзі! Труці органы. Дыхай ядам, грам якога каня забівае.

З таго часу і перастала кляса баяцца другагоднікаў. А хутка і зусім пазбавілася ад іх.

А пачалося ўсё з Асі Іосіфаўны і рокераў з «Led Zeppelin». Нездарма, відаць, сталі яны клясыкамі пры жыцьці.

Але гэта яшчэ не канец гісторыі.

У красавіку 19… Ася Іосіфаўна ад'яжджала на зямлю запаветную. Нямала страціўшы грошай за здадзеныя авіябілеты, яна ўсё ж засталася са сваімі выпускнікамі да канца чэрвеня — канца экзамэнаў. Здаўшы апошні, выпускнікі накіраваліся да Асі Іосіфаўны дадому: яна сышла трохі раней, пераканаўшыся, што ў клясе ўсё о'кей.

Напярэдадні вучні скlаліся, купілі малдаўскага віна, цукерак, пернікаў, пакунак папяровак — любімых яблыкаў Асі Іосіфаўны. Заўсёды вясёлая, кампанейская, яна ў той вечар была ў нейкай прастрацыі, а пры разьвітаньні расплакалася — сьлёзы так і цяклі па яе мілым твары. Потым Санька зразумеў, што гэта былі сьлёзы шчасьця, сьлёзы радасьці за сваіх выхаванцаў. Яны тады не на жарт размахнуліся: гаварылі між сабою і з Асяй Іосіфаўнаю толькі на ангельскай.

Калі на разьвітаньне загучала пранізьлівая «Since I've been loving you», Санька, ужо трохі захмялеўшы ад малдаўскага «Вішнёвага», асьмеліўся запрасіць любімую настаўніцу на танец. П'янкі пах яе духоў, блізкасьць прыгожага і добрага твару, адчуваньне праз вопратку яе пышных грудзей ледзь не ўскружылі яму галаву. На шчасьце, скончылася мелёдыя, і ён не пасьпеў пацалаваць настаўніцу, на што ўжо быў рашыўся.

Муж Асі Іосіфаўны, усьмешлівы рухавы дабрак з клясычнаю, як у большай часткі вынаходнікаў, капою чорных валасоў, на разьвітаньне паляпаў Саньку па плячы і сказаў:

— Сьмелы ты хлопец, нават занадта, далёка пойдзеш. — І дадаў, бы ўдакладніў: — Калі асьцярожны будзеш.

Наконт «далёка» вынаходнік аказаўся празарліўцам. А наконт усяго астатняга…

Праз шмат гадоў пасьля таго вызубраная пад прыглядам Асі Іосіфаўны ангельская мова выратавала Саньку жыцьцё ў далёкіх Арабскіх Эміратах. Бездапаможна распластаны на гарачым, як патэльня, асфальце, які пад пякучым сонцам страціў нават свой колер, Санька ўжо адчуў касьцістую руку, што спрабавала загрэбсьці яго, але пасьпеў прашаптаць старому няголенаму арабу, які схіліўся над ім:

— Help me… Heart… Tablets in a breast pocket…[6].

Праз тры тыдні, толькі-толькі вырваўшыся з бальніцы, а разам з тым і з учэпістых рук яе вялікасьці сьмерці, Санька зайшоў у цэнтральны мячэт Дубаю і аддаў належнае здароўю рабы Божай Асі Іосіфаўны Шчаглячык, сваёй настаўніцы, першаму каханьню і завочнай выратавальніцы. У арабскім мячэце ён зычыў шчасьця і доўгіх гадоў жыцьця яўрэйскай прыгажуні.

Санька ня ведаў, што тая, з касьцістаю рукою, якая ўжо спрабавала дакрануцца да яго, зноў паглядзела ў ягоны бок.

[1] Пад стукат вёслаў мы мкнём да запаветнай мэты — берага Захаду. (*анг.*)

[2] То слепіць яркае сьвятло, то цьма
нясьцерпна рэжа вочы,
Ды я спыніцца не магу, я ўсё
ўзьбіраюся й шукаю… (*анг.*)

[3] Ты ня ведаеш, як я кахаю цябе, дарагая…
Каханьне даводзіць мяне да вар'яцтва,
Я плачу, і сьлёзы мае капаюць,
нібы кроплі дажджу.
Няўжо ты ня чуеш гэтага дажджу?
Няўжо ты ня чуеш гэтага плачу? (*анг.*)

[4] Я быў яе каралём, яна — маёй
каралевай,
Але цяпер паміж намі —
тысячагодзьдзі… (*анг.*)

[5] Яркае сонца ці апраметная цемра
чакаюць нас у дарозе…
Але выбраны шлях — правільны…
(*анг.*)

[6] Дапамажыце… Сэрца… Таблеткі ў нагруднай кішэні… (*анг.*)

**ЛЕАНІД МАРАКОЎ — літаратар. Аўтар даведніка «Рэпрэсаваныя грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794—1991».**

ЗДЫМКІ ГОДУ





**Беларускія тэнісісты дайшлі да паўфіналу Кубку Дэвіса. На здымку — Уладзімер Ваўчкоў пасьля разгрому расейскай зборнай.**

**Бел-чырвона-белыя сьцягі над будынкамі на нацыянальныя сьвяты — звыклая зьява для Менску.**

# Жыцьцё паводле Брэга

Кастусь Травень

Рана ці позна, хоча чалавек ці ня хоча, а будзе вымушаны пачаць жыць паводле Брэга, Амосава, Мантыньяка, ці Маі Гагулан. А гэта значыць, каб жыць далей іназіраць вір жыцьця, ён, гэты чалавек, павінен перастаць есьці.

Калі быць дакладным, то ў сапраўднасьці спачатку ён павінен кінуць паліць, затым піць гарэлку, каньяк, віскі, самагонку, «Санцадары» і процьму розных «Агдамаў» і партвэйнаў. Вы помніце дзіўны партвэйн пад назвай «Тры сямёркі»? Калі вы помніце гэны дзівосны напой, то можна сьмела заначыць, што ваша жыцьцё, дружа, не прапала дарма. Колькі дзівосных імгненьняў вы перажылі, спажываючы гэты чароўны нэктар, колькі ўзьнёслых мрой, летуценьняў пранеслася ў вашым уяўленьні за гады вясны вашага жыцьця.

Мой знаёмы доктар, да якога я зьвярнуўся, адчуўшы сябе кепска пасьля бурліва пражытых гадоў, паслухаў грукат майго сэрца, паглядзеў мутныя сцулі, што я прынёс у слоічку з-пад маянэзу, доўга ўглядаўся ў мой язык, мераў ціск, мацаў, кратаў органы, глядзеў у розныя месцы, дзюркі, адтуліны і нарэшце зацьвердзіў:

— Хочаш жыць, Мікола, — перастань жэрці.

Паколькі паводле ягоных рэкамэндацыяў раней я ўжо кінуў паліць, а затым перастаў і выпіваць і пасьля ўсяго гэтага ўсё яшчэ заставаўся жыць, то і гэтая незвычайная парада прымусіла мяне яго паслухацца.

— Месяц ня еж, а праз месяц прыйдзеш да мяне, там пабачым, — прамовіў мой знаёмы доктар Лявон і, крутнуўшыся на крэсьле-круцялі да кампутара, даў нырца ў віртуальную рэчаіснасьць.

З наступнага дня я фактычна перастаў есьці, бо тую траву, розныя напоі, гародніну і садавіну, арэхі і семкі сапраўдны мужчына ежай прызнаць ня можа. Пасьля першых дзён неядзеньня я адчуў лёгкае нарастаючае кружэньне ў рэчаіснасьці. Асяродзьдзе пачало размывацца. Звыклая рэчаіснасьць плыла ў маіх вачах лёгкім хісткім туманам. Розныя маленькія і вялікія думкі, нават глябальныя стратэгічныя дзяржаўныя меркаваньні і распрацоўкі, нажонт якіх я нават хацеў па электроннай пошце зьвярнуцца да Ягонага правасхадзіцельства пана Прэзыдэнта, каб дапамагчы яму ў кіраваньні дзяржавай, — дык вось, гэныя думкі і меркаваньні сплылі некуды ўбок і больш не турбавалі мяне.

Адзіная думка аб ядзе цяпер сядзела ў маёй галаве, як жалезны трактар у дрыгве, і не было аніякай магчымасьці ад яе выратавацца. Мары аб розных любімых мной у жыцьці стравах узьнікалі ў маёй галаве штохвілінна. Я мроіў аб смажаным на патэльні скрылі мяса з сальцам, якое падсмажваецца з абодвух бакоў так, што паміж двума краямі застаецца тая дзівосная пекная скварачка, якая так чароўна растае ў тваім роце, і аб цыбульцы, смажанай разам са скрылёчкамі мяска, і аб бульбачцы ў вялізным рондалі, і аб цэлым слупе пары, якая ўзносіцца да столі. А квашаная капустачка з журавінамі, і ўсё гэта пад чарачку жытнёвай… І размовы, дзіўныя мужчынскія размовы пра розныя геаічныя выпадкі, загадкавае і таемнае каханьне, незвычайныя здарэньні, рэдкую ўдачу…

А вось калі яшчэ ўзяць злоўленых узімку шчупачкоў, ды лінёў, ды ёршыкаў, ды ўсё гэта ўмеючы згатаваць у кіпені ў вялікім алюміневым рондалі, ды некалькі разоў закласьці ў кіпень сьвежых шчупачкоў зь лінямі, то выходзіць такая юха, такая юха, якую затым можна сёрбаць драўлянымі лыжкамі, а можна піць малянкоўскімі шкляначкамі ды пад лусту смажанага мяска, ды пад жытнёвую… Ба-ба-ба… «Я люблю цябе, жызьнь, і надзеюсь, што гэта ўзаемна…»

Сучасная яда таксама мроілася ў мяне ўваччу…

У канцы тыдня, выпіўшы травяного напою і заеўшы жменяй семак з паловай шклянкі лімоннага соку, я перамяшчаўся па абшарах існаваньня зь вялікай цяжкасьцю. Калі я праходзіў у двары каля кантэйнэра са сьмецьцем, мой абвострaны нюх сярод мноства сьмярдзючых пахаў вылушчваў дзівосны пах вэнджанай скумбрыі, падкісьленага чорнага хлеба, непараўнальны да магутнага — аж валіў з ног — пах маянэзу, грудзінкі, сыру і кілбасы. Гэтыя пахі прымусілі мяне насілу амаль на карачках адысьці ад сьметніцы на бясьпечную адлегласьць.

> Скажы ты, стары пярдун, навошта ты мяне пазбавіў ілюзій наконт чалавецтва?

На сваіх родных, калег па працы, знаёмых і незнаёмых людзей, што ўвесь час жэрлі розныя смачныя стравы, я ўжо зьвыкла пачаў пазіраць як на сваіх заклятых асабістых ворагаў. Гэта пачуцьцё неяк нечакана ўзьнялося аднекуль знутры мяне і заняло трывалае месца ў маёй сьвядомасьці. У канцы другога тыдня я ператварыўся ў двухногага ваўка, небясьпечнага для ўсіх, хто меў нейкае дачыненьне да ежы. Хоць знаёмыя, сябры і блізкія ў адзін голас цьвердзілі аб дзівосным маладзеньні майго аблічча, ніхто ня ведаў, што пад гэтым аблічам гадуецца драпежнік.

Прадуктовыя крамы сталі для мяне тэрыторыямі, да якіх я ня мог нават наблізіцца. Я ўбачыў раптам, што горад перанасычаны харчовымі прадпрыемствамі — крамамі, шапікамі, кавярнямі, дзе людзі толькі і рабілі, што куплялі, елі, жавалі, цэрабілі, жэрлі ежу. Горад быў перагружаны ежай і людзьмі, якія елі і жэрлі. Разумовае жыцьцё займала мізэрныя прамежкі часу паміж ядзьбой, гатаваньнем страў, транспарціроўкай харчоў, вырошчваньнем усяго таго, з чаго гатавалася яда, — усіх гэтых емяў і емін. І яшчэ рэчаіснасьць была насычана размовамі аб ядзьбе — хто, дзе, калі, учора ці сёньня, у Менску ці ў Смаленску, што і каго еў і есьць.

На трэцім тыдні мая істота канчаткова пачала ператварацца ў сапраўднага двухногага ваўка з усімі звычкамі і перакананьнямі жыцьцёвай стратагемы гэтых істот. Я пачаў вучыцца хаваць сваё неўтаймоўнае і палкае імкненьне да мэты, навучыўся лагодна ўсьміхацца, хаваць драпежны бляск вачэй, быць ветлівым. Усе людзі сталі ўсьведамляцца мной як «яны», якія супрацьстаяць майму аўтаномнаму асабістаму «я». Калі нехта пачынаў казаць аб духоўным, узьнёслым, я ўнутры сябе ўсьміхаўся і ня верыў ніводнаму слову суразмоўніка. Я разумеў, што гэта такі самы, але больш дасканалы і вытанчаны двухногі ваўчыла.

За тыдзень да заканчэньня тэрміну я зайшоў да знаёмага доктара Лявона на кансультацыю. Проста так, бо ў ягоных парадах я ўжо ня меў патрэбы.

— Прывітаньне, Мікола, ты яшчэ ня склеіў ласты? Малайчына! — зьдзіўлена закрычаў ён, убачыўшы мяне.

— Скажы ты, стары пярдун, — прамовіў я яму ў адказ, — навошта ты мяне пазбавіў ілюзій наконт чалавецтва? Зьнішчыў веру ў ідэалы, у асьвету, адукацыю, прагрэс, у каханьне, у сэнс існаваньня, у асваеньне касьмічнай прасторы?..

— Прыходзь праз тыдзень. Праз ты-дзе-нь! Цыкл яшчэ ня скончаны, — мой знаёмы Лявон ізноў крутнуўся на крэсьле-круцялі і даў нырца ў віртуальную кампутарную рэчаіснасьць.

Праз тыдзень я нарэшце закончыў цыкл і, сасьпеўшы, ужо не пайшоў да Лявона, бо ператварыўся ў дасканалага і вытанчанага хцівага двухногага драпежніка. Ежа для мяне перастала быць асноўнай дамінантай жыцьця і страціла нада мной уладу.

Цяпер звыклым дасьведчаным позіркам я пазнаю стравамана ў — яны, як заўсёды, у большасьці, і, як толькі мне патрэбна іхняя прыхільнасьць, ці апекаваньне, ці нейкая пастанова, я не шкадую грошай, бо ведаю: яны ў палоне мамоны. І гэтага дастаткова для дасягненьня любых маіх драпежных мэтаў.

Дарэчы, знаёмы інтэлектуал нядаўна вярнуўся са Штатаў, дзе праходзіў паскораныя курсы вывучэньня асноў дэмакратыі, лібэралізму і свабоды, — дык вось, ён умацаваў маё меркаваньне. З разгубленым і зьбянтэжаным выглядам ён шчыра пацьвердзіў маю тэзу тым фактам, што Штаты перапоўнены таўстунамі. Народ тамака жарэ яшчэ больш, чым у нас. Вось вам і ўся іхняя хвалёная свабода і дэмакратыя — і ўсё дзеля таго, каб як мага болей есьці.

Быццам цвік, забіты ў скроню, апошнім часам адна думка турбуе мяне: пры гэткіх апэтытах можна ж урэшце зжэрці ўсе плянэтарныя рэсурсы…

*Менск, 12.10.2004*

# Спэцыяліст па рамантыцы

Працяг са старонкі 7.

Белы, але з агнём у вачах, Гансала падступіў да Алісіі. Ён запатрабаваў правясьці рэвалюцыйную сьвядомасьць. Дзіця загубіць увесь атрад. Дзеля ўсіх, дзеля рэвалюцыі трэба ахвяраваць адным. Дзіця трэба прымусіць змоўкнуць. Ён, Гансала, чытаў пра такія выпадкі. Дзіця трэ… Ён не пасьпеў дагаварыць. Гітлер агрэў яго ззаду прыкладам па галаве, падхапіў пад пахі абмяклае цела і прываліў да чахлага балотнага дрэўца. Хлопчык, як пад уражаньнем ад татавага ўчынку, раптам змоўк, знайшоў нарэшце сасок і зацмокаў. Салдаты падыходзілі ўсё бліжэй. Запанавала напружаная цішыня.

Калі яны ўжо амаль прайшлі, калі я ўжо хацеў уздыхнуць з палёгкай, раптам прагучала каманда «Стой!». Іхні камандзір вырашыў зрабіць прывал у цяньку вялікіх кебрачаў ды кашуараў, што расьлі ўздоўж дарогі. Салдаты зламалі строй, пасядалі, разбрыліся…

Хто з маіх байцоў моўчкі маліўся Богу, хто таксама моўчкі праклінаў усё на сьвеце. Заварушыўся і расплюшчыў вочы Гансала. Хлопчык адарваўся ад мацярынскай цыцкі і зморшчыўся… Гітлер пагрозьліва падсунуўся да камісара…

Гансала дзіка азірнуўся. Два салдаты падышлі дзеля нейкай трасцы зусім блізка да нас. Ня ведаю, што Гансала падалося спрасонку, але замест таго, каб маўчаць ды сапці ў дзьве дзіркі, ён раптам зароў рэвалюцыйную песьню і стрэліў у паветра. Гэта было настолькі нечакана, што я аж здрыгануўся. У наступны момант я кінуўся наперад, хлопцы за мной, і загрымеў бой — а куды было падзецца? Самае цікавае, што гэты самы дзікі і недарэчны бой, у якім мне давялося ўдзельнічаць, аказаўся і самым кароткім. Ашаломленыя раптоўным нападам, салдаты нават не пасьпелі расхапаць сваю зброю. Мы ўзялі большасьць зь іх у палон, і адзіным параненым з нашага боку аказаўся я — іх камандзір пасьпеў пальнуць у мяне, перш чым яго самога падстрэлілі.

Мы вярнуліся трохі назад, у горад, каб здаць палонных, а потым уже пасьпяхова правадзілі Алісію да месца.

— А што ж Гансала? — гледзячы на мяне па-над краем бакала, спытала Марыя.

— А што Гансала? Пра сваю лебядзіную песьню ў балоце ён надрукаваў вялікі артыкул, пасьля чаго кіраўніцтва яго ўзнагародзіла. Я прыклаў усе магчымыя намаганьні, каб яго забралі ад нас на павышэньне — зь мяне было цалкам досыць і рэвалюцыйнага каханьня, і рэвалюцыйных песень, дый, шчыра кажучы, і самой рэвалюцыі. Хутка, дарэчы, мы дацiснулі ўрад, і партызанская вайна скончылася. На памяць пра сем яе гадоў у мяне засталіся шнары ад таго раненьня. Час ад часу рана ные — і я ўспамінаю нашага *камісаро* і яго тэорыю рэвалюцыйнага каханьня, што кліча на бой.

— *Любоў церпіць доўга, уміласьцівяецца, любоў не зайздросьціць, не праслаўляе сябе, не ганарыцца, не бушуе, не шукае свайго, не раздражняецца, не намышляе ліха, ня радуецца зь няпраўды, а разам цешыцца зь ісьцінаю*, — працытавала Марыя. — Нічога не гаворыцца пра тое, што каханьне кліча ў бой. Шэсьцьдзесят год таму ў іншым балоце каханьне прымусіла майго дзядулю шандарахнуць па мазгаўні іншага *камісаро*, дзякуючы чаму мой тата таксама застаўся жывы, як і хлопчык Алісіі, — сказала яна, дапіваючы віно. — Дзякуючы чаму потым нарадзілася і я. Але хавайцеся — вунь вяртаецца Гансала.

Я схаваўся. І хаваўся на працягу двух тыдняў калядных вакацый. На Вігілію нам з Марыяй прыйшлося сысьці з гатэлю — з гэтай жа прычыны. Мы бадзяліся па горадзе — мігацелі калядныя агеньчыкі, — потым выйшлі на бераг акіяну. За гэтыя тыдні я ўжо расказаў Марыі многае са свайго жыцьця — сам ня ведаю, як гэта выйшла. Я ўжо ведаў, што Марыя развялася з мужам, таму што праз яго «перастала бачыць веліч і прыгажосьць сьвету», ведаў, што жыве яна з дарослай дачкой і працуе ў фірме, якая гандлюе паперай. І што выправілася яна сюды, на другі бок сьвету, да пірамід зьніклых ацтэкаў, бо адчула, што губляе сэнс жыцьця.

І вось цяпер мы сядзелі на беразе акіяну, які моцна бухаў каля нашых ног, і да ад'езду заставалася тры дні. Я глядзеў на Марыю, маўклівую спадарожніцу, і думаў пра ручнікі адзіноты, палотнішчы тугі, якія зноў закрыюць мае палі сызалю, плянтацыі кавы ды бананаў, калі яна адляціць на свой бок Зямлі. Я чуў шэпт ветру адзіноты ў зарасьніку цукровага трысьнягу, і тут доўгі цень упаў на мяне. Вядома ж, гэта быў ён! Бегчы не было куды. І каб Гансала мяне не пазнаў, я зрабіў тое, што даўно ўжо хацеў, — прыгягнуў да сябе Марыю і моцна пацалаваў.

— *Любоў усё пакрывае, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё пераносіць*, — сказаў я, калі, далікатна кашлянуўшы, Гансала прадэфіляваў міма. — *Любоў ніколі не мінецца, хаця і прароцтвы спыняцца, і мовы змоўкнуць, і веды скасуюцца.* І калі Марыя адлятае ў Беларусь, то любоў ляціць за ёю сьледам. Але, можа, Марыя застанецца са мной у Эквадоры?

Марыя нічога не адказала, але яе вялікія чорныя вочы сьвяціліся ў месяцавым калядным сьвятле.



**НАТАЛЬЛЯ БАБІНА — літаратарка. Нарадзілася ў Заказанцы (Берасьцейшчына). Жыве ў Менску. Сталая аўтарка «НН» і часопісу «Arche».**

# Калядны падарунак з дубнячку

О.ГЕНРЫ (Портэр Вільямс Сыдні, 1862—1910) — амэрыканскі пісьменьнік-гумарыст. Аўтар апавяданьняў, раману ў навэлях «Каралі і капуста».

О.Генры

Завязка гэтай гісторыі гадавалася дваццаць гадоў.

І, у рэшце рэшт, была гэтага вартая.

Каб ты жыў міляў за пяцьдзясят ад Заходняга Ранча, ты б чуў пра яе. У яе быў вадаспад чорных, як смоль, валасоў, пара дужа шчырых вачэй глыбокага карычневага колеру ды сьмех, што зьвінеў між прэрыяў, бы таемная ручаінка. Яе клікалі Разытай Макмалэн, і яна была дачкой старога Макмалэна з Заходняга Авечага Ранча.

Два залётнікі прыяжджалі туды на рудых дарашаватых конях, дакладней, на прыбраных ды пакусаных блыхамі каняках. Аднаго клікалі Мэдысан Лэйн, другога — Малы Фрыё, але тады яго так ня звалі, бо ён яшчэ не зарабіў быў славы пэўнага гатунку. Яго проста клікалі Джонам Макроем.

Ня варта лічыць, што колькасьць годных прыхільнікаў Разыты абмяжоўвалася гэтымі двума. З тузін канякаў грызьлі цуглі ля даўгое канавязі Заходняга Ранча. Авечкі, што не належалі да чарады Дэна Макмэлана, пасьвіліся ў гэтых саванах. На Разыту заглядаліся аўчары ды каўбоі. Але з усіх залётнікаў найбольш прасунуліся Мэдысан Лэйн ды Джоні Макрой, вось чаму варта ўпісаць іх у гісторыю.

Мэдысан Лэйн, малады фэрмэр з-пад Нуэча, выйграў спаборніцтва. Ён і Разыта пабраліся на Каляды. Узброеныя, гарлапаністыя, літасьцівыя каўбоі ды аўчары забыліся на ўсе даўнія крыўды і аб'ядналі намаганьні, каб адзначыць падзею.

Заходняе Ранча скаланалася ад рогату ды грукату стрэльбаў, бляску спражак ды вачэй, гучных каўбойскіх здравіцаў.

У самы разгар вясельля завітаў Джон Макрой, апантаны рэўнасьцю.

— Я прынёс каляднага падарунка! — загарлаў ён, раптоўна зьявіўшыся на парозе з кольтам сарак пятага калібру ў руцэ. Ужо тады Макрой меў рэпутацыю трапнага стралка.

Першая куля сьвіснула ля правага вуха Мэдысана Лэйна. Руля стрэльбы пасунулася на цалю, і куля пацэліла б у нявесту, каб не аўчар Карсан, у якога спуск у мазгах часам змазваўся ды рамантаваўся. Стрэльбы вясельнікаў боўталіся на цьвіках уздоўж сьцяны, як адзнака гжэчнасьці. Але Карсан зь вялікім спрытам схапіў сваю талерку зь мясам ды шпурнуў у Макроя. І сапсаваў стрэл: другая куля зрэзала белыя пялёсткі кветкі на два футы вышэй галавы Разыты.

Госьці абярнулі сталы і кінуліся да стрэльбаў. Забіваць жаніха й нявесту на вясельлі ўсё ж лічылася праявай кепскага тону. Праз шэсьць сэкундаў дваццаць куляў былі гатовыя вылецець у бок містэра Макроя.

— Наступнага разу я стрэлю лепш! — крыкнуў Джоні. — А наступны раз настане! — і выскачыў з хаты.

Аўчар Карсан ірваўся працягнуць пачаты шпурляньнем талеркі подзьвіг. Куля Макроя зь цемры струпяніла яго.

Каўбоі кінуліся сьледам, гатовыя помсьціць. Забойствы аўчароў не заўжды папускаліся. Дый Карсан быў невінаваты. Ён ня браў удзелу ў падрыхтоўцы шлюбу і ніхто з прысутных ня чуў, каб ён гарлаў: «Каляды час у годзе раз».

Але адпомсьціць не ўдалося. Макрой скочыў на каня і з лаянкай зьнік у дубнячку.

Тае начы нарадзіўся Малы Фрыё. Ён стаў «кепскім хлопцам» гэтай часткі штату. Гарбуз ад міс Макмалэн зрабіў яго небясьпечным чалавекам. Калі салдаты перасьледавалі Джоні за Карсана, ён забіў двух зь іх ды распачаў жыцьцё па-за законам. Малы Фрыё цудоўна страляў абедзьвюма рукамі. Зьяўляўся ў гарадах ды паселішчах, пачынаў сварку празь любую драбніцу, адстрэльваў свайго чалавека ды сьмяяўся з шэрыфаў. Ён быў такі халодны, такі жорсткі, такі шпаркі, такі не палюдзку крыважэрны, што лавілі яго вельмі млява. Калі яго ў рэшце рэшт застрэліў ледзь жывы ад страху аднарукі бедачына Мэксыканец, на сумленьні Малога Фрыё было васямнаццаць жыцьцяў. Палову ён забіў падчас сумленных двубояў, дзе вынік залежаў ад хуткасьці. Другую палову — жорстка й без нагоды.

Шмат казак баяць пра ягоную нахабную мужнасьць ды адвагу. Ён ня быў адным з тых дэспэрада, на якіх абрынаюцца пэрыяды велікадушнасьці й нават мяккасьці. Кажуць, ён ня ведаў літасьці да ахвяраў свайго шалу. Але часам на Каляды добра дараваць адзін аднаму, калі магчыма, дзеля тае кропелькі дабрыні, што засталася. Калі Малы Фрыё і зьдзейсьніў добры ўчынак, калі яго сэрца і страпянулася ад спагады, дык адбылося гэта якраз на Каляды.

Той, хто спазнаў каханьне, ніколі не павінен дыхаць водарам кветцы ратамы, бо яна абуджае памяць да небясьпечнае мяжы.

Аднаго сьнежаньскага дня — а зіма была цёплая, як веснавая пара, — Малы Фрыё із спадарожнікам і хаўрусьнікам Мэксыканцам Фрэнкам ехалі між кветцы ратамы. Малы кіраваў сваім мустангам, наструнішыся ў сядле, задуменны й змрочны, вочы яго драпежна прымружваліся. Насычаны, салодкі пах дапяў кудысьці пад ягоныя лёд ды сталь.

— Дзе была мая галава, Мэкс, — сказаў ён, расьцягваючы словы, сваім звычайным мяккім голасам. — Я ж зусім забыўся на свой калядны падарунак. Наступнае начы прыеду й застрэлю Мэдысана Лэйна ў яго на ранча. Ён зьвёў маю дзяўчыну. Разыта пабралася б са мной, каб Мэд ня ўткнуўся. Дзіўна, што я да гэтай пары ня згадваў пра сваё абяцаньне.

— Не кажы абы-чаго, Малы, — адгукнуўся Мэксыканец. — Ты сам ведаеш, што не падступішся й на мілю да ягонае хаты ў калядную ноч. Я заўчора бачыў Алэндэя, дык ён кажа, Мэд будзе пільнаваць ранча. Памятаеш, як ты пастраляў вясельнікаў, як пагражаў? Мяркуеш, Лэйн не цікуе пэўнага містэра М.? Задурыў ты мне галаву сваімі гутаркамі, Малы.

— Я зьбіраюся, — спакойна паўтарыў Малы Фрыё, — адведаць на Каляды Мэдысана Лэйна, і варта было гэта даўно зрабіць. Мэкс, уяві, толькі за два тыдні да тае страляніны на вясельлі я марыў, што Разыта пабярэцца са мной, а ня зь ім, і што мы зь ёй будзем жыць разам, і яна будзе мне ўсьміхацца, і... Мэд зьвёў яе, а я зьвяду са сьвету яго — і менавіта на Каляды, так, спадарства.

— Ёсьць безьліч іншых спосабаў накласьці на сябе рукі, — адзначыў Мэксыканец. — Чаму б табе, напрыклад, ня здацца шэрыфу?

— Я зьвяду Мэда са сьвету, — паўтарыў Малы.

Каляды мелі водар красавіка. Магчыма, паветра й было крыху марозным, але яно шчыкалася як газаваная вада, трохі араматызаваная позьнімі кветкамі ды травамі прэрыі.

Надыходзіў сьвяты вечар. Ранча Лэйнаў сьвяцілася ўсімі вокнамі — чакалі з тузін гасьцей з суседніх ранча. У адным з пакояў стаяла ялінка, бо ў Мэда і Разыты быў трохгадовы сын.

Як сьцямнела, Мэдысан Лэйн адвёў убок Джыма Бэлчэра й яшчэ трох каўбояў, што працавалі ў яго на ранча.

— Пільнуйце, хлопцы, — сказаў Лэйн. — Хадзіце вакол хаты ды сачыце за дарогай. Калі зьявіцца «Малы Фрыё», без пытаньняў адразу страляйце ў яго. Я яго не баюся, а вось Разыта калоціцца кожныя Каляды ад самага нашага вясельля.

Госьці зьяўляліся ў вазках, запрэжаных аленямі, ды на конях і прыемна бавілі час у хаце.

Усё ішло цудоўна. Госьці частаваліся ды хвалілі выдатную вячэру, згатаваную Разытай, потым мужчыны разбрыліся ў купкі па пакоях, на шырокай «галерэі», палілі ды гутарылі.

Елка, натуральна, вабіла самых маленькіх. Але найбольш яны ўзрадаваліся, калі зьявіўся сам Сьвяты Мікалай з цудоўнай белай барадой і ў футры ды пачаў раздаваць цацкі.

— Гэта мой тата, — абвясьціў шасьцігадовы Білі Сэмпсан. — Я яго такога раней бачыў.

Аўчар Бэрклі, стары Мэдаў сябра, паліў на галерэі, калі паўзь яе ішла Разыта.

— Міс Лэйн, спадзяюся, сёлета вы ўжо не баіцёся Малога Фрыё? — запытаў ён. — Ведаеце, мы з Мэдысанам гутарылі пра гэта.

— Амаль, — усьміхнулася Разыта. — Але часам я ўсё яшчэ нэрвуюся. Ніколі не забудуся на той жудасны дзень, калі Джоні ледзьве не пастраляў нас.

— Гэта самы крыважэрны бандыт у сьвеце, — пацьвердзіў Бэрклі. — Гараджане павінны згуртавацца ды забіць яго, як ваўка.

— Яго злачынствы жахлівыя, — пагадзілася Разыта, — але... я... ня ведаю. Мне здаецца, у кожным ёсьць крыху дабрыні. Ён не заўжды быў кепскім — гэта я ведаю.

Яна пайшла далей калідорам між пакоямі. Насустрач трапіўся Сьвяты Мікалай з кашлатымі вусамі ды ў футры.

— Я якраз вымаў з кішэні калядны падарунак для містэра Мэдысана, калі пачуў праз вакно вашыя словы, міс Лэйн, — вымавіў ён. — І я пакінуў падарунак вам. Ён у пакоі справа.

— Дзякуй, добры Сьвяты Мікалай, — радасна адгукнулася Разыта.

Яна скіравалася ў пакой, а Сьвяты Мікалай ступіў у халаднаватае паветра двара.

У пакоі не было нікога, апрача Мэдысана.

— А дзе падарунак, які мне абяцаў Сьвяты Мікалай? — запытала яна.

— Ня бачыў я ніякага падарунка, — засьмяяўся муж. — Хіба што ён мяне меў на ўвазе.

Наступнага дня Гебрыэл Рад, найстарэйшы працаўнік з ранча, заскочыў на пошту ў Ломе.

— Нарэшце Малы Фрыё атрымаў сваю порцыю сьвінцу! — абвясьціў ён паштару.

— Праўда? Як гэта сталася?

— Стары пастух Санча Мэксыканца зрабіў гэта! Ты глядзі! Малога Фрыё забіў пастух! А дванаццатай ночы Грызэр заўважыў, як хтосьці едзе паўз яго ранча, і так зьлякаўся, што хапіў вінчэстэра ды стрэліў. Самае сьмешнае, што Малы быў апрануты як Сьвяты Мікалай — ну, там, белыя накладныя вусы ды ўсё астатняе. Уяўляеш Малога Фрыё ў ролі Сьвятога Мікалая?

**Пераклала з ангельскай Болачка**

ЗДЫМКІ ГОДУ



Кастрычнік. Арлену Кашкурэвічу споўнілася 75 гадоў.

Кастрычнік. Памёр народны пісьменьнік Беларусі Іван Шамякін.



Лістапад. Ва Ўкраіне — Аранжавая рэвалюцыя.



Фатаздымкі году рабілі: Андрэй Лянкевіч, Юлія Дарашкевіч, Анатоль Кляшчук, Алесь Юркойць, Ігар Ласіца, Аляксандар Дзьмітрыеў, photo.bymedia.net, AP

# Фатальная лічба

Уладзімір Лізіяні

Гэта вялікі, трохпавярховы будынак, які нагадвае казармы. На першым паверсе будынку — сталовая, капліца, клясы, спартыўная заля. Усе астатнія паверхі займаюць дартуары. Мэталічныя ложкі, пафарбаваныя ў белы колер, нібыта ў шпіталі, стаяць тут у адзін рад, прыпёршыся ўзгалоўямі да сьцяны; пад ложкамі — невялічкія чамаданы, у якіх можна захоўваць шкарпэткі, насоўкі й нават адзін-два слоікі з варэньнем.

Кожны хлопчык мае свой нумар, які можна ўбачыць на кожнай рэчы, што яму належыць. У галянтарэйных крамах гэтыя нумаркі можна набыць гатовыя — нашытыя чырвонымі ніткамі на палосках белай тканіны, падзеленай на маленькія чатырохбочнікі. На кожным чатырохбочніку вышыты нумар — ад адзінкі й далей. Чатырохбочнікі адзін за адным выразаюць і нашываюць — на кашулі, прасьціны, пальчаткі, майкі, шкарпэткі й трусы.

Аднойчы разьмеркаваны такім чынам нумар застаецца ў памяці на ўсё жыцьцё. Каб ня гэты нумар, зь цягам часу пазабываліся б і холад, і абмарожаньні, і адзінота, і смутак, і ўсё іншае — непрыемнае й дакучлівае, — з чаго складвалася жыцьцё ў каледжы.

Варта ўспомніць гэты нумар, як непрыемны ўспамін, ці, хутчэй, мільёны непрыемных успамінаў усе разам нахлынаюць на вас, бо, калі вы бачыце гэты нумар ці нават толькі чуеце, як яго вымаўляюць, вы адразу ж уяўляеце сабе ўсе пераэжытыя ў каледжы пакуты і, хаця гаворка ідзе толькі пра адзін год, колькасьць гэтых успамінаў застаецца велізарнай, таму што справа ня ў колькасьці месяцаў, ці тыдняў, ці дзён, ці гадзін, а ў кожнай з тых хвілін, зь якіх складваюцца трыста шэсьцьдзесят пяць дзён таго бясконцага году.

Калі б гэта залежала ад мяне, і натуральна, калі б я быў здольны прадбачыць, якой цяжкай вагой гэты нумар пакладзецца на мае ўспаміны, я напэўна выбраў бы сабе больш складаны нумар: 36, 42, 73 ці які іншы — толькі ня той, што быў прызначаны мне і які быў менавіта 7.

Ён гняце мяне. Ён зьяўляецца да мяне кожны дзень і, як толькі я расплюшчваю вочы, зноў кідае мяне ў каламутнае мора ўспамінаў.

«До спаць, Вілі. Ужо сем гадзін», — гурчыць мне ў паўсьне мілы голас маёй жонкі. Нават калі часам яна сыпіць раніцай больш, чым звычайна, ад сну нас адрывае будзільнік. Гадзіна на ім нязьменная — усё тая ж лічба. Таму кожную раніцу, нават улетку, першы мой рух — падыманьне рук угору, уніз далонямі, каб убачыць, як і ці шырока паразрасталіся на пальцах ранкі, пакінутыя пасьля абмарожаньня.

Ніколі — ні раней, ні пасьля — не было ў мяне такіх шматлікіх, балючых абмарожаньняў, як у часы майго знаходжаньня ў каледжы. Амаль усе пальцы на руцэ ўкрыліся вялікімі болькамі: указальны, сярэдні, безымены і крыху ў меньшай ступені — мезенец. Толькі вялікі палец застаўся незакранутым. Раз у тыдзень прэфэкт* каледжу Дзанусі вадзіў мяне да лекара — той намазваў мне на чатыры пальцы пякучую мазь і потым накладваў павязку. Каб на занятках было можна неяк пісаць, я быў вымушаны пратыкаць ручку праз марлю. Праз пару дзён мазь высыхала, а бінт прыклейваўся да жывога мяса. Калі я зноў прыходзіў да лекара, ён шпарка, адным рухам, зьдзіраў бінт. Разам зь ім шматочкамі аддзіралася скура, рука прамочвалася крывёю, але я не павінен быў плакаць. Тады лекар мне казаў: «Вось бачыш, як мы малайцом ды храбрацом!»

Да ўспамінаў пра лекара, які лячыў абмарожаньні, адразу ж далучаюцца ўспаміны пра іншага лекара: той прыпякаў мне лытку й патыліцу пасьля таго, як сабака з каледжу па мянушцы Анар, абараўшы ланцуг, кінуўся на мяне й пакусаў. На гэты раз умяшаўся рэктар: сабака мог быць шалёным і я мог памерці.

Анар напаў на мяне зьнянацку ў час дзённага адпачынку, калі мае іншыя сябры гулялі ў мяч. У той час як яны, пасьля гульні вярнуўшыся ў клясы, зьбіраліся паўтарыць урокі перад вячэрай, я з прэфэктам Дзанусі ехаў у горад да лекара. Я ўпершыню ехаў на аўтамабілі, і для мяне гэта было сапраўднай падзеяй. Натуральна, што я зусім забыўся пра той боль, які мяне турбаваў пасьля прыпяканьняў. Калі я адчуў пякучы кантакт лекаў са скурай, спачатку на назе, а потым на патыліцы, я зароў як апантаны, што заўсёды лепш, чым праліваць слёзы. Як толькі працэдура закончылася, лекар — іншы, ня той, што па абмарожаньнях, — мне сказаў: «Вось бачыш, як мы малайцом ды храбрацом!»

Калі мы з прэфэктам выйшлі з амбуляторыі на пляц, там было цёмна й бязьлюдна. Толькі катэдральны сабор быў крыху асьветлены. Вялікі гадзіньнік на яго фасадзе, пасярэдзіне, якраз пад разонам**, паказваў час — ці варта казаць які? — сем гадзін вечару.

У мяне ў вушах яшчэ гучэў голас Франчэскі, калі, ужо прачнуўшыся, я зноў дэталёва ўспомніў пераэжытыя абмарожаньні і як мяне двойчы ўкусіў сабака. Саскочыўшы з ложка, я шпарка пабег пад душ, чысьціў зубы, галіўся, адцягнуўшы нарэшце сваю ўвагу на тое, як весела ўвіхалася й штосьці напявала на кухні Франчэска, гатуючы каву.

І вось мы разам за сталом — я гляджу на яе, яна на мяне, на маіх руках няма ніякіх прымет абмарожаньняў, а што да сьлядоў ад іклаў ваўкарэза, то, нягледзячы на тое што за доўгія гады нашага сумеснага жыцьця Франчэска вельмі дакладна вывучыла маё цела, яны ніколі не былі выяўлены.

Я ўстаю з-за стала, цалую яе, зьбіраюся ісьці, а яна мне кажа:

— Я ведала, што ты гэта забудзеш.

— Што забуду?

— Які сёньня дзень?

— Чацьвер.

— Месяца які дзень?

Гляджу на каляндар на сьцяне. Чырвоным алоўкам на ім адзначана: надышоў час плаціць па вэксалі. Зусім праўдападобна, што такое папярэджаньне не надае добрага настрою, але яно нічога ня вартае ў параўнаньні з датай заканчэньня тэрміну вэксаля — сёмы дзень месяца.

— Іду ў банк, бывай.

А тым часам бялюткія чатырохбочнікі з чырвонай лічбачкай, вышытыя на прасьцінах, ізноў пачынаюць скакаць у мяне перад вачамі, і, пакуль кірую машынай, я бачу, як яны прыклейваюцца да сьпін пешаходаў, што пераходзяць вуліцу па зэбравых пераходах, і мне здаецца, што я больш не ў Міляне сёньня, 7 красавіка тысяча дзевяцьсот шэсьцьдзесят шостага году, а хутчэй у сумным каледжы майго дзяцінства, сам-насам са сваімі першымі турботамі — якраз перад заканчэньнем тэрміну квартальнай платы за каледж.

Шаўцоў рахунак за рамонт абутку я атрымаў адначасова з квартальным табэлем, і рахунку я баяўся куды больш, чым адзнак. За ім крылася невялічкае махлярства. Не, расцэнкі не былі завысокія нават для маці такога беднага хлопчыка, якім зьяўляўся я. Чаму ж тады такі вялікі рахунак? Адно з двух: альбо я, у адрозьненьне ад усіх іншых маіх таварышаў па каледжы, кожны трымэстар пратупваў сотні кілямэтраў пешшу, альбо гэты шавец, чалавек несумленны, цыраваў мне чаравікі кардонам замест скуры.

Але шавец ня быў несумленны. Ён быў вельмі зычлівы — яго расчуліў і, у нейкім сэнсе, разбэсьціў хлопец, у якога была вялікая жарсьць і які мог задаволіць яе толькі ў змове з шаўцом.

Шаўца звалі Андрэа. Нярэдка ў вольныя гадзіны я сядзеў каля яго невялічкага зэдліка. З выгляду Андрэа быў тлуставаты, кульгавы на адну нагу, ніколі як сьлед ня выгалены, амаль аблыселы. Ён насіў заўсёды адну і тую ж кашулю з шэрай фляналі ў клетку. Яго дужыя грудзі нібыта падтрымліваліся парай чырвоных шлеек, якія ўжо даўно страцілі сваю пругкасьць.

Большая частка маіх таварышаў паходзіла зь сялянскіх сем'яў. Мы павінны былі выйсьці з каледжу сталымі і падрыхтаванымі да сэмінарыі, гатовымі да сьвятарскай кар'еры — калі толькі гэткае жаданьне не прападзе на паўдарозе. Гарадзкім быў толькі я адзін. Магчыма, праз гэта Андрэа й лічыў мяне прыгожым. Што да сьвятароў — яны яму зусім не падабаліся.

— Не туды ты трапіў, Вілі, — казаў ён мне. — Табе месца ў Галівудзе.

З гэткім жа посьпехам ён мог бы сказаць — у Рэйк'явіку ці Катхіявары: у той час мне былі ўсё роўна невядомы ўсе тыя гарады.

Мы пасябравалі, бо мелі супольнае захапленьне — кнігі.

Само сабой зразумела, што я толькі пачынаў рабіцца чытачом: пасьля Сальгары я толькі што перайшоў да твораў Вэрна, крыху раней я адкрыў для сябе дзю Тэрайля, але яго творы ў каледжы чытаць не дазвалялі. Наведваць бібліятэку я мог колькі хацеў — сама наяўнасьць кніг мяне ўжо радавала, і я з асалодай чытаў друкаваныя старонкі, на якіх апавядалася якая-небудзь гісторыя. Я таксама прызвычаіўся чытаць павучальныя — але, на шчасьце, досыць вострасюжэтныя — прыгоды вялікіх місіянэраў, а аднойчы днём з глыбінi кніжных паліц мне трапіў Райдэр Гагард і «Quo vadis?» Сянкевіча.

Я пабег да Андрэа. Ён, усьміхаючыся, даў мне выгаварыцца, пасьля стаў мне тлумачыць, хто быў тыя пісьменьнікі, якія іншыя творы яны напісалі, якое ў іх было жыцьцё. Пры гэтым заўсёды падсумоўваў:

— Далібог, памыліўся ты ў сваім пакліканьні. Будучы сьвятар не павінен столькі чытаць.

Мне ён давяраў. Але калі б такія размовы ён вёў, напрыклад, з Марыё Тосам, ён бы рызыкаваў страціць працу. Марыё Тос нават з выгляду быў падобны на шпіёна. Аднойчы ён назапасіў цыгарэт і ўгаварыў мяне, у час духоўных практыкаваньняў, схавацца за агароджай, каб употай пакурыць. Потым ён данёс на мяне прэфэкту Дзанусі, і той пакараў мяне, забараніўшы на тры дні адпачываць падчас перапынку.

Але гэта мне толькі пасавала! Пакінуты сам-насам за сваёй партай у глыбіні клясы без аніякага нагляду («Што зь ім здарыцца? Не атруціцца ж ён чарнілам?»), я прыкінуўся, што штудзірую Манарэзі, хаця на самай справе прагна чытаў «Турбіну» Чапэка-Хода, якую мне пазычыў Андрэа. Клемянціна першая зь бясконцай працэсіі жаночых пэрсанажаў ня толькі запаланіла сваёй мовай і паводзінамі мае пачуцьці і ўсхвалявала маю фантазію, але й разьварэдзіла маё сумленьне. Калі лічыць гэта за грэх, прызнацца ў ім было немагчыма: я здрадзіў бы Андрэа і яго абавязкова звольнілі б з працы. Менавіта такія выпадкі спараджаюць сумненьні і рызыку ператварыць увогуле шчырага хлопчыка ў аблудніка.

Урэшце я ня толькі не пачаў ухіляцца ад кампаніі Марыё Тоса, а шукаў яе, каб быць зацягнутым у новую пастку і спадзеючыся, што Марыё на мяне данясе. Я жадаў, каб мне прызначылі новыя пакараньні. Бо бязь іх можна было б сказаць «забароненым» чытаньням «бывайце». Але Тос, мабыць, рашыў, што мне захацелася як-небудзь адпомсьціць яму, і спужаўся, што я яго паб'ю. І ён стаў мяне пазьбягаць.

Пасьля гэтага ў мяне нарадзілася іншая ідэя, каб зьдзейсьніць задуманае.

— Андрэа, — рызыкнуў я аднойчы зьвярнуцца да шаўца, калі той быў у гуморы, — мне патрэбна батарэйка для ліхтарыка. Калі ласка, купі мне яе. Добра?

— Добра, куплю, калі дасі грошы.

— Грошай няма.

— У такім разе ніякіх батарэек.

— І ўсё ж батарэйка будзе.

— Якім чынам?

— Вельмі проста. Ты мне яе купляеш за свае грошы, якія потым занясеш у кошт рамонту абутку. Ты можаш так зрабіць і нічога ня страціць пры гэтым.

— Але ж гэта ашуканства.

— Ведаю.

— Навошта табе батарэйка?

— Каб чытаць.

— Калі? Дзе? Цябе адразу ж зловяць.

— Ноччу, пад коўдрай. Ніхто мяне ніколі ня зловіць.

У рэшце рэшт батарэйку ён мне купіў — не адну, а нават сем. Каб хапіла на квартал.

Адной батарэйкі хапала прыкладна на дваццаць чатыры гадзіны, і я, скурчыўшыся пад коўдрай, штодня чытаў дзьве гадзіны запар пасьля адбою. Калі падлічыць, атрымліваецца акурат сем батарэек кожныя тры месяцы.

Менавіта з таго часу я прызвычаіўся засынаць позна і прачынацца цяжка і неахвотна. Вечарам, калі я трымаў у руцэ сваю кнігу, сон звычайна ня ішоў да мяне, але, калі ён усё ж мяне адольваў, я спаў як забіты і, здавалася, ніколі б не прачнуўся.

Падсумаваўшы ўсе мае ўспаміны, можна яскрава ўявіць, якім было жыцьцё ў каледжы.

Аднойчы ўначы, аднак, адбылося нечаканае: замест дзьвюх звычайных гадзін я чытаў немаведама колькі часу й не заўважыў, як моцна заснуў з разгорнутай кнігай і запаленым ліхтарыкам. Прачнуўся я ад холаду, які раптоўна мяне ахутаў, — прэфэкт Дзанусі, сьцягнуўшы зь мяне коўдру, стаяў побач з ложкам у чорнай рызе, грозны й вялізны. У левай руцэ ён трымаў патухлы ўжо ліхтарык, а ў правай — тую самую «праклятую» кнігу, падняўшы яе ўгару, нібыта намагаючыся расьсячы ёй маю галаву, як кат сякерай.

Цяпер я разумею, чаму яго пагрозьлівы жэст і ўсё, што адбылося потым, назаўжды засталіся ў маёй памяці. Калі ён узьдымаў кнігу, рукаў яго сутаны споўз аж да самага локця, агаліўшы валасатую руку. Толькі ў адным месцы доўгіх чорных валасоў не было відаць — там, дзе іх закрываў гадзіньнік. Менавіта ў яго я ўтаропіўся вачыма, як загіпнатызаваны.

Стрэлкі гадзіньніка — ці варта зьдзіўляцца? — дакладна і бязьлітасна паказвалі час, які вельмі даймае мяне ў змрочныя моманты жыцьця: сем гадзін.

**Пераклаў з італьянскай
Вячаслаў Паршонак**

* Прэфэкт — адзін з кіраўнікоў у каталіцкім каледжы, які займаецца кантролем і кардынацыяй вучэбнай работы.

** Разон — круглае разное акно.

Мэталічныя ложкі, пафарбаваныя ў белы колер, нібыта ў шпіталі, стаяць тут у адзін рад, прыпёршыся ўзгалоўямі да сьцяны; пад ложкамі — невялічкія чамаданы, у якіх можна захоўваць шкарпэткі, насоўкі й нават адзін-два слоікі з варэньнем.



**Уладзімір Лізіяні — італьянскі пісьменьнік (нар. у 1915, Трыест). Пісаў газэтныя навэлі для штодзённіка «La Notte», жанр, які пазьней падхапіла большасьць газэтаў Італіі. Таксама пісаў камэдыі на італьянскіх дыялектах, якія ставіліся, у тым ліку, маніфэстантамі падчас падзеяў 1968 г.**

# Дзіўны лёс Ёгана Бартка

Эрых Марыя Рэмарк

Ёган Барток — сьлесар і бляхар — пражыў з жонкай толькі пяць месяцаў. Пасьля пачалася вайна. Яго адразу мабілізавалі і накіравалі ў аўстрыйскі гарнізон на мяжу. У дзень ад'езду ён парадкаваў справы: перадаваў невялічкую крамку жонцы і чаляднiку. Нават удалося атрымаць дзьве замовы. Гэта заняло ўвесь час да абеду; але супакойвала думка, што ўсё будзе ўладкавана сама меней да Калядаў. Калі насунуўся вечар, Барток апрануў найлепшы касьцюм і пайшоў з жонкай да фатографа. Зьбіраючыся, яны, спрацаваныя за дзень, пагадзіліся, што дурная гэта забава. Але вайна прымушала на многія рэчы зірнуць іначай. Фатограф прынёс здымкі наступнай раніцай да цягніка. Барток хацеў абрэзаць фота сьцізорыкам і ўпхнуць пад накрыўку кішэннага гадзіньніка. Але картачкі былі большыя, чым ён чакаў. Тады Ёган зусім адрэзаў свой партрэт і пакінуў толькі жончын. Цяпер усё ўтоўпілася.

Полк Бартка хутка выправілі на фронт. Наступленьне пачалося зімой 1914-га і было адбіта ў жорсткім начным баі. Вораг зрабіў флянгавы наступ і адрэзаў тры роты. Атачаныя бараніліся цэлы дзень і капітулявалі, толькі калі скончыліся боепрыпасы. Сярод іх быў Барток. Палонныя прабылі некалькі месяцаў у перасылачным лягеры. Барток турбаваўся цэлымі днямі. Яму так хацелася б ведаць, што з жонкай, ці ёсьць новыя замовы ў майстэрні, якая цяпер мусіла прыносіць хоць якія грошы. Але ва ўсім лягеры ніхто не атрымліваў лістоў. Барток рабіў адзінае, што мог: сам пісаў дадому, радзіў, даваў адрасы людзей, якім можа спатрэбіцца каваная агароджа ці прыбіральня. Прыкладна ў пачатку красавіка з палонных сабралі групу ў 1800 чалавек і перавялі на ўзьбярэжжа. Барток і яго таварышы апынуліся сярод шчасьліўцаў. Калі іх пагрузілі на параход, папаўзьлі чуткі, што павязуць у лягер ва Ўсходняй Азіі. Пасьля некалькіх дзён шляху амаль ва ўсіх пачалася марская хвароба. Палонныя скупіліся ў цяжкай атмасферы цёмнага труму і палілі, пакуль былі цыгарэты. Толькі праз пару вузкіх ілюмінатараў можна было акінуць вокам мора — так і пазіралі па чарзе. Вада была блакітная і чыстая, часам у ёй мільгалі белыя плаўнікі або цень вялізнай рыбіны.

Канвой паступова зрабіўся нядбайным. Палонныя гэта заўважылі і пачалі рыхтавацца да бунту. Адны высочвалі, у якім памяшканьні складаюць зброю, іншыя прыхоўвалі цішком нагелі, кавалкі канатаў і нажы. Аднае начы адважыліся. Тры бамбізы-унтэры вялі групу палонных, у якой быў і Барток, па каютным трапе. Раптам падканвойныя, быццам каты, кінуліся на атарапелых вартаўнікоў, якія не чакалі бунту. Імгненна паадчыняліся люкі, і палонныя апынуліся наверсе, на палубе. Частку аховы раззброілі ў сьне, а рэшта мусіла здацца. Толькі капітан і два афіцэры занялі абарону і пачалі страляць. Трох палонных яны забілі з рэвальвэраў. Але калі паўстанцы ўсталявалі кулямёт, здаўся і цяжка паранены капітан.

Палонныя запатрабавалі прыстаць у нэўтральным порце. Яны былі добра ўзброеныя і мелі правіянт, а некаторыя і раней бывалі на моры. Былы карабельны афіцэр узяў камандаваньне на сябе. Кожны дзень займаліся шыхтавой падрыхтоўкай, а Барток вучыўся кулямёту. Новы капітан прыкінуў, што спатрэбіцца тыдзень, каб дасягнуць наступнага порту. Але выйшла іначай. На чацьверты дзень над даляглядам зьявіўся шэры нізкі абрыс ваеннага карабля. На ўсіх парах ён ішоў наўздагон. Палонныя не пасьпелі нават як сьлед падрыхтавацца. Яны спадзяваліся пратрымацца да надыходу ночы, а потым пад покрывам туману і цемры зьнікнуць, але ня здолелі. У іх былі толькі кулямёты, бясьсілыя супраць крэйсэрнае брані. За гадзіну бою шмат паўстанцаў палегла, астатнія вымушаны былі ўзьняць белы сьцяг. Карабельны афіцэр застрэліўся, калі першая шлюпка падышла да борту. Капітан крэйсэра абыходзіўся з палоннымі не як з салдатамі, а як зь мяцежнікамі. Усіх іх завезьлі ў нейкую штрафную калёнію на высьпе. Некаторых з зачыншчыкаў расстралялі, сярод іх Міхаэля Хорвата, сябра Бартка. Ён перадаў Бартку свой гадзіньнік і партманэ. «Бывай здароў, Ёган, — сказаў ён і пацісну на разьвітаньне руку. — Усё адно памру так ці інакш, усё роўна прыйдзецца. Спадзяюся, ты выжывеш! Калі мама будзе яшчэ жывая, перадай ёй гэтыя рэчы. Дамовіліся?»

Астатніх палонных зьвінавацілі ў бунце. Кожны пяты атрымаў пажыцьцёвы тэрмін, а астатнія — па пятнаццаць гадоў прымусовых работ. Калі палічыліся, Бартку пашанцавала: ён ня быў пятым.

«Пятнаццаць гадоў, — падумаў Ёган у першы вечар, сьціскаючыся ў распаленым куце бляшанага барaку. — Пятнаццаць гадоў. Цяпер мне трыццаць два. Тады мне будзе сорак сем». Ён выцягнуў з-пад вечка гадзіньніка фота жонкі і доўга разглядаў. Потым прытуліўся галавой да сьцяны і паспрабаваў заснуць.

Праца была цяжкай, а клімат забойчым. Сто восемдзесят чалавек памерлі ў першы год. У другі — сто дзесяць. У чацьверты Барток пасябраваў зь Вільчакам, селянінам з Банату. На шосты год Барток яго пахаваў. На сёмы год страціў пярэднія зубы. На восьмы даведаўся, што вайне даўно ўжо канец. На дзявяты год азыз. На дзясяты зьбегла шаснаццаць чалавек, але пазьней іх схапілі. На дванаццаты год ніхто ўжо не гаварыў пра бацькоўскі дом. Сьвет звузіўся да памераў высьпы, жыцьцё было пакутай і глыбокім сном, туга вычарпалася, боль прытупіўся, успаміны ня мелі ўлады над бессэнсоўнымі рэшткамі істот, што як мёртвыя валіліся ўвечары, а наранак ізноў уздымаліся, каб ісьці на працу; вартаўнікі не зьмяняліся, вялізныя і поўныя ўлады; высокай былі тэмпэратура і адчай.

Калі наглядчык паведаміў, што яны вольныя, яму спачатку не паверылі. Да апошняга дня думалі, што застануцца яшчэ на пяць гадоў, — так яны не маглі ўявіць, што значыць быць вольным. Учорашнія вязьні сабралі свае няхітрыя манаткі й прамаршавалі ўніз па дарозе да порту. Барток яшчэ раз азірнуўся назад. Там, перад баракам, стаялі таварышы, якія атрымалі пажыцьцёвыя тэрміны зьняволеньня. Яны моўчкі пазіралі ўсьлед. Перад ад'ездам Барток пытаў у некаторых, ці не дасласць чаго з дому. «Закрый ляпу!» — адказаў адзін і адышоў. Другі больш нічога не разумеў. Але першы, адышоўшы на пару крокаў, крыкнуў: «Мы таксама вернемся!» Іншыя не зварухнуліся. Яны так і стаялі, зьбялелыя, і пазіралі. Па дарозе да порту Барток выцягнуў гадзіньнік. Фатаздымак быў на месцы, ён пажоўк так, што нічога на ім нельга было разгледзець. Але Барток усё ж дастаў картачку і паспрабаваў успомніць. Ён так даўно не рабіў гэтага, што ад нязвыкласьці закруцілася галава.

На вялікую зямлю Ёган ехаў з парай сваіх таварышаў. Яны цьвёрда ведалі, што іх радзіма цяпер належала краіне, зь якой раней ваявалі. Зямля адышла па дамове — пакту аб міры. Яны не разумелі гэтага, але загадзя зьмірыліся. Бо для іх за пятнаццаць гадоў зьмяніўся цэлы сьвет. Яны бачылі дамы, вуліцы, аўтамабілі, людзей, чулі знаёмыя імёны, але ўсё было чужым. Гарады павялічыліся, рух пужаў, і цяжка было зразумець, што адбываецца навокал. Усё ляцела вельмі хутка. Былыя палонныя прызвычаіліся толькі павольна разважаць.

Нарэшце Барток прыехаў у свой горад. Ён мусіў ісьці павольна і абапірацца на трасьціну — так трэсла яго калені ад хваляваньня. Крама была на тым самым месцы, але ніхто ня ведаў нічога пра жонку. Арэнда за апошнія дзесяць гадоў часта пераходзіла з рук у рукі. Жонка, мусіць, даўно зьехала. Барток шукаў яе паўсюль. Нарэшце дазнаўся, што яна, здаецца, жыве ў большым горадзе на захадзе.

Ён накіраваўся туды. Там прыйшоў да нейкіх дзьвярэй, да нейкай гасьцёўні і запытаўся. І ніхто ня змог яму дапамагчы. Ёган стаяў спустошаны, страціўшы надзею, ды хацеў ужо ад'яжджаць. Раптам узьнікла ідэя. Ён назваў кансьержу прозьвішча свайго былога чаляднiка. Кансьерж яшчэ раз зірнуў у кнігу і знайшоў. Чаляднік і жонка Ёгана пабраліся сем гадоў таму. Барток кіўнуў. Цяпер ён зразумеў, чаму не атрымаў ніводнага ліста, чаму ня чуў нічога аб родным доме. Яны ўжо вырашылі, што ён загінуў. Павольна Барток узьняўся па лесьвіцы і пазваніў. Пяцігадовы хлапчук адчыніў дзьверы. Потым падышла яго маці. Барток паглядзеў на яе, і, не паверыўшы, што гэта яна, спачатку ня мог вымавіць ні слова.

— Гэта я. Ёган, — сказаў ён нарэшце.

— Ёган! — яна зрабіла крок назад і павалілася на фатэль. — Матка Боска! — жонка пачала плакаць. — Але мы атрымалі тады паведамленьне… пасьведчаньне, што ты загінуў!

Яна выцягнула шуфляду і пачала шукаць дрыготкімі рукамі паведамленьне, быццам ад гэтага залежала яе жыцьцё.

— Добра, добра, пакінь гэта, — Барток бегла акінуў вокам кухню. — Гэта тваё дзіця? — спытаў ён. Жонка кіўнула. — У цябе ёсьць яшчэ дзеці?

— Двое…

— Так… Двое, — паўтарыў ён мэханічна. Потым сеў на канапу і адлучана ўпетрыўся ў нікуды.

— Што будзе цяпер, Ёган? — спытала праз сьлёзы жонка. Барток зірнуў уверх.

Перад ім на нізкай камодзе ў залатой рамачцы стаяла фота. Гэта быў здымак, які яны разам зрабілі перад тым, як Ёган стаў салдатам. Барток узяў фота з камоды і доўга разглядаў. Потым зноў зірнуў на сваю жонку. Ён выцер рукою лоб.

— Пяць месяцаў, ці ня так?

— Так, Ёган.

— А цяпер?

— Сем гадоў, — адказала спакойна яна. Ён кіўнуў і ўзьняўся. Жонка абняла яго. — Ты больш ня прыйдзеш?

— Не, — адказаў Барток і схапіў сваю кепку.

— Застанься хаця б на вячэру, — папрасіла яна. — Пакуль прыйдзе Альфрэд.

Ёган адмоўна пакруціў галавой:

— Не, не, так будзе лепей. Табе трэба рабіць хатнія справы. Так будзе правільна.

Ёган Барток крыху пастаяў перад домам. Потым пайшоў на вакзал і вярнуўся ў родны горад. Тут ён хацеў знайсьці працу і пачаць усё спачатку.

*(1931)*

**Зь нямецкай мовы пераклаў Арцём Арашонак**



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ



BIOGRAFIEONLINE.IT

**ЭРЫХ МАРЫЯ РЭМАРК (1898—1970) — клясык нямецкай і сусьветнай літаратуры. Найбольшы посьпех мелі яго творы, прысьвечаныя лёсам «згубленага пакаленьня» — франтавікоў Першай сусьветнай вайны.**

# To the Happy Few *

Даніла Жукоўскі

Трынаццаць гадоў незалежнасьці. Здавалася б, няма лягчэйшага: азірнуцца й падсумаваць. Лезуць у галаву нейкія, прабачце, сасуды! Не, не тое, што вы падумалі, — звычайна я абыякавы, пра якія чых паведамляюць сёньня «СБ» і БТ ды сьпяшаецца камэнтаваць *беларуская «Свабода»*. І паважаны Лёлік Ушкін памыляецца, залічыўшы параўнаньне дзяржавы з гарлачом у разрад незвычайных, — нашмат меней новага пад сонцам. Яшчэ ў Дао Дэ Цзін напісана: *краіна падобная да таямнічага начыньня; да яго нельга дакрануцца — хто схопіць яго, згубляе.* Дзіўна, але ніхто не спрабаваў прасачыць гэтую сытуацыю з гледзішча начыньня.

За 13 год зьмест панятку «незалежнасьць» нагэтулькі ўскладніўся, што вядомае эсэ У.Арлова «Незалежнасьць — гэта…» падаецца прыкладам афарыстычнае сьцісласьці і амаль антычнага ляканізму. Калі, сьледам за гэтым тэкстам, заставацца ў высокай сфэры чыстых пажаданьняў, то сёньня гэтыя словы ўжываюць прыхільнікі супрацьлеглых праектаў беларускае будучыні. Яно не чужое нікому, і таму само па сабе амаль нічога ня значыць.

Калі ж паглядзець, што збудавана з гэтых пажаданьняў і куды вядзе той беларускі шлях… У агульных рысах незалежнасьць напаткаў лёс дэмакратыі: увасабленьне не дараўноўвае прынцыпу.

Гэтаму ёсьць аналёгіі на літаратурным полі. Беларускіх аўтараў не пакідае жаданьне напісаць пра славутыя паўстаньні XIX ст. Вынік даволі дзіўны: паўстаньне ўсё адно застаецца за кадрам. Караткевіч не дапісвае эпапэі, пачатай «Каласамі…», Петрашкевіч у «Рыцару свабоды» канцэнтруецца на супрацьстаяньні постацяў Каліноўскага і Мураўёва ў абстрактнай прасторы дыялёгу, Наварыч у «Літоўскім ваўку» трымаецца як мага далей ад падзеяў надмесьтачковага масштабу, Рублеўская ў «Золаце забытых магіл» шчодра падмешвае да паўстанцкае закваскі містыку. Нарэшце, падзеі «Бацечкі Зэна» Франца Сіўка адно дэкляратыўна зьмешчаны ў адпаведны гістарычны пэрыяд — чытач можа ігнараваць гэтую повязь або дашуквацца эзатэрычных паралеляў паміж эпідэміяй і аддзеламі расейскіх казакаў.

Паўстаньні прыцягваюць пісьменьніцкую ўвагу, але некаторыя бакі зьявы застаюцца неспасьцігальнымі. Гэта перш за ўсё крыніцы ўпэўненасьці паўстанцаў у рацыянальнасьці ўласных дзеяньняў. І ня дзіва: ішлі на страту маёнткаў, згубу кар'еры і жыцьцёвай пэрспэктывы дзяцей — на страту жыцьця! — у змаганьні супроць непараўнальна магутнейшага ворага. Баранілі нешта вельмі для сябе важнае, бо толькі ў гэтым выпадку апраўданы нагэтулькі адчайныя ўчынкі. Толькі вось што? Паспрабуй адкажы…

Тэма каранёў паўстаньня — тэма эліты, адной з функцый якое ёсьць клопат пра так званыя адцягненыя рэчы. Дзяржаўны лад, правы чалавека, гістарычная справядлівасьць… Паўстанцы XIX ст. баранілі сваё права быць элітаю на сваёй зямлі.

Псыхалёгію гэтае сацыяльнае групы сучаснаму беларусу зразумець надзвычай складана, а выказаць у катэгорыях беларускае культуры — пагатоў. Новая (з XIX ст.) традыцыя шмат у чым прынцыпова антыэлітарная — мае, хутчэй, сялянска-сацыялістычныя, плебэйскія карані і савецкую гісторыю. З-пад пяра беларуса ня выйшла нічога падобнага на «Пармскі манастыр» Стэндаля, і, калі гаварыць пра верхнія ступені сацыяльнае лесьвіцы, агоны лёс па-ранейшаму, як стагодзьдзе таму, — чытаць чужыя аповеды пра маркіза дэ Барбузона, як малыя ў «Шляху зь цемры» Янкі Маўра. Чытаць як прыгожую казку і не разумець, што гэта хай сабе перакручаны, але малюнак з штодзённага жыцьця кожнае краіны, у тым ліку іхняй уласнай.

Тое самае, што пра культурную традыцыю, можна сказаць — і зь яшчэ большым націскам — пра сёньняшнюю Беларусь: дзяржаву (палітычны рэжым і ідэалягічную дагматыку) і грамадзтва (штодзённае жыцьцё). Гэта вяртае нас да сумнага лёсу адцягненых паняткаў.

Пра «незалежную Беларусь» далей згадваць ня будзем, бо ёсьць азначэньні дакладнейшыя: Рэспубліка Беларусь, і лёс слова «рэспубліка» ў гэтым словазлучэньні пацьвярджае інтуітыўнае прадчуваньне, што «незалежнасьць» і «дэмакратыя» — не адзіныя пацярпелыя. Колісь, больш за 13 год таму, здаецца, сам Зянон Пазьняк назваў адзін са сваіх артыкулаў «Res publica». Старажытнае азначэньне аднаго з тыпаў дзяржаўнага ладу гучала ўзьнёсла, нароўні са словамі «свабода», «галоснасьць» і «дэмакратыя». Сёньня гэтае слова на першай старонцы супрацьрэфармісцкага лексыкону, у падвалінах афіцыйнае інтэграцыйна-настальгічнае рыторыкі. Яно азначае толькі адну канкрэтную рэспубліку — *нашу рэспубліку* і ніякую іншую.

Калі ж гаварыць пра яе, гэтую «нашу» рэспубліку, то навідавоку працэс, па-талстоўску кажучы, апрашчэньня. Клясавы падыход пацікху заступаецца біялягічным. Раней былі незадаволеныя, што партыя — адна. Цяпер, з падачы афіцыёзу, нараканюць: увогуле нашто яны патрэбныя? Раней абіралі прадстаўнікоў блёку камуністаў і беспартыйных, сёньня — мужчын, жанчын і моладзь.

Моцна, вельмі моцна адчулі апрашчэньне пісьменьнікі. Яны больш ня маюць тае ўвагі з боку ўлады. «Творчую інтэлігенцыю заступілі спартсмэны», — крыўдзіцца Б.Пятровіч і, магчыма, мае рацыю. Бо экзамэн па фізкультуры ёсьць, а па беларускай літаратуры — няма.

Але наракаць на кагосьці ці штосьці ня варта. Дакладней, нараканьні такога кшталту да праблемы эліты дачыненьня ня маюць. Бо эліта, якую стварае ўлада, ня ёсьць элітай. Сапраўдныя «вяршкі грамадзтва» павінны хай не фармаваць, але дзейсна спрычыняцца да кшталтаваньня ўлады. Натуральна, гаворым пра прынцып, у традыцыях сп.Арлова: «Эліта — гэта калі ня ты дамагаешся ордэну, а ордэн дамагаецца цябе. Але ты адмаўляешся ад яго да часу, пакуль суадносіны расейскай і беларускай на ТБ ня стануць 40 і 60.

Эліта — гэта калі і цётка Дарота, што працуе прыбіральшчыцай у дзіцячым садку, і вялікі начальнік Фёдар Іванавіч, твой сусед па пад'езьдзе, нераўнадушныя да тваіх словаў, надрукаваных ва ўчорашняй газэце, хаця нічога не зразумелі, але, як і настаўнік Фэлікс Дамінікавіч, адзіны, які зразумеў, што ты ў той публікацыі панапісваў, не рызыкуюць прызнацца, што твае думкі ім не падабаюцца».

І гэтак далей.

Сярод адмоўных вынікаў трынаццаці год існаваньня незалежнае Беларусі — таптаньне на месцы ў фармаваньні эліты як параўнальна незалежнага ад вонкавых абставінаў голасу. Улада ня мае годнага суразмоўніка. Хто адмовіўся ад прапанаванай дзяржаваю кватэры? Ад выданьня сваіх твораў у дзяржаўных (больш таго — холдынгавых!) выдавецтвах/выданьнях? Калі й адмовіўся, гэта прайшло незаўважаным. Патрэбны ўмовы, якія нададуць вагу пратэсту.

Нельга сказаць, каб элітабудаўніцтва ня мела падтрымкі з-за мяжы. Знакамітасьці (Быкаў, Алексіевіч, Някляеў), апальныя палітыкі (Пазьняк, Шарэцкі) атрымалі магчымасьць жыць за мяжою. Пацярпелыя Маркевіч і Мажэйка выдаюць свой «Дзень». Друкуюцца кніжкі, выдаюцца часопісы, ладзяцца сэмінары і канфэрэнцыі, раздаюцца, нарэшце, знакамітыя гранты.

Вынікі? Шматлюднае пахаваньне Быкава пад рэпрэсаваным сьцягам зацьвердзіла яго прыналежнасьць да амаль няіснага кола нацыянальнае эліты. Калі ж гаварыць пра жывых, Някляеў за час выгнаньня выдаў «Лабуха», філязофію якога лепш за ўсё акрэсьліць выраз «прапаганда беспрынцыповасьці». Алексіевіч у інтэрвію, прысьвечаным чарнобыльскай катастрофе і зьмешчаным у «Дзеяслове» №6, выглядае хутчэй замежніцай, чым нашай суайчыньніцай. Яе сьведчаньне глыбокае і важнае, але скіраванае цалкам за мяжу і, па вялікім рахунку, тычыцца нас у аднолькавай ступені з аўстралійцамі, чаго, на мой беларускі погляд, недастаткова. Імкненьне да ўнівэрсалізму прывяло да страты ўнівэрсальнасьці.

Чаго ў кожным выпадку не хапала й не хапае — кантэксту. Па вялікім рахунку, і добрае, і благое, і неадназначнае ў паводзінах знакамітасьцяў мала ўплывае на шараговых грамадзян, бо застаецца паводзінамі канкрэтных асоб, а не прадстаўнікоў сацыяльнае групы з выпрацаваным кодэксам гонару.

Абагульнены партрэт незадаволенага рэжымам інтэлігента трохі іншы. Гэты ягамосьць друкуе ў «Нашай Ніве» фэльетоністыя гісторыі, адначасна займаючы адказную пасаду ў *холдынгу*, дасылае рэпартажы наркомаўкаю ў дзяржаўную газэту, тарашкевіцаю (і якою прасунутаю тарашкевіцаю!) у недзяржаўную, парасейску, калі пашанцуе, — у «Савецкую Беларусію», выдае адну кніжку за кошт беларускага бюджэту, другую — за грошы замежнага фонду, назву якога дзяржаўная прэса суправаджае абавязковым азначэньнем «небезьвядомы».

Істотна, што ў адрозьненьне ад пратэстаў усё гэта робіцца не пакрыёма, а публічна, а то й з рэклямным гукам. І заўсёды ёсьць апраўданьне — матэрыяльныя цяжкасьці. Апартунізм у сучаснай апазыцыйнай практыцы — якасьць адназначна станоўчая. У гэткіх умовах ці будзе хто дашуквацца, хто ў маральным пляне вышэйшы — Быкаў ці Алексіевіч?

Не хацелася б, каб нехта ўбачыў тут наскокі. Гэтакія паводзіны не зьяўляюцца выключнаю рысаю творчых людзей і ні ў якім разе не абмяжоўваюцца колам апазыцыянэраў улады. Ёсьць прыклады выдаўцоў, якія, зрабіўшы грошы на нізкапробнай расейскамоўнай маскультатруце, выдаюць беларускія кніжкі, — але хіба лепш, калі грамадзкая арганізацыя, прадэклараваўшы ў дачыненьні да грамадзтва самыя шляхетныя мэты, зьбірае сродкі, імпартуючы ў краіну на льготных умовах алькагольныя і тытунёвыя вырабы?

І няма сумневу, што ўсё гэта непазьбежна і невыкараняльна. Глядзелася б гэтая дзейнасьць па-іншаму, калі б суправаджалася адмоваю ад прэтэнзій на элітарнасьць. Падрабляцца ж бессэнсоўна. Элітарнасьць — гэта перш за ўсё пачуцьцё незалежнасьці ў меркаваньнях, і меньавіта таму, а не з прычыны нейкіх звышвыдатных здольнасьцяў, эліта робіцца астоя незалежнасьці дзяржавы. Самастойнасьць думак і незалежнасьць выказваньняў не прыходзіць аўтаматычна разам з талентам, маёмасьцю або заслугамі перад дзяржавай ці грамадзтвам. Гэта праблема сугучнасьці асобы і натоўпу, выключнага і будзённага. «Цяжкае і лёгкае ствараюць адно аднаго, доўгае і кароткае наўзаем фармуюць, высокае зь нізкім адно да аднаго прыхіляюцца, гукі зьліваюцца і прыходзяць у гармонію», — кажа Дао Дэ Цзін. Няма, мусіць, лепшых слоў, каб сказаць «Ня ведаю, як гэта адбываецца».

Найбольш пэрспэктыўным і захаплялым напрамкам вывучэньня нашае незалежнасьці і вынікаў яе 13-гадовага «панаваньня» мне падаецца дасьледаваньне элітарных праектаў згаданага пэрыяду.

Дзе жыла тыя гады *Незалежнасьць*, якую гэтак хораша апяваў Арлоў (некаторыя памятаюць яго натхнёную дэклямацыю ўласных радкоў), — у маскарадным карагодзе грашовых знакаў ці ў галовах людзей, якія прыдумлялі ім назвы, — зайцы, талеры, шаладончыкі? Калі пераадолець цягу да ўспамінаў (і што яшчэ горш — з аўтабіяграфічным ухілам), зьявіцца час і прастора для пытаньняў пра намеры і спадзяваньні — што, як і ў выпадку з вызваленчым рухам пазамінулага стагодзьдзя, складае найвялікшую загадку. Пакуль мне бачацца тры вялікія групы (адзнакі, вядома ж, умоўна-папярэдне-суб'ектыўныя) аб'ектаў дасьледаваньня (гл. табліцу).

Сьпіс можна доўжыць, найпаўнейшы пералік — яшчэ не вывучэньне. Тут мы можам адно зьмясьціць некалькі меркаваньняў агульнага характару. Разнастайныя па маштабе і скіраванасьці задумы аб'ядноўвае элітарнасьць мэтаў, і натхняліся згаданыя праекты наяўнасьцю мясцовых патрэб і мясцовых кадраў для іх выкананьня.

Што тыя кадры, што колькасьць прасунутых спажыўцоў надта нешматлікія. Дзеля гэтага шмат для каго лёс, прыкладам, папярэднікаў «Arche» накшталт «Фрагмэнтаў» падасца нецікавым. Але для тых, хто імкнецца без самазьнішчэньня атаясамляць сябе зь дзяржавай, хто хоча гаварыць «наша незалежнасьць», недзе ў посьпехах і правалах гэтых праектаў хаваецца зьмест трынаццаці незалежных гадоў.

| Збольшага посьпех (+) | Збольшага няўдача (-) | Пакуль ня вызначана (?) |
|---|---|---|
| «Краіна Беларусь» | палітычныя партыі і партыйныя мэды | тарашкевіца |
| інтэлектуальны часопіс «Arche» | беларуская паліталёгія | незалежны літаратурны часопіс «Дзеяслоў» |
| Беларускі ліцэй | айчынная расейскамоўная літаратура | Беларускі калегіюм |
| сэрыя «Беларускі кнігазбор» | перакладная літаратура (цэлая сэрыя праектаў) | нацыянальная сымболіка |
| унівэрсытэт у Полацку | ньюфутурызм «Бумбамліту» | постмадэрнізм у літаратуры |

* To the Happy Few — нешматлікім шчасьліўцам (анг.).

ЗДЫМКІ ГОДУ



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**У 2004-м на Беларусь абрынулася лавіна конкурсаў прыгажосьці. Глоўны зь іх патранаваў асабіста прэзыдэнт краіны.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Зімовыя гульні

**Напярэдадні Калядаў у Мастацкім музэі адкрылася выстава найноўшага нашага мастацтва «Зімовыя гульні», прытарнаваная да іншае выставы, «Нясьвіскія зборы Радзівілаў». Імпрэза была фундаваная кампаніяй British American Tobacco, што ўжо ня першы раз выступае рупліўцам захаваньня беларускае старасьвеччыны. Сучаснае мастацтва прадстаўленае ў розных жанрах і відах, ад інсталяцыяў да пастановачных фатаздымкаў. Удзельнікі й госьці, гаспадары й наведнікі ў паўсядзённых і старасьвецкіх уборах атрымалі ўнікальную магчымасьць напоўніць іншым зьместам старыя сьцены сталінскага яшчэ музэю. Кожны тут мае шанец пагуляцца шарымі беларускімі гадзінамі ў свае беларускія гульні. Рэпартаж з выставы — у наступным нумары...**

**СХ**

**На фота: дырэктар Мастацкага музэю Ўладзімер Пракапцоў і акторка Зоя Белахвосьцік у сармацкіх строях.**

# Які калядны падарунак вы б хацелі атрымаць?

**Рыгор Барадулін**, паэт:

— Я б хацеў апынуцца ў беларускай Беларусі.

**Лявон Вольскі**, рок-музыка:

— Каб зьмяніўся дзяржаўны лад... Гэтая рэч вырашыла б шмат якія праблемы. І фінансавага характару, і прафэсійнага.

**Аляксандар Дабравольскі**, палітык:

— Я хацеў бы, каб у наступным годзе зьявіўся, дзякуючы нашай сумеснай працы, агульнанацыянальны лідэр дэмакратычных сілаў. Гэтага я вельмі-вельмі хачу.

**Артур Клінаў**, мастак:

— Абстрактна я б мог сказаць, што мая мара — гэта мець домік на Блакітным беразе, самаход — ну, «Фэрары», вядома. Але будзем рэалістамі. А калі ўжо зусім рэальна, задзяўбаўся я са сваім самаходам. Я проста ўжо ў трансе поўным. Таму я б хацеў нармальную «Volvo S-70». Мне падабаецца яе дызайн. Таму з набалелых, вострых падарункаў гэтая машына мяне б задаволіла.

**Леанід Міндлін**, рэжысэр:

— Я б жадаў, каб у наступным годзе навагодняе віншаваньне мы б пачулі ад новага прэзыдэнта.

**Уладзімер Колас**, дырэктар Беларускага ліцэю:

— Вярнуцца ў свой будынак. Але я разумею, што гэта адбудзецца толькі тады, калі беларусы пачнуць клапаціцца пра саміх сябе. І пачнуць нешта рабіць дзеля таго, каб жыць так, як беларускія людзі сапраўды гэтага вартыя.

**Віктар Манаеў**, актор:

— Новы год? Я ня ведаю такога сьвята. Я ведаю сьвята Нараджэньня Хрыстовага. Таму што Новы год можа быць і 1 студзеня, і 1 сакавіка. Ён быў і 1 верасьня. І апошнія дзесяць гадоў я Новага году не адзначаю. Я ня мару аб падарунках. Любоў, цяпло адно да аднаго — гэта сёньня самае галоўнае. Гэта падарунак. Калі людзі думаюць, што калі яны рэч якую дадуць, то гэтым адкупяцца, — не. Любоў — гэта самаахвяраваньне. Трэба ахвяраваць і сваім часам, і сваімі сіламі. Я б хацеў самаахвяраваньня.

**Алесь Пушкін**, мастак:

— У якасьці каляднага падарунку я б хацеў атрымаць каханьне любімай жоначкі. Бо за бытам мы яго перастаём адчуваць. Таму на Каляды трэба спыніцца, дастаць вянчальныя сьвечкі запаліць іх. Вянчальныя сьвечкі паляцца тады, калі мы хочам засяродзіцца, сесьці і ўспомніць самае чыстае і сьвятое. Вось што такое для мяне Каляды.

**Віктар Шалкевіч**, бард:

— Я б хацеў, каб мне падарылі першы альбом гурту «Procol Harum». Гэта арт-рок. Гэта вельмі вядомая брытанская група. Яна была вядомая ў тыя часы, калі я быў малады.

**Апытваў Зьміцер Бартосік**

# Навагоднія імпрэзы

### Казка ў ТЮГу

Навагодняя казка з гульнямі й конкурсамі, Дзедам Марозам і Сьнягуркай. Тэатар юнага гледача запрашае вас **з 23 сьнежня да 6 студзеня** ў 11.00, 14.00 і 16.30.

### Кірмаш

**Да 31 сьнежня** ў выстаўным павільёне на вул.Я.Купалы, 27 працуе «Навагодні кірмаш-2004».

### Сьвет казак, легенд і паданьняў

У мастацкай галерэі Ўнівэрсытэту культуры (Палац Рэспублікі) да **9 студзеня** працуе выстава «Сьвет казак, легенд і паданьняў». Жывапіс, акварэль, графіка, бацік і інш.

### Опэра

**23** (чц) — «Вясельле Фігара».
**26** (ндз) — «Чароўная флейта».
**29** (ср), **30** (чц) — «Навагодні канцэрт-сюрпрыз».

### Купалаўскі тэатар

**23** (чц), 24 (пт) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**26** (ндз) — «Падступства і каханьне».
**27** (пн) — «Я не пакіну цябе».
**28** (аўт) — «Парфён і Аляксандра».
**29** (ср), **30** (чц) — «Паўлінка».
**Ранішнія спэктаклі**
**26** (ндз) — «Паўлінка».
**27** (пн), **28** (аўт), **29** (ср) — «Афрыка».
**Малая сцэна**
**26** (пт) — «Налу».

### Тэатар беларускай драматургіі

**23** (чц) — «Палёты з анёлам».
**24** (пт) — «П’емонцкі зьвер».
**28** (аўт) — «Адэль».
**29** (ср) — «Чорны квадрат».

### «Беларускія сэзоны»

**24** (пт), **25** (сб) — «Сьнежная каралева».

### Клюб імя Дзяржынскага

**25** (сб), **26** (ндз) — «Крэсіва».
**25** (сб), **26** (ндз) — «Навагоднія свавольствы бабы-ягі і кампаніі».

### Моладзевы тэатар

**24** (пт), **28** (аўт), 11.00, 14.00 — «Навагоднія імпрэзы».
**26** (ндз) — «Давайце жыць дружна».
**29** (ср) — «На шчупакоў загад».

### Моладзевы тэатар эстрады

**23** (чц) — «Фэст эстраднага танцу».
**24** (пт) — «Эстрадны кактэйль».
**25** (сб) — «Дзед Мароз і К°».
**25** (сб) — «Сярэднявечныя каляды».

### Музычны тэатар

**23** (чц) — «Даратэя».
**24** (пт) — «Галяктыка каханьня».
**26** (ндз) — «Залатое куранятка».

### Палац Рэспублікі

**Малая заля**
**24** (пт) — «Навагодні мех сюрпрызаў».

### Тэатар імя Горкага

**23** (чц) — «Вольны шлюб».
**24** (пт) — «Суцяшальнік удоваў».
**30** (чц) — «Опэра жабракоў».
**Малая сцэна**
**23** (чц) — «Пэрпэтум мобіле, альбо Вечар габрэйскай показкі».

### Тэатар-студыя кінаактора

**25** (сб), **26** (ндз), **27** (пн), **28** (аўт) — «Шчаўкунок».

# Менская кінаафіша з 24 да 26 сьнежня

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Чужы супраць Драпежніка»***: **24** (пт) 15.00, 19.00, 21.00; **25, 26** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.00, 19.00, 21.00.
«Чатыры таксісты і сабака»: **24—26** (пт—ндз) 17.00.
«Вам заданьне»: **24—26** (пт—ндз) 16.30.
«50 першых пацалункаў»: **24—26** (пт—ндз) 18.30, 20.30.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Чужы супраць Драпежніка»: **24** (пт) 17.00 (іл), 19.00 (іл), 21.00; **25, 26** (сб, ндз) 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Жанчына-котка»: **24** (пт) 18.00 (іл), 20.00; **25** (сб) 18.00, 20.00; **26** (ндз) 18.00, 20.00 (іл).
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Давайце патанчым» (прэм’ера): **24** (пт) 14.50, 16.50, 18.50, 21.00; **25, 26** (сб, ндз) 14.50 (іл), 16.50, 18.50.
«Начны дазор»*** (прэм’ера): **25, 26** (сб, ндз) 21.00.
**«Масква»** (223-27-10)
«Давайце патанчым» (прэм’ера): **24** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **25, 26** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.
**«Мір»** (284-37-71)
«Жанчына-котка»: **24** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **25, 26** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.
«Маладыя»: **24** (пт) 18.10, 20.20; **25, 26** (сб, ндз) 16.00, 18.10, 20.20.
**«Перамога»** (223-77-66)
«Жанчына-котка»: **24** (пт) 14.40, 16.40; **25, 26** (сб, ндз) 14.00.
«Тэрмінал»: **24** (ндз) 18.40, 21.00; **25, 26** (сб, ндз) 16.10 (іл), 18.40, 21.00.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Уімблдон»: **24, 25** (пт, сб) 13.30, 17.15, 21.00.
«Кіроўца для Веры»***: **24—26** (пт—ндз) 15.15, 19.00.
**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Чужы супраць Драпежніка»***: **24—26** (пт—ндз) 11.00, 15.50, 21.00.
«Эфэкт матылька»***: **24** (пт) 13.30, 18.30; **25, 26** (сб, ндз) 13.30 (іл), 18.30.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 гадоў не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 гадоў.

# Юнаму гледачу

### Балет

**26** (ндз) — «Тры парсюкі».

### Тэатар беларускай драматургіі

**24** (пт), **26** (ндз), **28** (аўт), **29** (ср), **30** (чц) — «Воўк-мараплавец».

### Тэатар імя Горкага

**24** (пт) — «Крок Адыл».

### Тэатар юнага гледача

**23** (чц), **24** (пт), **25** (сб), **26** (ндз), **27** (пн), **28** (аўт), **29** (ср) — «Леў, вядзьмарка і рыцары ў Зімовай Краіне».

### Кіно

**«Аўрора»**
«Таемная крэпасьць» (прэм’ера): **24** (пт) 14.30.
«Гарфілд» (прэм’ера): **25, 26** (сб, ндз) 12.30, 14.30.
**«Берасьце»**
«Кепскія дзяўчаты»: **24** (пт) 15.00.
«Марозка»: **25, 26** (сб, ндз) 11.00.
**«Дружба»**
«Шрэк-2»: **24** (пт) 12.00, 14.00; **25, 26** (сб, ндз) 11.00, 13.00.
**«Мір»**
«Братка-медзьведзянятка»: **25, 26** (сб, ндз) 13.00.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **25, 26** (сб, ндз) 14.00.
**«Піянер»**
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **24, 25** (пт, сб) 12.00; **26** (ндз) 13.30.
«Прыгоды піратаў у Краіне гароднiны»: **25** (сб) 10.30; **26** (ндз) 10.00.

# Клюбнае жыцьцё

### Гудвін (226-13-06, 626-13-03)

**24** (пт), 20.00/22.00 — Жывая музыка: Аркадзь Эскін і яго джаз-квартэт/Куцьця, Каляды: Паліна Смолава, «Аляксандра і Канстанцін».

### Extreme (679-00-00)

**26** (ндз), 17.00 — HLHM Metallection III частка 2. Удзельнічаюць: ZNICH (прэзэнтацыя альбому «ЯЗЫЧНІК Я»), VIR ASGUARD, ZYGIMONT VAZA, ЗЬМЯЯ, MORTEM (Russia). Квіткі: танцпляцоўка — 10000, столік — 15000.

### Ізюм (206-66-18)

**23** (чц), 23.00 — Chill-out Zone: струнны квартэт «Dolche Vita», dj Jerry B.

КІНО Ў МЕНСКУ

# Казка для паслухмяных вандроўнікаў

Знаны кінафантазёр Стывэн Сьпілбэрг узяў гісторыю пра іранца, які 12 год пражыў у аэрапорце «Шарль дэ Голь», — і переставрыў яе ў сэнтымэнтальную й чульлівую трагікамэдыю, пяшчотную й казачную, як галівудзкі торт.

Віктар Наворскі, грамадзянін умоўнай усходнеэўрапейскай краіны, прылятае ў Нью-Ёрк. Але пакуль Наворскі вандраваў, у ягонай краіне адбыўся пераварот, і цяпер герой ня можа ні трапіць у ЗША, ні вярнуцца дадому. Ён застаецца ў аэрапорце і спрабуе ўладкаваць жыцьцё ва ўмовах ветліва-варожай амэрыканскай бюракратыі.

Том Хэнкс у ролі Наворскага дэманструе найлепшыя якасьці Форэста Гампа: забаўны й законапаслухмяны няўклюда, майстар на ўсе рукі, годны сябар маленькіх людзей і Купідон для няшчаснага закаханага. Амэрыканскую бюракратыю ўвасабляе Стэнлі Тучы — у фільме помсьлівы й эгаістычны кіраўнік Службы бясьпекі аэрапорту. Але ўсе варожыя высілкі разьбіваюцца аб дабрыню, спачуваньне й салідарнасьць людзей, як у суцяшальніцкіх фільмах Фрэнка Капры.

Том Хэнкс пасьпявае закахацца ў сьцюардэсу (Кетрын-Зэту Джонс), але разьвязка гэтага каханьня будзе нечаканай для гледача.

Хаця фільм зьняты на аснове сапраўдных фактаў, Сьпілбэрг застаецца ўдалым кіназачнікам, а «Тэрмінал» ёсьць карэктнай рэінкарнацыяй знакамітага «Е.Т.», дзе іншаплянэцянін — славянскі эміґрант, а клапатлівыя дзеткі — службоўцы аэрапорту.



MOVIEWEB.COM

«Тэрмінал» («Terminal»)
ЗША, 2004, каляровы, 128 хв.
**Жанр:** сэнтымэнтальная трагікамэдыя
**Адзнака:** 7 з 10

Сёньняшняя карціна Сьпілбэрга зусім не зьяўляецца шэдэўрам і нават чымсьці надзвычай арыгінальным, але шчымлівая й добрая цеплыня, сьмех і сьлёзы — гэта ня горшая ўзнагарода для гледача.

**Андрэй Расінскі**

# Сэміятычныя вынікі году

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Экзыстэнцыя нацыянальнага дыскурсу немагчымая без прысутнасьці народжаных грамадзкімі падзеямі дадатковых сэнсаў звычайных слоў. Так, ва Ўкраіне слова «апэльсін» зьнітаванае з палітычнымі рэаліямі. А чым мы горшыя? Мінулы год падараваў нам шэраг устойлівых слоў, фраз, вобразаў, многія зь якіх, калі іх выкарыстоўваць у штодзённым жыцьці, здольны ўзбагаціць лексыку беларускай мовы.

Хачу, як казаў Маякоўскі, прымусіць зьзяць наступныя словы і выразы.

**«Газпром».** Газават у лютым 2004-га быў для беларускіх бюргераў ня менш нечаканым, чым пачатак вайны 22 чэрвеня 1941-га. Мы да іх, вынаходнікаў балалаек і матрошак, усёй душой, а яны — адрубілі газ. Такім чынам, «Газпром» выступае як крылатая характарыстыка нявернага сябра, ад якога заўсёды можна атрымаць «нож у сьпіну». Добрае слова для лексыкону баптыстаў: «Сярод апосталаў быў Іуда Іскарыёт. Ен аказаўся газпромам».

**«Уводзіць адзіную валюту».** Які год без інтэграцыйных пацалункаў! У 2004 г. усе проста крануліся на глебе ўвядзеньня адзінай валюты. Калі спачатку да пэрспэктывы сьмерці «зайчыка» ставіліся сур'ёзна, пры канцы году абяцанкі ўвесьці адзіную валюту пачалі выклікаць рогат. Відавочна, у народзе працэс пераходу на расейскі рубель паступова пачынае асацыявацца са значэньнямі «цягнуць час», «марудзіць». Зручны афарызм для выкарыстаньня ў спартовых камэнтарах: «Каб захаваць на таблё пераможны лік, футбалісты «Дынама» пачалі ўводзіць адзіную валюту».

**«Непрацуючы кандыцыянэр».** Лажануўшыся на «Эўрабачаньні», група «Аляксандар і Канстанцін» прымусіла дзяржаўныя СМІ шукаць знадворныя фактары правалу карыфэяў беларускай эстрады. Іх знайшлі: непрацуючы кандыцыянэр у нумары музыкаў. Прычына настолькі прымітыўная, што спалучэньне так і просіцца да ўжываньня ў сэнсе «танная ды галімая адмазка». Раю для дашчікаў: «Чаму перавысілі хуткасьць? Толькі не кажыце, што кандыцыянэр не працаваў».

**«25 мэдалёў з Афінаў».** Панты прэзыдэнта — 25 мэдалёў з Эляды — яшчэ да Алімпіяды выклікалі, як пазьней высьветлілася, справядлівую крытыку за валюнтарызм. Ну і Зэўс з тымі мэдалямі! Гарант падарыў нам цудоўны выраз, які можа быць выкарыстаны як азначэньне чагосьці абсалютна нерэальнага. Напрыклад, у дыялёгу: «Ты чуў, Клімаў паабяцаў рэвалюцыю на 25 сакавіка 2005 г.?» — «Ага, і 25 мэдалёў з Афінаў».

**«Несьцярэнка».** Тут увогуле ўсё проста. Беларуская ракета стала сымбалем чагосьці звышхуткага. Як у рэале бачу перадавы артыкул у «Народнай волі»: «Лукашэнка давёў краіну! Цэны на хлеб растуць хутчэй, чым Несьцярэнкя бегае».

**«Беслан».** Жудасная трагедыя асеціскага мястэчка ў Беларусі набыла сваё арыгінальнае гучаньне. Паколькі плебісцыт аб трэцім тэрміне быў абвешчаны ў час, калі ўся Расея трапіла ў прастрацыю, незалежныя аналітыкі зрабілі выснову: тэракт на Каўказе стаў для ППРБ зручнай падставай, каб зьмяніць канстытуцыю. Адсюль дадатковы сэнс слова «Беслан» — наяўнасьць аптымальных умоў для рэалізацыі чаго-небудзь. Напрыклад, малітва бамжа: «Быў бы Беслан знайсьці кардону, здаў бы яго, набыў бы пляшку і нажорся».

**«Хрустальны сасуд».** Шэраг мэтафарычных азначэньняў роднай Беларусі — «сінявокая», «краіна тысячы азёр», «зямля пад белымі крыламі» — папоўніся яшчэ адным: «Крохкі хрустальны сасуд, які нясе прэзыдэнт». Так убачыў Беларусь ён сам у сваім гістарычным сьпічы аб правядзеньні рэфэрэндуму. Цудоўная мэтафара павінна быць падхоплена творчай інтэлігенцыяй у навагодніх віншаваньнях:

У хрустальным сасудзе
Сасуд падымаю за бацькавы рукі,
Што нясуць сасуд-Беларусь
У навагоднія маразюкі.

З Новым годам!

**Лёлік Ушкін,**
**левы радыкал**

# Шчасьлівых калядаў!



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Беларуская ялінка

Маю для вас і вашых дзетак прыемную навіну.

**29 сьнежня ў Менску** будзе магчымасьць патрапіць на аўдыенцыю да Сьвятога Мікалая.

**29 снежня** (серада) з **17.00** да **18.00** ён будзе прымаць зусім маленькіх дзетак з бацькамі ў часовай рэзыдэнцыі на Варвашэні, 8.

Дзеткі трохі большыя (гадкоў да 8-мі) змогуць пасьпяваць у карагодзе, пагуляць 29 сьнежня з **18.00** да **20.00**.

Увага! Наступная інфармацыя прызначаецца дзеяздольным і праваздольным асобам, якія чыталі дзядзьку Дарвіна і бачылі ў лазьні пана Міколу.

Сьвята арганізуюць некалькі мам пры ласкавай падтрымцы Народнага Фронту і сп.Вячоркі. Так што прафсаюзных цукерак ня будзе. Як арганізуем — так і адсьвяткуем.

Каб запрасіць прафэсійных актораў, набыць елку, гірлянды, патрэбныя грошы. У мінімальную суму рэальна ўпісацца пры ўмове, што кожная сям'я самастойна набудзе падарунак свайму дзіцяці, прынясе крыху дождждыку ці яшчэ чаго для аздабленьня памяшканьня і 5 тыс. рублёў. Падазраю, што ў Беларусі ёсьць людзі, якія на дзіцячае сьвята маглі б ахвяраваць пэўную суму. У той жа час ёсьць добрыя сем'і, фінансавая сытуацыя ў якіх дазваляе толькі набыць дзіцяці сьціплы падарунак. То было б добра, каб яны прыйшлі таксама, бо грошы — не адзіная патрэба.

27 сьнежня ў 19.00 запрашаю ахвотных паўдзельнічаць у аздабленьні залі. На сядзібу ўжо можна прыносіць цацкі і малюнкі, перадавайце ўсё дзяжурным. Зь дзіцячых калядных малюнкаў арганізуем выставу. На сьвяце патрэбна музыка, у ідэале — жывая. Можа, хто на дудзе ці гармоніку грае?

Ялінку думаем аздобіць цацкамі, якія зробяць самі ж дзеці, і правесьці конкурс. Рэцэпт цацкі: шклянка солі + шклянка мукі + вада (трошкі) + фантазія. Усё перамяшаць, сфармаваць фігурку і запячы ў духоўцы. Можна расфарбаваць маркерамі, можна адразу ў цеста дадаць гуаш, блёсткі, ніткі, каменьчыкі... Не забудзьцеся на дзірачку для мацаваньня!

Сьвяту трэба рэкляма, так што лічыце гэты ліст лістом шчасьця і дашліце ўсім знаёмым.

**Крысьціна Вітушка**
**kryscina@tut.by, 8-029-632-27-43**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### БАЛЬ-МАСКАРАД У ГОРАДНІ

Маем гонар запрасіць Вас на сярэднявечны калядны бальмаскарад, які адбудзецца **29 сьнежня** ў Горадні. Майстэрня спадара З.Іваноўскага (Будзённага, 48а). **У праграме:** 1) сярэднявечныя танцы; 2) дэгустацыя сярэднявечнай кухні; 3) рыцарскі турнір; 4) сюрпрызы, падарункі і шмат чаго іншага. Увага!!!! Без карнавальнага строю і маскі ўваход забаронены! **Для тых, каму не слаба даехаць зь Менску**, — тэл. 755-03-70 (выезд — а 14.30).

### ВІТАНЬНІ

**Ганку Дашкевіч** з ДН. Сьветлых думак, гарачага сэрца ды заўсёднай увагі сяброў. Сірожа С. і Алена Т.

**Ганну Краснову** з Днём народзінаў. Сяржук Семянюк ды Алена Талапіла

**Віншую** шаноўных Грамадзян БНР з Раством Хрыстовым і Новым годам! Ryhoravič

**Віншуем Паўлюка і Сямёна** з Днём народзінаў. Чыстага неба, піва і хлеба. Маладыя навукоўцы

**Беларусаў** зь перамогамі 2004 году! Адмена вынікаў псэўдарэфэрэндумаў відавочная! Крочым да поўнай перамогі! Kapitan BNR.

### КАНТАКТЫ

**Удзельнікі і аматары** гурту «Дзяньніца», у якіх захаваліся запісы, просім адгукнуцца па тэл. 8-029-705-08-94, 211-21-08 (Вера)

**Просім беларускіх прадпрымальнікаў** падтрымаць ініцыятыву шчырага беларуса, на сродкі якога былі падпісаны на «Нашу Ніву» 13 сярэдніх школ і тры прафтэхвучэльні Слуцку. Аматары Купалавай творчасьці

**Запрашаем** 26 сьнежня а 14-й на калядныя Купалавы чытаньні каля помніка Паэту ў парку Янкі Купалы. Купалавы чытаньні адбываюцца штотыдзень у нядзелю ад 14-й да 16-й. Аматары Купалавай творчасьці

**Цікавіць інфармацыя**, дакумэнты, фота, зьвязаныя з Булак-Балаховічам, «Зялёным дубам», «Чорным катом», беларускай партызанкай, — куплю. Электронны адрас: zmagar@yahoo.com. Т.: 8-029-722-46-04

### ПРАДАЮ, КУПЛЮ

**Прадаю** кампутар Cyrix 200 MHz/128/4Gb/2Mb V/52x/FDD/USB/k/m — 70 у.а.; 14-цалевы манітор «IBM» — 30 у.а.. Т.: 8-029-553-97-34, 255-50-38

**Аранжавую накідку** ці балёневую куртку — танна набуду ці прыму ў падарунак. Т.: 221-21-81

**Прадам кітайскую ружу**, кітайскую цыбулю, альвас, кактусы, бэгоніі, герані, інжыр, розныя малочнікі. Т.: 221-21-81, Слава

### ПРАЦА

**Часопіс «Arche»** шукае адміністратара (распаўсюд і інш. тэхнічныя пытаньні) на палову стаўкі. Патрабаваньні: мужчына (прыйдзецца насіць пакункі з часопісам), мянчук, здольны да арганізатарскае працы. Праца штодзённая ці амаль штодзённая. Зьвесткі пра сябе накіроўваць на электронны адрас arche@arche.org.by

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

Наступны нумар газэты выйдзе **7 студзеня**. У продажы ў Менску — з 6 студзеня. Магчыма, дзеля сьвятаў некаторыя падпісчыкі атрымаюць нумар з спазьненьнем. Шчасьлівых Калядаў!

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| карэктарка | Настасься Мацяш |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3516. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 21.00 22.12.2004.

Замова № 7747.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а